Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 44 (4487) 31 кастрычніка 2008 г.

У нумары:

Сучасная літаратурная крытыка: крызіснае становішча?..

Ацэнку творчасці літаратурных крытыкаў даюць пісьменнікі.

Стар. 4

Міжнародны з'езд славістаў

Прэстыжны міжнародны навуковы форум, заснаваны ў 1929 годзе, упершыню пройдзе ў Беларусі ў 2013 годзе.

Стар. 5

Каляндар народнага жыцця

Нарэшце, пасля працяглай паўзы, — адрыўны каляндар «Родны край» (на 2009 год).

Стар. 7

Тэст на чалавечнасць

Купалаўскі тэатр: на справе не ўсё так, як «намаляваў» шмат хто з калег-журналістаў.

Стар. 11

Класік без рэтушы: погляд з Масквы

Кніга «Янка Купала. Молодая Беларусь» адкрывае вялікага паэта па-новаму — без купюр і падмалёвак.

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:	*Ведамасная падпіска:*
1 месяц — 6720 руб. Падпісны індэкс — 63856	1 месяц — 8710 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры: 1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Пакліканыя лірай

Пятыя Маладзёжныя Дэльфійскія гульні краін-удзельніц СНД прайшлі ў Мінску

Раней многія з нас толькі чыталі пра тую жыватворную хвалю адраджэння дэльфійскага руху, што імкліва захоплівае сучасны свет. А цяпер і самі адчулі стваральны, радасны, аптымістычны дух, уласцівы гэтай своеасаблівай алімпіядзе ў сферы мастацкай творчасці.

Удзельнікі канцэрта пераможцаў

Зрэшты, ці варта Дэльфійскія, або Піфійскія, гульні параўноўваць з прэстыжнымі спартыўнымі спаборніцтвамі? У іх ёсць свая старажытная гісторыя, непаўторная і нялёгкая. Заснаваныя ў 582 г. да нашай эры ў Грэцыі, яны больш як 1600 гадоў таму былі забароненыя (разам з Алімпійскімі гульнямі), адрадзіліся толькі на пачатку XX ст., а пасля перапынку з-за Другой сусветнай вайны пра іх амаль забыліся, і толькі ў 1994 г. у Берліне прадстаўнікі 19 краін стварылі Міжнародны Дэльфійскі савет. Сёння спадкаемцы прыгожай антычнай традыцыі спаборнічаюць на сусветным, на рэгіянальным і нацыянальным узроўнях.

Першыя Маладзёжныя Дэльфійскія гульні краін-удзельніц СНД прайшлі ў 2002 годзе ў расійскім Бранску, затым Апалонава ліра склікала сваіх прыхільнікаў у Малдове, ва Украіне, у Казахстане. Адметна, што за час існавання Дэльфійскіх гульняў іх лаўрэатамі сталі 70 беларусаў. І вось прадстаўнічы форум талентаў прыняла наша сталіца. Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расійская Федэрацыя, Таджыкістан, Украіна, Туркменістан, Узбекістан прадставілі ў 17-і намінацыях прафесійна падрыхтаваных спаборнікаў ад 10 да 21 года — усяго больш як 500 чалавек. Іх творчасць ацэньвала кампетэнтнае міжнароднае журы. На розных пляцоўках дэманстравалі сваё мастацтва жывапісцы і графікі, юныя ўмельцы дэкаратыўна-прыкладной галіны, фатографы і веб-дызайнеры; выступалі піяністы, скрыпачы, віяланчэлісты, выканаўцы на баяне і акардэоне, цымбалісты, трубачы; гучалі акадэмічныя, народныя і эстрадныя спевы; маладыя таленты выяўлялі сябе ў народным і сучасным танцы, у арыгінальным цыркавым жанры; паспаборнічалі нават дзі-джэі.

Вельмі важна, што напружаны конкурсны графік не перашкодзіў арганізатарам форуму паказаць юным гасцям адметнасці Мінска, стварыць спрыяльную, зычлівую атмасферу і для творчага самавыяўлення, і для шчырых сяброўскіх кантактаў.

Урачыстае закрыццё Дэльфійскіх гульняў адбылося 25 кастрычніка ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У фае можна было азнаёміцца з лепшымі работамі ў намінацыях візуальнага мастацтва (сярод уладальнікаў залатога медаля — беларусы С. Торбік, І. Юхневіч, Л.Філіповіч, А. Скорабагатая, Я.Чысты...). А гнараваныя дэльфійскімі лаўрамі музыканты-інструменталісты, спевакі, танцоры, артысты эстрады, цырка паказалі сябе на сцэне. Афіцыйная цырымонія прайшла з удзелам міністра культуры Беларусі Уладзіміра Матвейчука, першага намесніка старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Уладзіміра Гаркуна і дырэктара Міжнароднага Дэльфійскага камітэта, каардынатара па падрыхтоўцы і правядзенні Дэльфійскіх гульняў краін СНД Уладзіміра Панявіна (падчас імпрэзы яму была ўручана пачэсная ўзнагарода — Нагрудны знак Міністэрства культуры Беларусі).

У афіцыйных прамовах падкрэслівалася значэнне дэльфійскага руху як эфектыўнага інструмента раскрыцця і падтрымкі творчых талентаў, іх прафесійнага станаўлення, а таксама захавання культурнай спадчыны, разнастайнасці нацыянальных культур. Звярталася ўвага на тое, што паспяховы ўдзел беларусаў у дэльфійскіх спаборніцтвах абумоўлены дзяржаўнай палітыкай падтрымкі таленавітай моладзі, плённай дзейнасцю адпаведнага спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Дэльфійскія гульні вызначаны як прыярытэт гуманітарнага супрацоўніцтва краін Садружнасці.

Канцэрт у перапоўненай зале. Гарачыя авацыі ўладальнікам залатых медалёў: вакалістцы Настассі Кушнір з Малдовы; скрыпачцы Лусінэ Аруцюнян ды фенаменальна пластычнай акрабатцы Сане Шахназаран з Арменіі; адораній рэдкасным багатым голасам расіянцы Валянціне Шмагінай; нашым сайчыннікам — юнай спявачцы-народніцы Вользе Чабатаровай, віяланчэлісту Івану Рананскаму, віртуознай цымбалістцы Аляксандры Дзенісені, аматарскаму танцавальнаму калектыву "Беларусы", папулярнаму Андрэю Кунцу... І гэта далёка не ўсе імёны пераможцаў, для якіх Дэльфійскія гульні-2008 сталіся сцяжынкай да творчага Алімпа. Шчаслівага ім узыходжання!

Лана ІВАНОВА

Фота Кастуся Дробава

Беларускае Дабравесце ў Беластоку



У мінулыя выхадныя ў польскім горадзе Беластоку прайшоў вечар беларускай культуры, падчас якога адбылася прэзентацыя Свяшчэннага Евангелля на беларускай мове. Пераклад зроблены Біблійнай камісіяй Беларускага Экзархата. Як паведаміў "ЛіМу" сакратар Біблійнай камісіі Іван Чарота, прэзентавалася Евангелле Богаслужбовае, у нас яно выйшла летась (выдаўцы — Беларуская Праваслаўная Царква і Біблійнае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, наклад — 2 500 ас.). У Гайнаўцы выданне фактычна паўторана амаль гэткім жа накладам — выдавецтвам "Братчык".

На выданні, што пабачыла свет у Польшчы, пазначана: яно стваралася "пад ганаровым патранатам Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхала Аляксейчыка". Фаліянт надрукаваны на выдатнай паперы, у колеры, на вокладцы — святыя абразы.

Біблійная камісія Беларускай Праваслаўнай Царквы, якая дзейнічае ўжо чатырнаццаць гадоў, над перакладамі працуе, пачынаючы з дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя. У выніку працы славістаў, навукоўцаў, духоўных асоб, што ўвайшлі ў склад камісіі, выдадзеныя паасобна чатыры Евангеллі — ад Матфея, Лукі, Іаана і Марка. А ў 2007-м пабачыў свет звод Богаслужбовых тэкстаў. Асаблівасцю такой формы з'яўляецца тое, што ўвесь Евангельскі тэкст падзяляецца на часткі, якія можна чытаць наўпрост на богаслужэнні — у залежнасці ад дня на працягу літургічнага года. Так званыя зачалы ўтрымліваюць тлумачэнні, што, калі і з якой нагоды трэба чытаць. Таму такая форма выдання з'яўляецца зручнай і для тых вернікаў, якія штодзень чытаюць малітвы і разгортваюць Евангелле для самастойнай духоўнай працы.

— Агульнавядома, што важнейшы паказчык узроўню развіцця і статусу мовы — яе трывалая замацаванасць у традыцыйным богаслужбовым ужытку, — зазначае Іван Чарота. — Таму адной з сваіх важнейшых задач біблійная камісія бачыць у тым, каб замацоўваць ва ўжытку той фонд лексікі, які можа служыць сцвярджэнню нацыянальнай мовы як мовы царкоўнай. Ні адна канфесія на цяперашні момант у поўнай меры беларускай мовай не карыстаецца. Тэрміналогія ж выпрацоўваецца і ўдасканальваецца найбольш у працэсе перакладаў. Колькі гадоў таму быў, між іншым, выдадзены царкоўнаславянскі — беларускі слоўнічак, які дапамагае знайсці беларускія адпаведнікі многім рэлігійным паняццям, — падкрэслівае Іван Чарота.

Выданне "Свяшчэннага Евангелля" стала яшчэ адной важнай падзеяй юбілейнага года памяці дабравернага князя Канстанціна Астрожскага.

Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

Мінская кнігарня "Акадэмкніга" да Каласавінаў рыхтуе для аматараў беларускай літаратуры прыемны сюрпрыз. *3-га лістапада* ў 16.00 у магазіне адбудзецца святочная сустрэча, у якой возьмуць удзел навукоўцы НАНБ, супрацоўнікі музея Якуба Коласа ды іншыя. Будуць гучаць вершы класіка і песні на яго словы. Кожны пакупнік кнігарні атрымае ў падарунак зборнік твораў Якуба Коласа.

* * *

У Азербайджане 22-23 кастрычніка адбыліся Дні культуры Беларусі. У сонечным Баку беларусы паказалі вялікую канцэртную праграму, кінапраграму, а таксама выстаўку жывапісу народнага мастака Беларусі Гаўрылы Вашчанкі. У сталіцы Азербайджана прайшлі выступленні калектываў Рэспублікі Беларусь, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Пятра Ялфімава і Гюнеш, тэатра песні Ірыны Дарафеевай, пераможцы дзіцячага конкурсу "Еўрабачанне-2005" Ксеніі Сітнік.

* * *

У Дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны працуе выстаўка «Вайна. Халакост. Памяць без тэрміну даўнасці». Гэтая выстаўка — першая ў шэрагу рэспубліканскіх мерапрыемстваў да 65-годдзя знішчэння Мінскага гета.

Экспазіцыя выстаўкі складаецца з калекцыі паштовак з выявамі гарадоў і мястэчак пачатку XX стагоддзя, населеных яўрэямі, фотаматэрыяламі пра масавыя экзекуцыі ў часы Другой сусветнай вайны, фрагментамі асабістых рэчаў вязняў лагера Трасцянец і Мінскага гета, а таксама працамі беларускіх мастакоў на тэму халакосту. Раздзел "Праведнікі народаў свету", прысвечаны людзям, якія, рызыкуючы ўласным жыццём, аказвалі дапамогу яўрэям.

* * *

У Франкфурце-на-Майне прайшоў 60-ы кніжны кірмаш. Беларуская экспазіцыя налічвала звыш 350 кніжных навінак.

Прадстаўнікі Беларусі прадоўжылі кантракт на пастаўку кніг у Германію. Акрамя гэтага беларуская дэлегацыя перадала для ўдзелу ў штогадавым конкурсе, які праводзіцца ў Лейпцыгу, выданні, што сталі пераможцамі Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2008».

* * *

Гомельскі гарвыканкам аб'явіў конкурс на лепшы праект паркавай скульптурнай кампазіцыі «Студэнт». Ідэя ўвекавечыць моладзь, якая авалодвае ведамі, і прысвяціць ёй манументальны сімвал прагучала на адной з сустрэч прадстаўнікоў гарадской улады са студэнтамі. Скульптурная кампазіцыя хутчэй за ўсё размесціцца на тэрыторыі, што прылягае да Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны.

У конкурсе могуць удзельнічаць праектныя арганізацыі, творчыя калектывы, а таксама асобныя архітэктары, скульптары і мастакі. Прапановы прымаюцца ва ўпраўленні архітэктуры і горадабудаўніцтва да 15 снежня.

* * *

Да ўрачыстасцяў, прысвечаных 1020-годдзю хрышчэння Русі, Беларускі Экзархат пабудаваў дзве новыя царквы. Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт асвяціў храм у гонар Дзяржаўнай іконы Божай Маці, узведзены ў Навінках, побач са Свята-Елісавецінскім манастыром і царкву імя роўнаапостальнага князя Уладзіміра, якая пабудавана на вуліцы 1-й Пасялковай. У абодвух храмах служылася літургія.

Падрыхтаваў Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Візіт Патрыярха

Навідавоку

З нагоды святкаванняў, прысвечаных 1020-годдзю Хрышчэння Русі і 30-гадоваму служэнню Мітрапаліта Філарэта на беларускай зямлі, наш край наведаў Святейшы Патрыярх Маскоўскі і усяе Русі Аляксій II.

Праграма візіту была багата насычана сустрэчамі і добрымі вестка-мі. У Нацыянальным аэрапорце "Мінск-2" Яго Святейшаства сустракаў віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь Аляксандр Косінец і Мітрапаліт Філарэт ды іншыя афіцыйныя асобы. Пасля абмену прывітаннямі Святейшы Патрыярх, віцэ-прэм'ер і Мітрапаліт адказалі на пытанні журналістаў, а пасля накіраваліся ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе ладкавалася адна з цэнтральных імпрэзаў высокай духоўнай праграмы — міжнародны "круглы стол" на тэму "Хрышчэнне Русі ў лёсах Расіі, Украіны і Беларусі". Яго ўдзельнікамі сталіся знаныя духоўныя асобы свету, сярод якіх Мітрапаліт Кішынёўскі і усяе Малдовы Уладзімір, Мітрапаліт Талінскі і усяе Эстоніі Карнілій, член Сінода Эстонскай Праваслаўнай Царквы Сергій Мяннік, прадстаўнік Сербскай Праваслаўнай Царквы епіскап Маравіцкі Антоній, прадстаўнік Балгарскай Праваслаўнай Царквы епіскап Ігнацій Праватскі ды іншыя. Ад імя навуковай і творчай інтэлігенцыі краіны ўдзельнікаў вялікай гутаркі вітаў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар эканамічных навук, прафесар Міхаіл Мясніковіч.

Госці азнаёміліся таксама з выставай рэдкай кнігі, размешчанай у фае другога паверха кніжнай скарбніцы. А ўвечары першага дня візіту Аляксій II наведаў Дом Міласэрнасці, будаўніцтва якога ажыццяўлялася пад патранатам беларускага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і высокага маскоўскага госця.

У галоўным праваслаўным храме Беларусі — Свята-Духавым кафедральным саборы, на прастоле якога цягам доўгай гісторыі знаходзілася старажытнае Евангелле, асабіста перапісанае ў 1582 годзе Слуцкім князем Юрыем Алелькам, адбылася ўрачыстая Боская літургія, пасля якой Аляксій II перадаў у дар храму набор еўхарыстычнага посуду. Уладыка Філарэт перадаў Яго Святейшаству спісак Мінскай іконы Божай Маці ў натуральную велічыню.

У Палацы Рэспублікі, дзе праходзяць галоўныя святы краіны, і сярод іх — уручэнне прэмій "За духоўнае адраджэнне", у другі дзень Патрыяршага візіту адбыўся канцэрт. Падчас святкаванняў адбыўся ўрачысты акт узнагароджванняў. Святейшы Патрыярх і Патрыяршы Экзарх былі ўганараваны дзяржаўнымі ўзнагародамі — ордэнамі Пашаны, Мітрапаліт Філарэт узнагароджаны таксама ордэнам святіцеля Аляксія, Мітрапаліта Маскоўскага.

У суботні дзень візіту расійская і беларуская дэлегацыі наведалі храм у гонар іконы Божай Маці "Дзяржаўная" і Свята-Елісавецінскі манастыр у Мінскім раёне Навінкі, дзе пабудавана 7 храмаў, а таксама — Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, дзе азнаёміліся з выставай "Праваслаўная ікона Расіі, Украіны і Беларусі". Агледзелі яшчэ адзін храм, які цяпер будуецца пад патранатам Кіраўніка дзяржавы і Святейшага Патрыярха — Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць бязвінна забітых у нашай Айчыне, наведалі драўляную царкву ў імя Святой Жыццепачатнай Троіцы. Так завяршыліся тры кастрычніцкія дні, асвечаныя візітам Патрыярха.

Ірына ТУЛУПАВА

З-пад пяра

Майстры-«высотнікі»

Духоўнаму адраджэнню ў нашай краіне надаецца вялікая ўвага. Паўсюдна рэстаўруюцца разбураныя і будуюцца новыя храмы.

Так, сёлета ў Дзятлаве, што ў Гродзенскай вобласці, адкрыўся новы храм Праабражэння Гасподня. На яго вярхоўі красуюцца пяць вялікіх купалаў. Уся гэта прыгажосць — справа рук народных умельцаў. А кансультантам у гэтай складанай працы быў вядомы майстар-высотнік Святаслаў Кананчук з Пінска. Трэба адзначыць, што браты-майстры Сяргей і Святаслаў Кананчукі вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ім даводзілася паспяхова ўсталёўваць крыжы над храмамі ў Клайпедзе, Вільні, Кастраме...

Яўген ЛАПЦЕЎ

Народная традыцыя

Зберагаць традыцыі — справа няпростая. У кіраўніка харэаграфічнай студыі Маладзечанскага цэнтра мастацкай творчасці Віктара Барановіча ёсць адно вялікае жаданне — захаваць традыцыі народнага танца. Ён лічыць, што народны танец — гэта культура, гісторыя і тыя карані, з якіх жывіцца ўсё.

Выкладчыцкую дзейнасць В. Барановіч пачаў у СШ № 1 горада Маладзечна, потым працаваў у Палацы культуры. Танцавальным майстэрствам ён авалодаў на харэаграфічным аддзяленні Люблінскага універсітэта М. Кюры-Складоўскай.

У гэтым годзе калектыў Віктара Барановіча станавіўся лаўрэатам фестываляў ва Украіне, у Польшчы і ў роднай Беларусі.

Ганна КІТАЕВА

Выстаўкі

«Праваслаўнае слова»

У шматвяковай гісторыі беларускага народа роля праваслаўнай царквы заўсёды была значнай. Праваслаўная вера садзейнічала фарміраванню нацыянальнай свядомасці і выхаванню патрыятызму, аказвала вялікі ўплыў на захаванне і развіццё культуры, традыцый, духоўнасці беларусаў і спрыяла ўсталяванню добразычлівых узаемаадносін паміж народамі.

З нагоды святкавання ў нашай краіне 1020-годдзя Хрышчэння Русі Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) ладзіць цыкл тэматычна звязаных між сабой выставак, аб'яднаных пад агульнай назвай "Праваслаўнае слова".

Так, у музеі кнігі арганізавана экспазіцыя "Праваслаўныя рарытэты", якая прадстаўляе найбольш каштоўныя экземпляры рукапісных і старадрукаваных праваслаўных кніг з фондаў НББ. Выстаўка складаецца з трох раздзелаў: у першым выстаўляюцца унікальныя рукапісныя помнікі, сярод якіх евангеллі, служэбнікі, жыцця святых, зборнікі слоў ды іншае, у другім дэманструюцца старадрукаваныя кнігі XVI—XVIII стагоддзяў: богаслужэбныя і кірылічныя. Асобнае месца займае сапраўдны шэдэўр друкарскага мастацтва XVI стагоддзя Евангелле Пятра Мсціслаўца 1575 года, першае выданне Віленскай друкарні братоў Мамонічаў. Трэці раздзел знаёміць з сучаснымі перакладамі Біблії. На выстаўцы экспануецца больш як 25 унікальных, рэдкіх кніжных помнікаў праваслаўнай традыцыі. Усяго ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі кірылічных выданняў больш як 1250 экземпляраў (і значная іх частка — праваслаўная кніга).

На трэцім паверсе ўстановы месціцца тэматычная выстаўка "Праваслаўнае слова", дзе экспануюцца выданні XIX — пачатку XXI стагоддзя (каля 300 дакументаў). У іх раскрываецца сутнасць рэлігіі як грамадскай з'явы, а таксама паходжанне, станаўленне і распаўсюджванне праваслаўя на беларускіх, рускіх і ўкраінскіх землях. Уся экспазіцыі размешчана па наступных тэматычных блоках. Першы — "З гісторыі Праваслаўнай царквы: выданні XIX — сярэдзіны XX стагоддзя" — вылучаецца рэдкімі і каштоўнымі выданнямі з фондаў НББ, якія выдадзеныя ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Іркуцку, Яраслаўлі, Кіеве, Харкаве, Чарнігаве, Вільні... Другі блок выстаўкі прысвечаны станаўленню праваслаўнага шляху, гісторыі Хрышчэння Русі, культуралагічнаму і паліталагічнаму аналізу форм узаемадзеяння дзяржавы і рэлігіі. У гэтай частцы выстаўкі экспануюцца даведачныя выданні, філасофскія і багаслоўныя сачыненні, біблейскія слоўнікі, праваслаўныя календары, імёнасловы і вучэбныя дапаможнікі па рэлігіязнаўстве. Найбольшую цікавасць прадстаўляе шматтомнае спецыялізаванае даведачнае выданне "Праваслаўная энцыклапедыя", прымеркаванае да 2000-годдзя Нараджэння Хрыстова. У трэцім блоку сабраныя працы па гісторыі станаўлення Украінскай Праваслаўнай царквы.

На другім паверсе бібліятэкі ўвазе наведвальнікаў — экспазіцыя кніжнай выстаўкі "Беларусь праваслаўная". Яе асноўная мэта — даць комплексны агляд сучаснай рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі, паказаць уплыў рэлігіі на асобу і грамадскае жыццё... Выстаўка налічвае каля 150 дакументаў і мае некалькі раздзелаў. "Хросны шлях" — утрымлівае літаратуру пра жыццё і служэнне на беларускай зямлі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Раздзел "Праваслаўныя святыні Беларусі" распавядае пра найбольш значныя аб'екты духоўнай спадчыны — праваслаўныя храмы, манастыры, абразы...

В. К.

Фота Віктара Кавалёва

За падзеяй

Талерантнасць і здаровы лад жыцця

Першая ўсерасійская акцыя — аўтапрабег "СНІД-СТОП!" — прайшла ў мінулым годзе і была скіравана на кансалідацыю намаганняў прадстаўнікоў федэральнай і муніцыпальнай улады, грамадскіх арганізацый, дабрачынных фондаў, журналістаў, урачоў, педагогаў, творчай эліты, артыстаў, музыкантаў, а таксама людзей, якія жывуць з ВІЧ. Яна была ўключана ў Нацыянальны даклад Расійскай Федэрацыі пра ход выканання Дэкларацыі аб прыхільнасці да справы барацьбы з ВІЧ/СНІДам у раздзел "Найлепшая практыка" на Генеральнай Асамблеі ААН.

Праблема распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі мае глабальны характар і з'яўляецца актуальнай для ўсёй грамадскай супольнасці. Цяпер усе сацыяльныя слаі насельніцтва, незалежна ад узросту, полу, веравызнання, закранутыя ВІЧ-інфекцыяй. Пры захаванні сённяшніх тэмпаў распаўсюджвання інфекцыі колькасць ВІЧ-пазітыўных людзей у СНД да 2010 года можа дасягнуць некалькіх мільёнаў, што прадстаўляе сур'ёзную пагрозу нацыянальнай бяспецы, дэмаграфічнай палітыцы...

У гэтым годзе акцыя набыла статус міжнароднай. Яна ахапіла новыя рэгіёны — ад Новага Урэнгоя да Сочы, ад Паўночнага Ледавітага акіяна да Чорнага мора, а таксама Украіну, Малдову і Беларусь.

Так, нядаўна Мінск стаў канчатковым пунктам у маршруце міжнароднага аўтапрабегу "СНІД-СТОП!". З гэтай нагоды ў Доме прэсы прайшла канферэнцыя арганізатараў і ўдзельнікаў гэтай акцыі.

Намеснік міністра аховы здароўя, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Валянціна Качан адзначыла, што наша краіна ўпершыню бярэ актыўны ўдзел у аўтапрабегу "СНІД-СТОП!", які стаў міжнародным і ахоплівае чатыры краіны. Валянціна Іванаўна падкрэсліла: *"Правядзенне падобных акцый сёння вельмі апраўдана і неабходна, дапамагае звярнуць увагу на існаванне дадзенай праблемы. Вельмі важна, што да нас прыязджаюць валанцёры, праводзяцца "круглыя сталы", трэнінгі, якія даюць магчымасць людзям пагаварыць на роўных, падзяліцца хоць і негатыўным, але вопытам, дапамагчы разабрацца ў сваёй жыццёвай сітуацыі.*

Цяпер у Беларусі налічваецца каля 10 тысяч ВІЧ-інфіцыраваных. Разам з тым сёння рэалізуецца шэраг праграм. І што вельмі важна — зніжаюцца тэмпы прыросту ВІЧ-інфіцыраваных: калі раней было больш як 1000 чалавек у год, апошнім часам — 700 — 800 новых выпадкаў. Мы нават з гонарам можам казаць, што ў нас каля 80 працэнтаў тых, хто мае патрэбу ў антырэтравіруснай (АРВ) тэрапіі, атрымлівае яе.

У Беларусі абследуюцца штогод больш як 800 тысяч чалавек (прадастаўляюцца магчымасці ананімнага і бясплатнага тэсціравання). І ў працэсе абследавання выяўляецца каля 0,3 працэнта інфіцыраваных. Гэта вельмі нізкі працэнт.

Нельга не закрануць адносіны грамадства да ВІЧ-інфіцыраваных. Калі праводзім анкеціраванне і работу з хворымі, робім усё магчымае, каб гэтыя людзі лічылі і адчувалі сябе роўнымі іншым грамадзянам. Гэта датычыць пытанняў працаўладкавання, пражывання, адукацыі, лячэння... З анкеціравання вынікае, што каля 70 працэнтаў ВІЧ-інфіцыраваных сёння не адчуваюць сябе няўтульна ў нашым грамадстве. Гэта таксама даволі добры паказчык. Але застаюцца 30 працэнтаў, таму праца яшчэ не скончана".

Расійскі тэлевядучы Аляксей Лысянкоў паведаміў, што аўтапрабег — не першы яго вопыт у барацьбе з ВІЧ/СНІДам. Не так даўно ён удзельнічаў у стварэнні адзінага ў сваім родзе тэлепраекта "СНІД. Хуткая дапамога", у якім гаворыцца аб праблемах людзей, якія жывуць з ВІЧ, а таксама здаровых людзей, якія не ведаюць, што такое ВІЧ. На расійскім тэлеканале РэнТВ выйшла больш як 70 выпускаў — у асноўным дакументальныя аповеды пра інфіцыраваных людзей. Не ўсе ўдзельнікі пагаджаліся называць імёны, а паказ іх спінай да камеры, у цёмных акулярах і са зменены голасам — даверу не выклікае. Таму ў гэтым годзе знялі 18 мастацкіх 30-хвілінных стужак на аснове рэальных гісторый, але ўжо з акцёрамі.

З часам, прызнаецца Аляксей Лысянкоў, прыйшло адчуванне, што чагосьці не хапае, так бы мовіць, працы ў полі: *"Так, у мінулым годзе прыдумалі аўтапрабег "СНІД-СТОП!", які прайшоў праз 15 буйнейшых гарадоў Расійскай Федэрацыі ад Уладзівастока да Масквы, нават далей — праз Маскву да Ліпецка. У кожным з іх праводзілі па некалькі дзён, ладзілі лекцыі (большасць нашых лектараў — людзі, якія жывуць з ВІЧ), "круглыя сталы" з прадстаўнікамі ўлад, медработнікамі, журналістамі. У гэтым годзе праект атрымаў статус міжнароднага".*

Людзі павінны быць інфармаваныя, што гэты небяспечны вірус перадаецца толькі трыма спосабамі: калі заражаная кроў пападае ў здаровую, ад маці да немаўляці і палавым шляхам...

На прэс-канферэнцыі таксама прысутнічалі расійскія і айчынныя артысты Яўгеній Фяклістаў (група "Канец фільма"), Юля Чычэрына, дуэт "Аляксандра і Канстанцін", прадстаўнікі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларуская суполка людзей, якія жывуць з ВІЧ"...

Сярод арганізатараў, як ужо адзначалася, шмат людзей, якія жывуць з ВІЧ. Яны на сваім прыкладзе паказваюць, што з гэтым дыягназам можна жыць. Адна з важнейшых задач аўтапрабегу — выхаванне ў грамадстве талерантнасці да хворых. Яшчэ адна з мэт акцыі — інфармаванне людзей, заклік да здаровага ладу жыцця, да адмаўлення ад наркотыкаў, пазбягання небяспечных палавых сувязей і да тэсціравання, каб своечасова выкрыць хваробу.

Міжнародны аўтапрабег "СНІД-СТОП!" завяршыўся фінальным дабрачынным канцэртам ля Палаца спорту з удзелам зорак расійскай і беларускай эстрады. Але падводзіць вынікі арганізатары аўтапрабега пакуль не спяшаюцца. Сваю справу яны будуць лічыць выкананай толькі тады, калі не будзе патрэбы арганізоўваць наступную акцыю.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Нашы весткі

Не бойцеся жартаў

У Віцебскай абласной бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі гумару "Вы будзеце смяяцца..." Ахрэма Нядбайлы. Менавіта пад такім псеўданімам на старонках газеты "Народнае слова" з 1991 года выступае паэт і перакладчык Уладзімір Папковіч.

— *Калі вы прыйшлі да мяне, значыць, мы з вамі ўжо ў добрых адносінах,* — распачаў вечар Уладзімір Антонавіч.

Кнігу Уладзіміра Папковіча склалі гумарэскі, якія ён пачаў пісаць яшчэ ў 1960-я. Менавіта з гумару паэт пачынаў сваю творчасць. У 1962 годзе з лёгкай рукі Рыгора Барадуліна ў "Мінскай праўдзе", а затым і ў "Звяздзе" з'явіліся творы маладога выкладчыка Уладзіміра Папковіча.

"Вы будзеце смяяцца..." — кніга, пра выданне якой сам аўтар доўгі час не задумваўся. Да справы яго падштурхнуў Сяргей Рублеўскі. Вечар Уладзіміра Папковіча прайшоў у сяброўскай атмасферы. Зала была поўная. Павіншаваць сябра прыйшлі паэт Давід Сімановіч, мастакі Фелікс Гумен і Валерый Белы. І ўсе прысутныя сапраўды смяяліся.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Беларуска-польская сябрына

Свята польскай мовы адбылося ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Сустрэча з польскай мовай — заўсёды свята, бо гэта далучэнне да багатай, блізкай нам славянскай культуры са старадаўнімі традыцыямі пісьменства, кніжнасці, да мастацтва слова — увасабленне мудрасці і духоўнай адметнасці суседняй краіны. Польская мова — гэта і сустрэча з творчасцю класікаў літаратуры: Адама Міцкевіча, Юліуша Славацкага, Генрыка Сянкевіча...

У нашай талерантнай краіне штогод у розных мясцінах ладзяцца святы, вечарыны ды імпрэзы, прысвечаныя польскай культуры. І вось завітала ў сталіцу, на філфак БДУ, свята мовы.

Вядучым імпрэзы быў вядомы гродзенскі акцёр, паэт, бард і шоумен Віктар Шалкевіч. Ён выпусціў пяць поўнафарматных альбомаў (у тым ліку са спевамі па-польску), стаў лаўрэатам многіх міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, а летась — другім гродзенцам (пасля Анатоля Грышука), што атрымаў ад польскіх дзяцей "Ордэн усмешкі" за прапаганду тэатральнага мастацтва.

Вечарына поўнілася яскравым гумарам, жартамі, конкурсамі.

Гучала толькі польская мова, ды ўсё было зразумела без перакладчыка: аўдыторыя, якая складалася са студэнтаў-філолагаў, навукоўцаў і прадстаўнікоў Польскага інстытута ў Мінску, шчыра адгукалася на жывы гумар і рэплікі вядучага, пацвярджаючы, што для сапраўднага сяброўства не існуе межаў. Увогуле, такія імпрэзы ўзбагачаюць узаемаадносіны дзвюх дзяржаў, яднаюць гістарычна і тэрытарыяльна блізкія між сабой культуры, падтрымліваюць давер і згоду.

Ксенія ШАРЖАНОВІЧ

Ініцыятыва

Два часопісы ў адным

Часопіс «Нёман» плённа працягвае практыку падрыхтоўкі матэрыялаў, звязаных з жыццём асобных рэгіёнаў. У выніку гэтага і з'яўляюцца па сутнасці два часопісы ў адным. Як адбылося гэта ў дзевятым нумары за сёлетні год. Большую частку ягонага аб'ёму займае «Витебская тетрадь».

Адкрываецца нумар гутаркай галоўнага рэдактара «Нёмана» М. Пазнякова са старшынёй Віцебскага аблвыканкама У. Андрэйчанкам. «Аповесць у запісках чыноўнага чалавека» — так вызначыў жанр свайго новага твора пісьменнік Г. Пацыенка. У паэтычным партфелі — вершы Т. Красновай-Гусачэнкі, Б. Бележэнкі, М. Намеснікава, А. Крыклівец і іншых аўтараў. А вось А. і Ю. Русецкія знаёмяць з жыццём і творчасцю мастака Альфрэда Ромера.

Дзесяты ж нумар прысвечаны Піншчыне. Старшыня Пінскага райвыканкама В. Рабкавец знаёміць з дасягненнямі працаўнікоў Піншчыны. Тамашняя зямля, як вядома, — радзіма выдатнейшай паэтэсы Я. Янішчыц, з дня нараджэння якой у лістападзе спаўняецца 60 гадоў. Успамінамі пра яе дзеліцца В. Гардзей, А. Ільін, А. Марціновіч. Змешчаны празаічныя творы В. Грышкаўца, М. Ляшук, А. Багаткі, паэтычныя — А. Шушко, Ж. Завацкай, М. Лаўровіча, Т. Лазнюхі, А. Чаплінскай ды іншых аўтараў з пінскай прапіскай. Р. Андрэявец расказвае аб прадстаўніках пінскага роду Бут-Гусаімаў, адзін з якіх стаў вядомым прадпрымальнікам у Калінінградзе. «Крымская сімфонія» — падарожныя нататкі ўраджэнца Піншчыны З. Прыгодзіча.

Зразумела, у абодвух нумарах змешчаны і матэрыялы, што не маюць дачынення да тэматычных падборак, але яны выклікаюць вялікую цікавасць. Прынамсі, новы раман А. Сакалова "Украдальнікі часу", прысвечаны авіятарам.

Напярадзе ж — дванаццаты нумар, які па традыцыі рыхтуецца сумесна з расійскімі пісьменнікамі.

Рэдакцыя "Нёмана" мае намер у наступным годзе прадоўжыць практыку выпуску двух часопісаў у адным, бо яна сябе цалкам апраўдала.

Алесь МАРЦІНОВІЧ,
намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Нёман"

Аб прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2009 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці

З 1989 года, раз у два гады, да свята працы — 1 Мая, прысуджаюцца прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. За гэты час лаўрэатамі сталі 21 калектыў прафесійнай і самадзейнай творчасці і 133 дзеячы культуры і мастацтва, журналісты.

У верасні 2008 г. прынята рашэнне аб умовах прысуджэння прэмій 2009 года. Будзе:

а) **чатыры прэміі** ў галіне літаратуры і мастацтва, у тым ліку:

за творы прозы, паэзіі і драматургіі — адна прэмія;

за музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць — адна прэмія;

за работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва — адна прэмія;

за творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва — адна прэмія;

б) **адна прэмія** за актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і самадзейнай творчасці працоўных (сярод кіраўнікоў прафсаюзных і ведамасных установ культуры);

в) **адна прэмія** за выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці;

г) **адна прэмія** ў галіне журналістыкі.

На саісканне прэміі ФПБ прымаюцца творы і работы апублікаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя за апошнія чатыры гады, але не пазней чым за 6 месяцаў да ўстаноўленага тэрміну вылучэння на саісканне прэміі. Не могуць быць прадстаўлены работы, якія адначасова вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, міжнародных прэмій ці прэмій іншых дзяржаў або якія ўжо атрымалі такія прэміі.

Колькасць саіскальнікаў на атрыманне прэміі ФПБ у складзе калектыву аўтараў не павінна перавышаць 4 чалавекі.

Вылучэнне работ і твораў на саісканне прэміі ФПБ праводзіцца на сходах працоўных калектываў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, пасяджэннях прэзідыумаў раённых, абласных і рэспубліканскіх камітэтаў і аб'яднанняў прафсаюзаў, калегій, прэзідыумаў і сакратарыятаў праўленняў органаў культуры, творчых саюзаў, міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым улічваецца **абавязковае** членства ў прафсаюзе кандыдата і яго **ўдзел** у рабоце прафсаюзнай арганізацыі, выбарных органаў прафсаюзаў і мерапрыемствах, якія праводзяцца прафсаюзамі, і да т. п.

Памер прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2009 года будзе ўстаноўлены пры прыняцці рашэння аб іх прысуджэнні ў красавіку 2009 г.

Дакументы і матэрыялы па вылучэнні работ і твораў на саісканне прэміі ФПБ прымаюцца да 31 снежня 2008 г. камісіяй у Федэрацыі прафсаюзаў (220126, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 21, пакой 915).

Тэлефон для даведак: 203-95-83.

А. СУША,
намеснік старшыні Камісіі па прэміях ФПБ у галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці, загадчык сектара апарата Савета ФПБ

Сучасная літаратурная крытыка: *крызіснае становішча?..*

Апошнім часам шмат гаворыцца пра вострую нястачу ў беларускай культурнай прасторы прафесійных літаратурных крытыкаў, што яны, калі і ёсць, то "абслугоўваюць" пэўных літаратараў ці літаратурныя "тусоўкі", пішуць суб'ектыўна, грунтуючыся не на аналітыцы, а спрэс на ўражаннях ды эмоцыях... Не магу сказаць, што сама не падзяляю гэтых меркаванняў. Але...

Мне стала цікава, што думаюць наконт стану літаратурнай крытыкі самі літаратары, якіх яна непасрэдна закранае. Так-так, я не агаварылася: закранае аўтараў. А хацелася б, каб пад павелічальнае шкло літкрытыкаў патраплялі усё ж такі творы. Я звярнулася да пісьменнікаў і паэтаў з наступнымі пытаннямі:

У якім стане, на ваш погляд, знаходзіцца сёння беларуская літаратурная крытыка?

Ці былі вы калісь нязгодныя з крытычнымі публікацыямі ў друку на вашыя кнігі?

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ:

Сёння крытыка ў крыху разгубленым стане. З аднаго боку, цікавыя артыкулы пра сучасны стан літаратуры Алеся Бельскага, Пятра Васючэнкі, Людмілы Рублеўскай, Ірыны Шаўляковай, Леаніда Галубовіча, Ганны Кісліцынай. З другога — зусім дылетанцкія выказванні пачаткоўцаў: або бязмернае захвальванне пасрэдных ці зусім слабых твораў, а то і ўвогуле *аглядзельная* крытыка, часта бяздоказная, эмацыйна-зласлівая, з жаданнем звяргаць усё і ўсіх.

Нязгода з крытычнымі артыкуламі была (хоць і не так часта), калі перад крытыкам стаяла не жаданне разабрацца, убачыць прычыны напісання таго ці іншага твора, дапамагчы паглядзець на сябе з боку, а жаданне мацней уджаліць, так бы мовіць, "походя" прайсціся па набалелым.

Алесь АРКУШ:

На маю думку, літаратурная крытыка ў Беларусі знаходзіцца ў вялікім крызісе. Я гады два таму ці нават болей прапаноўваў заснаваць адмысловы часопіс "Крытыка", каб гэтую праблему неяк развязаць.

Крызіс, на маю думку, палягае ў тым, што наша крытыка не здолела перабудавацца на сучасны лад і засталася такой, якой была за савецкім часам, калі яе задачай было адшукваць станоўчыя і адмоўныя бакі літаратурных твораў. Інакш кажучы, трэба было вынесці вердыкт: карысны ці шкодны твор.

Сёння гэтае пытанне, шкодны або карысны, не справа літаратурнай крытыкі. Крытыка павінна асэнсаваць твор, паспрабаваць разгадаць яго таямніцу, закантэкставаць яго ў прасторы айчыннай і міжнароднай літаратуры. Крытыка павінна быць цікавай, інтэлектуальнай, аўтарскай, і, па-мойму, адметны суб'ектывізм тут заахвочваецца.

Часцей за ўсё крытычныя выступы і рэцэнзіі на мае кнігі проста не выклікалі цікавасці. Крытык спрабаваў адшукаць дзеяслоўныя рыфмы, або нейкія няўдалыя вобразы. Крытык быў проста не ў стане заглыбіцца ў філасофію твора, зразумець яго вытокі, яго інспірацыю і рэмінісцэнцыі, якія ў ім ёсць.

Віктар ШНІП:

Дзякаваць Богу, літаратурная крытыка яшчэ ў нас жывая. І яна жыве і дае ўсім пісьменнікам адчуваць сябе жывымі дзякуючы і Леаніду Галубовічу, і Івану Штэйнеру, і Алесю Марціновічу, і Алесю Бельскаму, і Ладзе Алейнік, і Ганне Кісліцынай, і Людміле Рублеўскай, і Жане Капусце, і Ірыне Шаўляковай, і Уладзіміру Гніламёдаву... Пералік можна працягваць, але ён не будзе вялікім. Шкада, што тыя крытыкі, якія гадоў 15—20 таму ўступалі ў Саюз пісьменнікаў за літаратуразнаўчыя працы, сёння забыліся на сваю, часцей за ўсё, няўдзячную справу.

Самы галоўны для мяне крытык — гэта я сам. Але я з вялікай павагай і ўдзячнасцю адношуся да кожнага з крытыкаў, якія спрабуюць разабрацца ў тым, што я пішу. Праўда, паглыбіцца ў мае творы, дайсці і разабрацца ў іх сутнасці на сённяшні дзень найлепш за ўсіх здолеў толькі Іван Штэйнер. І калі я з нечым з таго, што напісана пра мяне, не згодны, то гэта мае праблемы. Я не бог, а тым больш крытыкі не багі. І ўсё ж крытыкаў трэба "не адстрэльваць", як ваўкоў, а ахоўваць, каб яны размнажаліся, бо толькі дзякуючы ім у друку будуць з'яўляцца здаровыя творы...

Арцём КАВАЛЕЎСКІ:

Сённяшняя літаратурная крытыка апынулася ў надзвычай складанай сітуацыі і пэўнай разгубленасці. Апошнія дзесяцігоддзі адзначаны спробамі выпрацоўкі новых канцэпцый і мадэлей аналізавання літаратуры і мастацтва наогул. Часам складаецца ўражанне, што крытыкі і іх творы больш патрэбныя аўтарам, а не чытачам. Адчуваецца часовы калапс: сама крытыка як адна з форм літаратурна-пазнавальнай дзейнасці перастае адпавядаць як стану сучаснай літаратуры, так і патрабаванням чытачоў. Існуюць усе перадумовы, каб чыста ацэначныя рэцэнзіі выйшлі з ужытку з прычыны іх незапатрабаванасці.

Што датычыць згоды/нязгоды аўтара з крытычнымі меркаваннямі ў друку адносна яго твораў, то тут усё залежыць ад характару такіх выступаў. Калі гэта, скажам, невялікая згадка альбо рэпліка з нагоды выхаду новай кнігі ці нізкі вершаў, то, хутчэй за ўсё, нейкага непаразумення з крытыкам не ўзнікае з прычыны сцісласці матэрыялу, які не прэтэндуе на аналітычнасць і заглыбленую інтэрпрэтацыю. Аднак калі ў друку з'яўляюцца больш разгорнутыя матэрыялы, а тым больш рэцэнзіі, то паразуменне з крытыкам можа ўскладніцца. Справа ў тым, што, напэўна, не існуе ніводнага аўтара, які б да канца пагадзіўся з крытыкам сваіх твораў, прыняў бы яго інтэрпрэтацыйную мадэль як адзіна універсальную. Гэта не значыць, што аўтар мусіць абавязкова аспрэчваць пазіцыю крытыка.

У практыцы "ўзаемінаў" маіх твораў з крытычнымі меркаваннямі аб іх у друку было некалькі эпізодаў прынцыповай нязгоды мяне як аўтара з выступамі крытыкаў. Памятаю, дзесяць гадоў таму журналістка газеты "Советская Белоруссия" Вікторыя Папова, робячы агляд літаратурных часопісаў у артыкуле "В поисках поиска" (дагэтуль памятаю назву!), напісала літаральна наступнае пра маю нізку вершаў у "Першацвеце": "В стихах Артема Ковалевского каверзные предложения. К примеру, взять все люстры мира и разбить их в один миг". Тады мяне — зусім юнага паэта — абурыў не столькі прымітыўны, банальны каментар верша, колькі няслушны пераклад беларускага слова "люстры", які і стаў, відаць, адной з прычын кандовай інтэрпрэтацыі. Калі б "крытык" ведаў, што беларускае "люстры" — гэта па-руску "зеркала", а таксама б карэктна працытаваў досыць лаканічны верш, які фактычна заканчваецца рытарычным пытаннем ("Давайце возьмем / Усе люстры свету / Ды разаб'ем іх / У адно імгненне. / Хіба патрэбны нам / Пачварныя адбіткі?"), думаю, абвінавачанне ў "каверзных предложениях" проста б не ўзнікла. На жаль, з падобнымі "крытычнымі выступамі" мне даводзілася сустракацца неаднойчы...

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ:

Добра ўжо тое, што ўсё часцей падымаецца пытанне пра стан актуальнай беларускай крытыкі. Толькі тады, калі на кожны прыкметны твор беларускай літаратуры будзе з'яўляцца не адна, а чатыры, пяць, дзесяць рэцэнзій, калі яны будуць напісаныя з розных пазіцый, і да дыскусіі пачнуць далучацца чытачы — можна будзе гаварыць пра жывы літаратурны працэс. На жаль, да гэтага далёка, і ўсё яшчэ не зжыве сябе ўстаноўка на меркаванне крытыка залежнасць ад розных абставін, ці калі крытычнае выказванне ўспрымаецца як асабістая абраза. З другога боку, ніхто не хоча выглядаць менш "прасунутым" за іншых, пахваліць нешта "нямоднае" альбо пакрытыкаваць "магістральнага аўтара". І самае непрыстойнае, на мой погляд, калі крытыкам кіруе нешта акрамя ўласна літаратурных меркаванняў.

Мне даводзілася сутыкацца з рознымі відамі рэцэнзій на свае творы — і тых, дзе крытык сапраўды спрабаваў зразумець, што я хацела сказаць і наколькі мне гэта ўдалося, і тых, дзе зводзіліся асабістыя рахункі ці выконваўся "заказ". Вядома, цяжка захаваць стаіцызм, калі з сярэдзіны доўгага сюжэтнага верша выдзіраецца страфа, на падставе якой даводзіцца, што твой верш — вось пра гэта, хаця насамрэч ён пра супрацьлеглае, варта толькі прачытаць цалкам. Але мне, на шчасце, уласціва пачуццё іроніі і самаіроніі, таму ўдзячна ўсім сваім крытыкам. Асабліва прыемна чуць важкае слова ад старэйшых, такіх, як Міхась Тычына, Дзмітрый Бугаёў.

Юрась БАРЫСЕВІЧ:

Літаратура, прынамсі, у Беларусі надта блізкая да сфераў ідэалагічнай барацьбы, таму прафесійныя аглядальнікі (супрацоўнікі дзяржаўных газет або амерыканскага Радыё Свабода) цікавяцца найперш палітычнымі поглядамі пісьменнікаў, падтрымліваюць традыцыяналізм, кансерватыўныя тэндэнцыі левага ці правага кірунку. Незалежным назіральнікам (у блогах і незарэгістраваных выданнях) адсутнасць ганарараў даваляе займацца крытыкай хіба што ў якасці хобі. Аматары звычайна пішуць хаатычна, але почасту іхнія здагадкі сягаюць глыбей, а погляды шырэй за сістэмнае мысленне ангажаваных прафесіяналаў.

Ірына Шаўлякова ў сваёй кнізе "Рэстаўрацыя шчырасці" памылкова праінтэрпрэтавала назву маёй кнігі "Alter nemo" — быццам бы перакласці з лаціны яе можна не як "Іншае ніхто", а папросту "Я". Адпаведна, і кнігу Шаўлякова раіць чытаць у гэтым ключы, які можа адкрыць там хіба некаторыя дзверы. Дарэчы, я быў рэдактарам "Рэстаўрацыі шчырасці", нават абраў гэтую назву з некалькіх варыянтаў, якія мела Ірына. І мог бы прымусіць аўтарку змяніць тэкст пра мяне, але не стаў таго рабіць, бо крытыка, лічу, павінна быць суб'ектыўнай. Больш за тое, крытыка павінна быць канструктыўнай не толькі ў этычным, але і эстэтычным плане — павінна сама прапаноўваць новыя тэмы, жанры, мастацкія прыёмы.

Пятро ВАСЮЧЭНКА:

Спачатку хацеў бы сказаць, хто такі, на маю думку, крытык. Крытык — гэта прафесійны чытач. І на сёння гэта даволі рэдкая прафесія. Ёсць літаратуразнаўцы, але яны займаюцца гісторыяй літаратуры, праблемамі тэорыі і гэтак далей. Застаецца катэгорыя прафесійных чытачоў, якая займаецца чытаннем тэкстаў. Такія ёсць, безумоўна. Прафесійна гэтым займаюцца Ганна Кісліцына, Ірына Шаўлякова ды іншыя крытыкі. Сярод маладых хацеў бы адзначыць Маргарыту Аляшкевіч, Алісу Бізяеву, якая займаецца інтэрнет-крытыкай. На журфаку быў спецкурс, на якім я спрабаваў падрыхтаваць крытыкаў. У некаторай ступені мне гэта ўдалося. На сёння стан крытыкі залежыць ад асобы, а не столькі ад прафесійных якасцей, якія можна выхаваць. Ад асобы, бо гэта прафесія рэдкая і не вельмі ўдзячная. Трэба, каб у кожнай рэдакцыі быў штатны крытык, які атрымліваў бы за сваю працу добры ганарар. Праблема сучаснай крытыкі — гэта не праблема яе ўзроўню, а праблема пошуку асобы.

Хачу адзначыць, што лімаўская крытыка дастаткова прафесійная. Напрыклад, Леанід Галубовіч, Жана Капуста.

Я ніколі не крыўдаваў на суб'ектыўныя выказванні крытыкаў на свае кнігі. Гэта не какецтва, я лічу, што любое выказванне характарызуе творчы працэс. Іншая рэч, што часам аўтары балюча рэагавалі на мае выказванні на іх творы. Раней я лічыў, што мая крытыка можа дапамагчы аўтарам пазбавіцца ад некаторых недахопаў, цяпер прыйшоў да думкі, што крытык павінен быць асцярожным з творчай асобай, бо не кожны талент можа вытрымаць нават даволі нейтральныя заўвагі адносна іх твораў.

Зміцер ВІШНЁЎ:

Крытык мусіць быць свайго кшталту хірургам. Я ж бачу суцэльных нябожчыкаў, якія самі ўжо апынуліся ў ролі пацыентаў для патолагааната маў. Тыя нешматлікія персанажы, якія прэтэндуюць на паважнае месца літаратурнага хірурга, часцей за ўсё на паверку такімі не з'яўляюцца. Часцяком крытыку ў нас блытаюць з іншымі жанрамі. Канструктыўных аргументаў вельмі мала — альбо дыфірамбы, альбо "сам дурань". На большае нашая творчая прастора сёння не здатная. Зрэшты, мы ўсе ведаем тых, хто спрабуе сябе на гэтай ніве...

Як на мой суб'ектыўны погляд, можна вылучыць і жменьку цікавых імёнаў у літаратурным крытычным асяродку: Ірыну Шаўлякову, Рыгора Ізмарцэвіча, Віку Трэнас, Майкла Галдзянкова, Маргарыту Аляшкевіч, Пятра Васючэнку, Міхася Южыка і Надзею Шакун. Я не магу сказаць, што яны самыя незаангажаваныя і аб'ектыўныя (і заўсёды суперпрафесійныя), але іх думка мяне асабіста цікавіць. Яшчэ дадаў бы Арцёма Кавалеўскага. Думаецца, што такія знаныя даследчыкі як Віктар Жыбуль, Вера Бурлак, Інеса Кур'ян, Юрась Пацюпа, Серж Мінскевіч, Юрась Барысевіч, Алесь Туровіч маглі б быць больш актыўнымі (і, натуральна, што яны былі б вельмі актуальнымі) на палях крытычных баталіяў. Ну, вось нейкія імёны агучыў. А дзе ж крытыка?

Рэдакцыя запрашае ўсіх зацікаўленых літаратараў, як са сталіцы, так і з рэгіёнаў рэспублікі, з тым разлікам, што гэтая гаворка не "зацэментуецца" на канкрэтыцы падняты х пытанняў, а выйдзе на шырокі канцэптуальны агляд набалелых праблем сучаснага літаратурнага працэсу.

Падрыхтавала Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Міжнародны з'езд славістаў адбудзецца ў Беларусі

Гэтыя важныя міжнародныя навуковыя форумы, на якіх абмяркоўваюцца праблемы развіцця славістыкі ў свеце, адбываюцца праз кожныя пяць гадоў па чарзе ў розных славянскіх краінах, пачынаючы з 1929 года. Першы такі з'езд прайшоў у Празе, другі — у Варшаве, трэці павінен быў адбыцца ў 1939 годзе ў Белградзе, але яго адмянілі ў сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны. Рэгулярнымі яны сталі пасля 1958 года, калі ў Маскве адбыўся IV з'езд славістаў. Пасля навукоўцы сустракаліся ў Сафіі, Празе, Варшаве, Заграбе, Кіеве, Браціславе, Кракаве, Любляне. XIV Міжнародны з'езд славістаў адбыўся сёлета ў горадзе Охрыдзе ў Македоніі. Каардынацыю навуковых даследаванняў у галіне славістыкі, а таксама падрыхтоўку да з'ездаў ажыццяўляе Міжнародны камітэт славістаў — грамадская навуковая арганізацыя, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі 40 краін свету. Старшынёй Міжнароднага камітэта славістаў звычайна выбіраецца прадстаўнік той краіны, якая будзе праводзіць чарговы з'езд. Такім чынам, упершыню за 80-гадовую гісторыю існавання Міжнароднага камітэта славістаў яго будзе ўзначальваць беларус, і Беларусь, будзе ўплываць на развіццё славістычнай навукі ў наступныя 5 гадоў. Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ — дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар, доктар філалагічных навук, старшыня Беларускага камітэта славістаў абраны на наступны перыяд старшынёй Міжнароднага камітэта славістаў. Сярод першых, хто павіншаваў Аляксандра Аляксандравіча з гэтай пачэснай місіяй, быў карэспандэнт "ЛіМа".

— *Правядзенне чарговага юбілейнага XV Міжнароднага з'езда славістаў менавіта ў Беларусі стане вельмі важнай і прэстыжнай падзеяй у навуковым і культурным жыцці нашай краіны, таму што такія шырокія славістычныя навуковыя форумы набываюць агульнадзяржаўнае гучанне. Яны сведчаць аб прызнанні ўзроўню развіцця нацыянальнай славістыкі ў краіне і садзейнічаюць міжнароднаму прэстыжу самой краіны. Падобныя форумы ў Беларусі не праводзіліся яшчэ ніколі, і вельмі сімвалічна, што такі з'езд будзе праводзіцца ў нас у той час, калі краіна паспяхова ўваходзіць у сусветную супольнасць як паўнапраўны партнёр у палітычнай, эканамічнай і навуковай дзейнасці,* — зазначае Аляксандр Лукашанец. — *Абранне месцам наступнага з'езда Беларусі і горада Мінска я расцэньваю перш за ўсё як прызнанне дасягненняў беларускай славістычнай і ўвогуле гуманітарнай навукі, а таксама як вынік актыўнай папярэдняй дзейнасці Беларускага камітэта славістаў.*

Беларускі камітэт славістаў створаны ў 1957 годзе для падрыхтоўкі беларускіх вучоных да IV Міжнароднага з'езда славістаў у Маскве, з 1959 года функцыянуе на пастаяннай аснове пад кіраўніцтвам Савецкага камітэта славістаў, а з 1991 года з'яўляецца самастойнай нацыянальнай навукова-грамадскай арганізацыяй, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці са Статутам Міжнароднага камітэта славістаў. У склад Беларускага камітэта славістаў уваходзяць вядучыя беларускія спецыялісты ў галіне беларускага і славянскага моўнаведства, літаратуразнаўства, культуралогіі і фальклярыстыкі. Старшынямі Беларускага камітэта славістаў у розныя часы былі П. Ф. Глебка (з 1957 г.), М. Р. Суднік (з 1959 г.), А. І. Жураўскі (з 1985 г.), І. Я. Навуменка (з 1989 г.), А. А. Лукашанец (з 2004 г.).

Беларускія вучоныя рэгулярна прымаюць удзел у гэтых з'ездах. Пачынаючы з Кракаўскага (1998 года) Міжнароднага з'езда славістаў, калі Беларусь стала незалежнай славянскай дзяржавай, наша прадстаўніцтва і ўдзел у гэтых міжнародных навуковых форумах стала вельмі значным. Беларускія дэлегацыі на апошніх трох з'ездах складалі не менш як 20 чалавек, што для нашай адносна невялікай славянскай краіны досыць прадстаўнічая квота. Гэта сведчыць пра ўзмацненне навуковых пазіцый Беларусі ў свеце, асабліва ў сферы гуманітарнай дзейнасці. З другога боку, гэта дазваляе больш шырока прадставіць звесткі пра беларускую мову, літаратуру, культуру і беларускія народныя традыцыі не толькі ў славянскім, але і ва ўсім свеце.

— *Удзел нават у апошнім з'ездзе славістаў дазволіў нам не толькі комплексна і ўсебакова прадставіць звесткі пра Беларусь, яе нацыянальную і духоўную культуру, але і паказаць дыяпазон навуковых даследаванняў у гэтых галінах гуманітарных ведаў* — працягвае Аляксандр Лукашанец. — *Форум праходзіў з 10 па 16 верасня ў Македоніі (у горадзе Охрыдзе). У ім удзельнічалі больш як 700 вучоных з 40 краін свету. Беларуская дэлегацыя на гэтым з'ездзе налічвала 20 чалавек, што адпавядае выдзеленай квоце. Усе ўдзельнікі з Беларусі выступілі з дакладамі на секцыйных пасяджэннях, а таксама ўдзельнічалі ў пасяджэннях "круглых сталоў" і тэматычных блокаў.*

Падчас з'езда працавала кніжная выстаўка, на якой дэманстравалася навуковая літаратура па праблемах даследавання славянскіх моў, літаратур, культур і фальклору, надрукаваная за апошнія пяць гадоў у розных краінах, якія прымалі ўдзел у з'ездзе. На выстаўцы былі прадстаўлены і даследаванні беларускіх вучоных, прычым наша кніжная выстаўка прызнана адной з лепшых як па колькасці, так і па якасці выданняў. Беларусь прадставіла звыш 100 выданняў — літаратуру, прысвечаную даследаванням у галіне сучаснай славістыкі, у тым ліку і беларускай мовы, літаратуры, фальклору і культуралогіі: чарговыя тамы этымалагічнага і гістарычнага слоўнікаў, перавыданне прац Я. Карскага, энцыклапедычныя даведнікі па беларускім фальклоры і традыцыйнай народнай культуры, шматлікія манаграфічныя даследаванні і многія іншыя. Такім чынам, Беларусь была прадстаўлена як незалежная славянская дзяржава, якая займае належнае месца ў славянскай і сусветнай супольнасці, як краіна з высокім узроўнем развіцця гуманітарнай навукі.

Пры Міжнародным камітэце славістаў працуюць пастаянныя камісіі, якія займаюцца вывучэннем і правядзеннем сумесных даследаванняў па розных галінах славяназнаўства, культуразнаўства і культуралогіі. На сённяшні дзень зарэгістраваны 33 такія камісіі: біблійная камісія, камісія па славянскіх літаратурных мовах, камісія па сацыялінгвістыцы, па моўных кантактах, па лексікаграфіі, па словаўтварэнні ды іншыя. У большасці камісій ёсць прадстаўнікі і з Беларусі.

— *Правядзенне з'ездаў дазваляе больш шырока прадставіць і нашу беларускую культурную спадчыну. Беларускі народ мае багатую шматвяковую гісторыю, арыгінальную культуру, адметную мову,* — падкрэслівае старшыня Беларускага, а цяпер і Міжнароднага камітэта славістаў Аляксандр Лукашанец. — *Традыцыі беларускага пісьменства пачалі актыўна развівацца з прыняццем хрысціянства і атрымалі шырокае распаўсюджанне ў гэтай частцы славянскага свету. І цывілізаванаму свету добра вядомы імёны такіх усходнеславянскіх і беларускіх асветнікаў, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Мікола Гусоўскі і многія іншыя.*

Беларуская зямля падарыла свету выдатнага прадстаўніка еўрапейскай Рэфармацыі, усходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыну, які друкаваў свае кнігі "для добрага навучання простым людзям".

Захавалася велізарная колькасць помнікаў старабеларускага пісьменства разнастайных жанраў, якія складаюць не толькі нацыянальны скарб беларускай культурнай спадчыны, але і з'яўляюцца значнай часткай сусветнай духоўнай культуры.

Унікальным запаведнікам славянскіх старажытнасцей з'яўляецца Беларускае Палессе, дзе ў некранутым выглядзе захаваліся самыя архаічныя моўныя рысы, элементы традыцыйнай народнай культуры, вывучэнне якіх садзейнічае больш поўнаму і ўсебаковаму асэнсаванню этнагенезу славян, іх узаемасувязей і ўзаемадзеяння з іншымі народамі і культурамі.

Напрыклад, літаратурна-рэлігійная дзейнасць усходнеславянскага рэлігійнага дзеяча Кірылы Тураўскага выходзіць шырока за межы гэтага рэгіёна. Як вядома, Кірыла Тураўскі быў не толькі буйным рэлігійным дзеячам, а і таленавітым пісьменнікам, ён стаіць у адным шэрагу з найбольш вядомымі славянскімі праваслаўнымі пісьменнікамі таго часу. Унікальнасць гэтай асобы і ў тым, што гэта адзіны ўсходнеславянскі пісьменнік XII стагоддзя, творы якога найбольш поўна захаваліся да нашых дзён. Напрыклад, да нас дайшло больш 50 арыгінальных твораў, якія перакладаліся на многія мовы, у тым ліку і на сучасную беларускую.

— *Думаю, што і наш XV Міжнародны з'езд славістаў пройдзе пад знакам асоб, якія аказалі выключна вялікі ўплыў на развіццё нашай культуры і пісьменства. І Кірыла Тураўскі, і Еўфрасіння Полацкая, і Францыск Скарына — гэта тыя асобы, якія могуць стаць сімвалам XV Беларускага Міжнароднага з'езда славістаў у 2013 годзе. І, пэўна, будзе арганізаваны асобны праблемны "круглы стол", прысвечаны дзейнасці і вывучэнню спадчыны постацей, якія аказалі найбольш значны ўплыў на развіццё культуры, духоўнасці, пісьменства на тых тэрыторыях, якія займае сучасная Беларусь.*

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: Акадэмік Мілан Гюрчынаў, старшыня Македонскага камітэта славістаў, старшыня Міжнароднага камітэта славістаў 2003 — 2008 гг. (справа) перадаў мандат на правядзенне XV Міжнароднага з'езда славістаў Аляксандру Лукашанцу.

ВІНШУЕМ

з **90**-годдзем **Бажко** Алеся (Аляксандра Цімафеевіча), беларускага пісьменніка.

з **85**-годдзем **Шумава** Міхаіла (Міхаіла Іосіфавіча Шульмана), беларускага празаіка.

з **75**-годдзем **Шчасную** Нінэль Іванаўну, беларускую мастачку.

з **75**-годдзем **Дабралюбава** Ігара Міхайлавіча, беларускага кінарэжысёра.

з **70**-годдзем **Саламевіча** Янку (Івана Уладзіміравіча), беларускага літаратуразнаўца, перакладчыка.

з **60**-годдзем **Пракаповіча** Міколу (Мікалая Мікалаевіча), беларускага паэта.

з **60**-годдзем **Сердзюкова** Мікалая Мікалаевіча, беларускага пісьменніка.

з **60**-годдзем **Шамякіну** Таццяну Іванаўну, беларускага літаратуразнаўца, перакладчыцу.

з **60**-годдзем **Філімонаву** Любоў Аляксандраўну, беларускую паэтэсу, празаіка, перакладчыцу.

з **60**-годдзем **Яраца** Віктара Уладзіміравіча, беларускага паэта, літаратуразнаўца.

з **50**-годдзем **Клімковіча** Максіма Аляксандравіча, беларускага пісьменніка.

Юбілейны каляндар

275 гадоў **Нарушэвічу** Адаму Тадэвушу Станіславу, гісторыку, літаратару, рэлігійнаму дзеячу.

220 гадоў **Насовічу** Івану Іванавічу, беларускаму моваznаўцу-лексікографу, фальклярысту, этнографу.

185 гадоў **Плугу** Адаму (Пяткевічу Антону Антонавічу), польскаму і беларускаму літаратару.

170 гадоў **Радзевічу** Міхаілу Васільевічу, рускаму і беларускаму публіцысту, этнографу.

145 гадоў **Шапялевічу** (Лазар-Шапялевічу) Льву Ульянавічу, гісторыку літаратуры, археолагу.

120 гадоў **Драздовічу** Язэпу Нарцызавічу, беларускаму мастаку, навукоўцу, пісьменніку.

115 гадоў **Уладамірскаму** (Малейку) Уладзіміру Іосіфавічу, беларускаму акцёру.

105 гадоў **Герасімаву** Мікалаю Апанасавічу, беларускаму празаіку.

105 гадоў **Кацовічу** Лазару Абрамавічу, беларускаму празаіку, кінасцэнарысту.

100 гадоў **Мілюцю** Алесю (Аляксандру Макаравічу), беларускаму паэту.

95 гадоў **Агняцвет** Эдзі (Каган Эдзі Сямёнаўне), беларускай паэтэсе.

80 гадоў **Кейзараву** (Кейзераву) Аляксею Сцяпанавічу, беларускаму празаіку, нарысісту.

80 гадоў **Супруну** Адаму Яўтенавічу, беларускаму моваznаўцу.

70 гадоў **Блакіту** Валянціну (Болтачу Валянціну Уладзіміравічу), беларускаму празаіку, публіцысту, паэту.

70 гадоў **Казакову** Міхасю (Міхаілу Аўрамавічу), беларускаму паэту, перакладчыку.

Таму, хто знайшоў

На жаль, не ўсім выпадае шчасце ў штодзённай мітусні знайсці сваю другую палову. Не ўсе прыходзяць і да паразумення. З сабой і светам. Трэцяя кніга Таццяны Сівец "Таму, хто знойдзе...", што складаецца з паэзіі, прозы, драматургіі і перакладаў, абяцае завесці нас у чароўны свет пошукаў кахання, шчасця, сэнсу жыцця...

Таццяна Сівец сваёй пранікнёна-шчырай паэзіяй шукае сваю другую палову. Толькі пошукі гэтыя афарбаваныя не радасным прадчуваннем шчасця, а стомленасцю і часта адчаем: *"Пакліч мяне, заваб надзеяй таемай — / Я так даўно "сягоння" не жыла!"* Гэтым настроем, які паступова забірае і нас у палон, прасякнута ўся паэзія Таццяны.

Першы раздзел кнігі «Каханне: Гісторыя хваробы» поўны такой глыбокай тугі па каханым, такім адчаем, які *"склаў расклад на заўтра..."*, што нявольна наварочваюцца слёзы, а сэрца ахутваецца паразуменнем ды спачуваннем лірычнай гераіні Таццяны Сівец, якой яна сама па сутнасці і з'яўляецца. Распачынае кнігу верш "Свабода!!!" Але не тая гэта свабода, не жаданне быць незалежна-самастойнай — наадварот: свабода ад пастаяннага пошуку-чакання яго, адзінага. Таццяна марыць *"Заснуць і сніць блакітную расу"* і прачнуцца шчаслівай... У вершах-малітвах — бясконцыя спадзяванні ды жаданні:

Захочацца стуліцца
ў самы кут,
У нечаканай любасці
схавацца,
З тым, хто далёка,
пераплесці пальцы,
Таму, хто побач,
працягнуць руку...

Як Валерыя Кустава мякка прамаўляе: *"Дазвольце з Вамі слухаць цішыню"*, так яе хоча ўнікнуць Таццяна Сівец, *"...каб быць з Цішынёю навечна на Вы"*. То просіць ад яе пазбавіць (*"Ты выратуй мяне ад цішыні"*), а то амаль зрываецца на мальбу-енк:

Цішыня...
Быццам вар,
апякае далоні і вусны,
Цішыня...
У вузлы пазакручвала
ўсе скразнякі.
Цішыня...
Бы ў палонку,
у снежна-блакітную вусціш...
О, мой кат і ўладар!
Не жадаю табе цішыні...

Апошні верш раздзела радуе больш аптымістычным: *"Я пакіну свой сум"*, ды зноў вяртае да надзеі, веры ў лепшае: *"Я заўсёды чакаю... Цябе..."* Але самотна-стомленае: *"І заўсёды не там..."* падказвае, што наступны раздзел "Хутка сходнія дні..." будзе вытрыманы ў падобнай стылістыцы, афарбаваны адзінока-самотным настроем. Сапраўды, зноў бясконцыя *"азёры сноў"*, зноў слёзы, на якія лірычная гераіня мяняе лёс... ды *"сухія зоры"*, што *"падалі з галін/ і прарасталі на тваёй раллі"*. Іх паэтка збірае пасеяць *"у ранах незагойных"*. Таццяна з дакорам, невымольным болем кажа нам, раўнадушным сузіральнікам, нібы перад Алтаром:

Я ішла на святло,
Адчыняла замкнёныя
дзверы,
Пазычала жыццё
І не слухала баек
пра смерць.
Ды прызначылі
дом мой на злом,
І ніколі ніхто не паверыць,
Што ў каменных грудзях
Можа сэрца
ад болю шчымець.

Працягваючы тэму кахання як хваробы, Таццяна Сівец піша верш "Дыялог аўтаркі з урачом": *"— Да мяне прыходзіць Смутак... / А чацьвёртай, па світанні... (...) — Ён...Гаючы і няўтольны... Сарамлівы і здзічэлы..."* Рэцэпт урача аказваецца да расчаравання банальным: *"— А чацвёртай трэба спаць!"* Што, зрэшты, аўтарка й робіць, бо стан сну прысутнічае ў большасці ейных тэкстаў. Апошнія вершы раздзела нібы падводзяць мяжу бясконцаму суму: *"Я прашу, каб спынілася/ Гэта гульня"*, зноўку акрыляюць паэтку надзеяй: *"І ўпарта чакаю цуду..."*

У трэцяй паэтычнай частцы "Stigma" лірычная гераіня Таццяны Сівец так і не прыйшла да чаканага спакою. Наадварот, нібыта рухаючыся па спіралі, яшчэ больш паглыбляецца ў стан нервовага непаразумення з сабой і светам ды амаль нястрымана-балючага чакання. Таццяна не можа (не хоча?) абудзіцца ад трывожнага сну, дзе *"толькі цемра./ Цемра над усім"*. Яна імкнецца *"Забыць, забыцца і схавацца ў... рэўнасць!"*, *дзе "так холадна! Далёка да цяпла..."*, а між тым мне падаецца, што гэты паўсонны, нават у чымсьці паўжывы стан вечных унутраных пакутаў, "псіхалагічнай мастурбацыі", як казала гераіня "Сунічнай паляны" Інгмара Бергмана, прыносіць лірычнай гераіні Таццяны Сівец глыбокае задавальненне. Гэткае самалюбаванне-самакатаванне, якое спыніць цяжка, ды якое нарэшце прыводзіць да высновы: *"Веру я/ не ўсё яшчэ завершана!"* Дай Бог, думаю я, перагортваючы апошні (быццам аптымістычны) верш "Без надзеі спадзяюся"...

Проза і драматургія Таццяны Сівец абуджаюць нас ад летаргічнага сну (паводле аўтара, "хваробы") пад назвай "каханне" і пераносяць у казачна-містычны свет, дзе панаюць зусім недзіцячыя праблемы выхавання, непадабенства да іншых і бясконцых пакутаў праз гэта, а драматычная казка "Шафа" вяртае нас у 30-я гады мінулага стагоддзя, дзе Кароль Злодзей Першы ды Галоўны Каралеўскі Чараўнік вяршаць прысуды над "ворагамі народу", а Выхавацелька з Чалавекам-у-чорным-фрэнчы забіраюць іх дзяцей у прытулак, дзе вучаць іх "быць благадарнымі за шанс, каторы ім дала наша обшчаства"... Сумна, але дзеці так і не скарысталіся напоўніцу чароўнымі магчымасцямі шафы і не вызвалілі бацькоў з палону, бо шафу як "предмет буржуазной роскоши" зносяць на дровы...

Мне падаецца вельмі лагічным, што Таццяна Сівец, выпускніца БДПУ імя М. Танка, звяртаецца да жыцця студэнткі-практыканкі, якая выкладае ў малодшых класах. (Не ведаю толькі, наколькі лагічна, што тая на дзіцячае "...прыходзьце да нас яшчэ!" думае са схаваным нервова-істэрычным выкрыкам "Не дачакаецеся!!!") Цікавай падалася мне наступная акалічнасць: калі справа датычыцца выхавання-выкладання, настрой тэкстаў са спакойна-разважлівага скатваецца на нервовы, пастаянна зрываецца на крык. Напэўна, праца настаўнікам, няхай сабе й практыкантам, сапраўды расхістваe нервовую сістэму.

Часта сваімі героямі Таццяна робіць вар'ятаў. Сярод іх і дзядзька Анатоль, які піша лісты да нябожчыкаў, і дваццацігадовая Валянціна, якая на іх адказвала, і насельнікі Горада з "Ценю пацука"... Нават у вышэйназванай "Шафе" знайшлося месца Вольцы=Вар'ятцы, дзяўчынцы з галоднымі вачыма, якая выдавала сябе за жонку Караля Злодзея Першага. Мяркую, гэтая цікаўнасць Таццяны да людзей з адрознай ад нас псіхікай тлумачыцца жаданнем спасцігнуць псіхалогію "іншых". Проза, у адрозненне ад паэзіі не так сканцэнтраваная на асобе аўтаркі, яна заглядае ў падобна-непадобных, звычайна-незвычайных нас з вамі.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Кніжная паліца

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла ў свет выдатна ілюстраваную кніжку нарысаў **Вячаслава СЕМАКОВА** і **Мікалая БАМБІЗЫ** *"Дед Мороз и его родня"*. "Дзе жыве дзед Мароз? Бабыль ён ці жанаты? На чым ездзіць? Дзе "прапісаны"? На гэтыя і шмат якія іншыя пытанні і адказваюць аўтары гэтай цікавай кнігі, якую можна было б назваць і "Марозазнаўствам". Кніжка цікавая для ўсіх узростаў.

У Мінску, у выдавецтве "Мясцовы Літаратурны Фонд", выдадзены чарговы вершаваны зборнік **Алеся ВАБІЧА** (Кузняцова Мікалая Васільевіча — вядомага беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара) *"Дзянніца"* (на беларускай і рускай мовах). У зборніку апісаны *"светлыя праявы чалавечых пачуццяў і мрояў, найперш, каханне. Ліра паэта апявае жыццёвыя з'явы, складанасці чалавечай псіхалогіі, вызначаецца шчырасцю і глыбокім пранікненнем у сутнасць падзей і з'яў"*.

У выдавецтве "Право и экономика" выйшла кніга **М.В.КУЗНЯЦОВА** *"Барятинские"* (гісторыя роду князёў рускіх). У кніжцы на аснове навуковага аналізу прац гісторыкаў, успамінаў вядомых дзеячаў Расіі, дыпламатаў некаторых заходніх дзяржаў распавядаецца пра дынастыю князёў Барацінскіх. Асноўная ўвага ўдзяляецца найбольш важным і складаным этапам гісторыі зямлі расійскай, якой князі служылі верай і праўдай.



У выдавецтве "Кнігазбор" асобнай кнігай выдадзены біяграфічны нарыс **Дзмітрыя ВІНАГРАДАВА** *"Время в самом себе"* — пра жыццё і творчасць пісьменніка Васіля Рыгоравіча Гурскага, "героямі твораў якога з'яўляюцца радавыя партызаны, што вынеслі на сваіх плячах цяжар вайны". У аснову кнігі пакладзены ўспаміны і дакументы В. Гурскага, а таксама матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь ды шмат якіх гістарычных энцыклапедычных звестак.

У выдавецтве "ВолЯ" выйшла ў свет асобнай кніжкай ліставанне **Васіля БЫКАВА і Рыгора БАРАДУЛІНА** (1960—2003) пад назвай *"Дажыць да зялёнай травы..."* У кнізе таксама ўпершыню найбольш поўна падаюцца выяўленчыя працы В. Быкава.

Кніга ад беларусістаў

Беларусістыка Польшчы — з усіх замежных, мабыць, найбольшая стажам і колькасцю прыхільнікаў — дадала ў сваю скарбонку чарговае выданне: Białoruś w XX stuleciu w krugu kultury i polityki. Pod redakcja Doroty Michalik. Torun, 2007. Пад шыкоўнай вокладкай сабраны тэксты 35-і аўтараў: польскіх, беларускіх, літоўскіх, расійскіх, украінскіх. Пералічыць усе тэмы не выпадае. З гледзішча як агульна сістэмнага падыходу, так і канкрэтна гістарыяграфічнага, культуралагічнага напаўнення разгледжаных пытанняў, тэксты ў кнізе аб'яднаны ў раздзелы — "Вакол беларускай нацыянальнай ідэі", "За дзяржаўную незалежнасць", "Вайна і дыпламатыя", "Эміграцыя — міграцыя — бежанства", "Культура і асвета". У межах пералічаных тэматычных блокаў прааналізаваны шэраг асноватворных праблем этнакультурнага, нацыянальна-дзяржаўнага самаакрэслення Беларусі, беларусаў у гісторыі новага і найноўшага часу. Напрыклад — нацыянальная свядомасць, моўна-культурная, канфесійная самаідэнтыфікацыя, дзяржаўнае будаўніцтва, войска, граніцы, дачыненні з суседзямі... Пры ўсёй пакручастасці, сумнай парадаксальнасці беларускай гісторыі — яна, Беларусь, адбылася: у абліччы народа — нацыі — дзяржавы, самабытнай культуры, нацыянальнай годнасці. Пра гэта — і трапная заўвага польскага навукоўцы Пётры Вандыча, згаданая ў артыкуле С. Токаця: як ні дзіўна, аднак беларусы захавалі сваю дзяржаўнасць і не растварыліся сярод моцных суседзяў, падобна правансальцам ці брэтонцам.

Адзначаная кніга будзе каштоўнай крыніцай для даследчыкаў беларускай даўніны. Галоўнае, каб выданне стала даступным хаця б у Нацыянальнай і універсітэцкіх бібліятэках Беларусі. Тым больш, што гэта — першы том з дакляраванай у Торуньскім універсітэце выдавецкай серыі "Беларусь: палітыка—гісторыя—культура".

Кастусь АТРАШЭЎСКІ

Таямніца чысціні

Аляксандр Атрушкевіч — рускамоўны паэт і празаік. Ён нарадзіўся і вырас у Гомелі. Скончыў біялагічны факультэт ГДУ імя Ф. Скарыны. У свой час працаваў токарам, землеўпарадкавальнікам, супрацоўнікам НДІ лясной гаспадаркі. З 1980 года лічыцца ўжо трэнерам. Аляксандр — майстар спорту па альпінізме, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар зборнікаў "Четыре времени трудов", "Роза Азора", кнігі пра гомельскі парк "Дорожками старого парка".

Трэба адзначыць, што Аляксандр Міхайлавіч нядрэнна валодае і беларускай мовай. Яго першыя творы з'явіліся ў "ЛіМе" яшчэ на пачатку 80-х! А потым былі шматлікія публікацыі ў калектыўных зборніках, газеце "Звязда" ды іншых выданнях.

Новая кніжка паэзіі А. Атрушкевіча "Зори ветра" прываблівае філасофскімі развагамі, трапнымі, незашмальцаванымі вобразамі. Асаблівае месца ў зборніку адведзена паэтычным аповедам пра чалавечую існасць, дабрыню, пра наканаваную долю. Вядома ж, гэтыя тэмы ўжо даўно не новыя. Але яны па-ранейшаму патрэбныя, бо сугучныя вірліваму часу. І па-свойму арыгінальныя, запатрабаваныя:

Мы в мир пришли
по воле Бога,
Господь вдохнул нам силы
в грудь,
У каждого — своя дорога,
Короткий или длинный путь...

Аляксандр Атрушкевіч уваходзіць у тую кагорту сціплых пісьменнікаў, якія не імкнуцца да бліскучых, бы новы гузік, вяршынь славы. І да так званай зорнасці. Бо слава, як казалі некалі мудрацы, капрызлівая дзяўчына. Яна чамусьці нагадвае пераменнае надвор'е. Ды й ніколі не бывае вернай спадарожніцай творцы.

Нельга не заўважыць, што аўтар новага выдання па-свойму адметны творца, шчыры і светлы. Аляксандр Міхайлавіч прызнаецца сваім чытачам:

"Трудиться надо, надо жить, лишь так найдёшь успокоение...", *"Как хорошо, когда приносишь радость!"*, *"И счастлив тот, кто осознать сумел, что жизнь сама уже большое счастье..."*

Аляксандр Атрушкевіч амаль пастаянна жыве ў пасёлку Сож, які знаходзіцца ў Гомельскім раёне. Самае дзіўнае, што чалавек, які вырас на гарадскім асфальце, як працавіты сын беларускай зямліцы, па-сапраўднаму палюбіў вясковае прыволле, нялёгкі сялянскі быт і жыццё.

Паэты, як вядома, людзі адметныя і назіральныя. Аляксандр Атрушкевіч таксама адносіцца да ліку тых творцаў, якія здольны заўважыць вось такі цікавы малюнак у прыродзе:

...Среди высоких сосен
выгнулась дорога,
Пахнет лёгкий ветер
прелою листвой.
Грустно и тревожно.
Ведь совсем уж скоро
В двери постучится осень
на постой...

Калі чытаеш гэтыя радкі, міжволі далучаешся да свету дабрыні, прыгажосці, усяго загадкавага і таямнічага, што можна прыкмеціць навокал. І няхай на пэўны момант адбудзецца духоўнае ачышчэнне ад усяго дробязнага, непатрэбнага, чаго так шмат у паўсядзённым жыцці.

Ганна АТРОШЧАНКА

Чароўныя астрагалы, або Беларуская дзіцячая фантастыка

Так хочацца сярод шэрай будзённасці трапіць у Невядомае, Нязведанае, Чароўнае. І найкарацейшы шлях да гэтага – разгарнуць кнігу Саймака, Лема, Стругацкіх, заглыбіцца ў фантастыку, сягаць думкай да зор, думаць пра агульначалавечае, а не пра надзённае.

Прыкладна такія думкі былі ў мяне, калі пачынаў чытаць кнігу "У зеніце — Антарэс: беларуская фантастыка", нядаўна выпушчаную ў свет выдавецтвам "Мастацкая літаратура". Думалася пра беларускую школу фантастыкі, пра новыя маладыя імёны ў спісе беларускіх фантастаў, магчыма ў будучыні — з сусветным імем. А чаму і не?

Але, чытаючы, а зрэдку перачытваючы некаторыя творы, мімаволі лавіў сябе на думцы, што хочацца паглядзець на апошнюю старонку, каб упэўніцца, што там напісана: для чытачоў малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. І нават некалькі разоў паглядзеў. Ніякіх спасылак чамусьці не было.

Напрыканцы кнігі ў анатацыі пазначалася, што творы "рознай жанравай накіраванасці, адлюстроўваюць праблемы і перспектывы духоўнага і навукова-тэхнічнага развіцця чалавецтва"(!).

Але, як кажуць, вашымі б вуснамі, шаноўныя, ды мёд піць. Бо справа ў тым, што ў сваёй большасці апавяданні, якія прадстаўлены ў зборніку, — гэта, па сутнасці, казкі для дзетак ці падлеткаў. Фантастыцы, тым больш навуковай фантастыцы, у гэтым зборніку з гучным падзагалоўкам "беларуская фантастыка" амаль не знайшлося месца.

Увогуле, было такое адчуванне, што чытачы сучаснага беларускага фантастычнага апавядання павінны зноў і зноў апынацца ў XIX стагоддзі, дзесьці там, на возеры Нешчарда, начаваць у хаце шляхціца Завальні і слухаць, як ягоныя госці распавядаюць што-небудзь чароўнае і жахлівае.

Таму, калі лічыць Я. Баршчэўскага першым беларускім фантастам, дык традыцыі, закладзеныя ім, паспяхова працягваюць сучасныя беларускія літаратары. У дадзеным зборніку гэта творы А. Бадака, Л. Рублеўскай, А. Федарэнкі. Найбольш цікавыя і захапляльныя, канечне, апавяданні Л. Рублеўскай з цыкла "Казкі зельніцы Юстыны", якія так і хочацца чытаць яшчэ і яшчэ ды шкадаваць, што ў зборніку іх змешчана ўсяго толькі тры. Але, вядома, залічыць гэтыя творы да жанру фантастыкі досыць складана. Гэта ці казкі (Л. Рублеўская) ці апавяданні з нейкай таямніцай ("Не глядзіце ў снах на поўню" А. Бадака, "Срэбны свечнік" А. Федарэнкі). Пры такім раскладзе да фантастыкі можна залічыць і Ул. Караткевіча з яго "Дзікім паляваннем" або "Чорным замкам Альшанскім".

Астатнія маладыя "фантасты" (у большасці сваёй рускамоўныя) абсалютна не ўражваюць ні праблемамі, ні перспектывамі развіцця чалавецтва. Многія творы павучаюць чытачоў: хлопчыкі і дзяўчынкі, вучыцеся добра і паважайце выкладчыкаў ("Баль монстраў" Маі Батурынай і "Время больших перемен" Аляксандра Сялецкага), не жадайце зла іншаму ("Зёрнышко" Наталлі Дзівінай) і не выкідайце старых цацак ("Плюшевый медвежёнок" Генадзя Ануфрыева), інакш будзе вельмі дрэнна!

Страшна, але не вельмі. Асабліва сучасным падлеткам, якія гадзінамі гуляюцца ў камп'ютэрныя стралялкі, забіваючы за хвіліну дзесяткі монстраў.

Ёсць і фантастычныя апавяданні. Гэта і "Гроза лепидоптеры" Валерыя Кастручына і "Каханне?" Уладзіміра Цвяткова. Але гэтыя апавяданні не падымаюць нейкіх праблем бытавання (а з "Грозы лепидоптеры" можна зноў выводзіць мараль для школьнікаў: не лавіце матылькоў, беражыце прыроду) і такія творы можна назваць фантастыкай дзеля самой фантастыкі, калі тэксты і падзеі ў іх толькі прыпраўлены "фантастычным".

Дашутка ў тэксце Эльвіры Кузняцовай "В зените — Антарес" завецца толькі Дашуткай (а ніколі Дашай), а само апавяданне таксама можа быць аднесена да жанру казкі. І, дарэчы, чаму назвай гэтай казкі пазначаны зборнік? Ці не лепш было б назваць "Чароўныя астрагалы" або "Развітанне з Марсам"? Можа, таму, што апавяданне Э. Кузняцовай самае доўгае?

Выбіваецца з усяго пераліченага шэрага бадай што "Прощание с Марсом" Усевалада Шымава. Аўтар змог прадставіць сваё разуменне падзей, якія адбыліся на Марсе, а таксама (што даволі цікава і прывабна) увёў у твор сучасныя рэаліі беларускай сталіцы. Марсіянін, які раз'язджае на мерседэсе па мінскіх вуліцах, марсіянская мафія, паўстанне машын на планеце і барацьба за выжыванне — усё гэта прыцягвае ўвагу да тэксту У. Шымава.

Аднак у цэлым зборнік "У зеніце — Антарэс" можна назваць зборнікам беларускай дзіцячай фантастыкі. Дзіцячай як па сюжэтах, так і па тых чытачах, якім гэты зборнік адрасаваны. Прыхільнікаў Брэдберы і Шэклі просьба не турбавацца: беларуская фантастыка ў сваёй большасці яшчэ застаецца ў дзіцячым узросце і не пераходзіць мяжы XIX стагоддзя. І дацягнуцца хаця б да Уэлса, да Чапека, да ўзроўню літаратараў-фантастаў пачатку XX стагоддзя будзе досыць складана, як бачна з прадстаўленага выдання, ганарліва заяўленага "беларускай фантастыкай".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Вожыкі ў футбол гуляюць

Яблык, быццам мяч, ганяюць.
Вожык-тата — варатар,
Адаб'е любы удар.

У чарговую кнігу Таццяны Мушынскай "Вожыкі ў футбол гуляюць", выдадзеную нядаўна РВУ "Літаратура і Мастацтва", увайшлі вершы, апавяданні і казкі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Сёння Таццяну Мушынскую можна аднесці да вядомых літаратараў, якія шмат пішуць для дзяцей і пра дзяцей. Яна — аўтар шматлікіх кніг (проза, вершы, балетная крытыка), лаўрэат прэмій рэспубліканскіх часопісаў, уладальнік дыплома ЮНЕСКА "За пашырэнне ведаў пра тэатр Беларусі". Засяроджвае ўвагу ў першую чаргу вокладка выдання "Вожыкі ў футбол гуляюць", афармленая ярка і з густам (мастак Г. Хінка-Янушкевіч). Такую кніжку прачытаеш з цікавасцю седзячы з малымі на канапе, а таксама ў дзіцячым садку, школе.

Вершы лёгка запамінаюцца. Яны скампанаваны ў раздзелы: "Парсючок і ручнічок", "Мех, снег і смех", "Мак таўклі камары", "Гном Том будуе дом". Героі вершаў — птушкі, жывёлы ў сваіх паводзінах вельмі падобныя на нашых дзетак. Паэтка піша павучальныя для іх гісторыі пра тое, што нельга быць упартымі, як бараны, што, б'ючыся на ўзмежку, забываюць пра небяспеку, фанабэрыстымі, як індыкі, сварлівымі, як казёл з казой, запэцканымі, як парсючок... Але вельмі сімпатычныя нам гаспадарлівы мядзведзь, працавітыя мурашы, удзячныя шпакі і многія іншыя героі.

У некаторых вершах валадарыць прырода. Аб гэтым сведчаць назвы: "Завіруха", "Люты", "Кветка-сон", "Кастрычнік", "Ліставей"... . Але зазначу, што галоўнымі героямі многіх твораў Таццяны Мушынскай з'яўляюцца яе дзеці, праз паводзіны якіх назіраеш жыццё падрастаючага пакалення не са слоў, а ўвачавідкі. Апавяданні "Як Дзяніска восені дапамагаў", "Чаму плакалі кніжкі?", "Цяжка быць дарослым", "Як працуе сэрца?", "Якога колеру сон?" спісаныя, як кажуць, з натуры. На маё пытанне, чаму галоўны герой — Дзяніска, ці не працяг гэта "Дзяніскіных апавяданняў", Таццяна шчыра адказала, што старэйшага сына завуць Дзяніс і як жа не зрабіць яго галоўным героем?!

— А Ягорка не пытае, дзе творы пра яго? Чаму ў апавяданні пра кніжкі не Ягорка, а Рыгорка?

На што мама Мушынская адказала:

— Вядома ж, крыўдзіўся, і я паабяцала зрабіць яго героем маіх новых кніжак. А там, дзе распавядаю пра кніжкі, якія не любіў хлопчык, рваў іх, а потым рамантаваў разам з бацькам, то гэта не пра майго Ягорку, бо ён вельмі любіць іх і шануе. Тым не менш, хлопчык з верша "Ласун", вядома ж, Ягорка.

Некалькі слоў пра казкі. Яны вельмі захапляльныя, і будуць з цікавасцю прачытаны. Дзецям ёсць магчымасць пабываць у падарожжах разам з лялькай Зінай, пабыць, як Пецік, у скуры мядзведзя, і, як Віця Неслух, у краіне мурашоў, сустрэцца з інапланецянамі і даведацца пра хлопчыкаў-вітамінчыкаў і пра тое, як яны перамагаюць інфекцыю...

Увогуле, змешчаныя ў кнізе Т. Мушынскай вершы, апавяданні і казкі адлюстроўваюць дзіцячыя гульні, захапленні, пейзажныя замалёўкі розных пор года, карціны лесу, вясковага агарода. Творы прасякнуты радасцю, гумарам, трапнымі назіраннямі. Яе Андрэйкі, Зіны, Юрасікі, Юлі і Віталікі жывуць побач з намі, і сустрэчы з імі будзе рады кожны, хто возьме ў рукі гэту выдатную кніжку.

Заказаць ці набыць кнігу "Вожыкі ў футбол гуляюць" можна ў аддзеле маркетынгу і рэкламнай дзейнасці РВУ "Літаратура і Мастацтва" па адрасе: 220034, Мінск, вул Захарава, 19. Тэл. 2847965, 2982079.

Валянціна СМАНЦАР

Каляндар народнага жыцця

Нядаўна выйшаў з друку адрыўны каляндар на 2009 год *"Родны край"*. Па задуме – гэта своеасаблівая "народная энцыклапедыя". Каляндар заўсёды меў шырокі попыт і вісеў на сцяне ледзь не ў кожнай беларускай хаце. З яго адрыўных лісткоў даведваліся пра ўсё: калі ўстане і зойдзе сонца, як і калі трэба садзіць і сеяць, як сабранае гатаваць і што з чым есці, якімі травамі лячыцца, чым беларусам ганарыцца, і што шанаваць (юбілейныя даты, дзяржаўныя і рэлігійныя святы)...

І вось гадоў колькі як прыпынілася яго выданне. Чаму? Адзін Бог ведае ды яшчэ, можа, які начальнік... Народ жа не ведаў, але голас свой у абарону роднага календара падаў. Чутны і заўважны. І трэба сказаць, што наверсе прыслухаліся — і пасля некалькігадовай паўзы нарэшце выхад календара аднавіўся.

Гожы вонкава, у народных беларускіх традыцыях вытрыманы, на аснове адмысловых узораў выцінанкі, — знешне ён падаецца адным з лепшых варыянтаў за сваю доўгую гісторыю.

Калі пачынаеш яго гартаць, то не пакідае ўражанне, што і ўнутраным зместам выданне павінна працягваць традыцыі сваіх папярэднікаў. Ёсць серыі добрых парадаў, апісання лячэбных траў і некаторых традыцыйных святаў, хоць сур'ёзных тэкстаў па беларускай навуцы і культуры мала. Пераважаюць матэрыялы больш запатрабаваныя сучаснымі прагматычнымі стасункамі жыцця — гэта прыгатаванне розных страў, дапамога дачнікам, батанічныя рэліквіі, крылатая народная мудрасць і, вядома, здароўе...

Пададзена шырокая панарама звестак пра беларускія гарады-райцэнтры.

Шмат месца адведзена міфалогіі, нацыянальным традыцыям і абрадам (да прыкладу, *"чаму нявеста павінна стаяць злева?"*, ды таму што яна па міфалогіі з'яўляецца ўвасабленнем Зла (смерці, левага), а левае — няправільнае, несправядлівае, адмоўнае; мужчыны ж увасабляюць дабро (з усімі сваімі войнамі?!), і значыць, яны, адносна жанчын, правыя). Во так.

Не забытыя і найбольш адметныя даты беларускай гісторыі.

Аднак кожнаму баліць сваё. І мяне, як літаратара, турбавала прысутнасць у календары менавіта гэтага нацыянальнага сімвала беларушчыны — мастацкага слова і яго носьбітаў. І тут давядзецца зрабіць колькі заўваг для будучых складальнікаў календара. Бо гэты перанасычаны юбілеямі заводаў і прадпрыемстваў, а вось юбілеі некаторых знаных дзеячаў культуры і літаратуры пададзены занадта выбарачна, ці мо браліся з якіх застарэлых крыніц інфармацыі. Між іншага змешчаны цікавыя артыкулы пра А. І. Луцкевіча, С. Дарожнага, Е. Лось, В. Маракова, Б. Эпімах-Шыпілу, А. Асіпенку, Л. Калюгу, Я. Мазалькову, М. Лужаніна, М. Лынькова (адзначаны юбілей В. Быкава, але артыкула пра яго чамусьці няма, няўжо не дацягвае сваёй творчай значнасцю да згаданых вышэй?) Пазначаны юбілеі М. Клебановіча, А. Ставера, К. Цвіркі, М. Юдэлевіча, М. Корзуна, паэта В. Гадлеўскага, А. Бялевіча, А. Дзеружынскага, Я. Курто, В. Макарэвіча, С. Лаўшука, В. Бурносава, М. Пархневіча, А. Вольскага, З. Жыткевіча, Л. Левановіча, І. Курбекі, Р. Няхая, Зьніча (А. Бембеля), З. Аксельрода... але чамусьці няма згадкі пра 50-годдзе знакавага паэта А. Сыса...

Магчыма, па задуме складальнікаў, юбілей паэта кампенсуюць артыкулы на алкагольную тэму. Іх цэлая серыя.

Шкада, што хмелю шмат, а самой паэзіі ў календары ўсё-ткі бракуе. Што праўда, змешчана нямала дзіцячых вершаў, але ўсе яны чамусьці аднаго аўтара — У. Мацвеенкі... Няўжо ў Беларусі такі *дэфіцыт* дзіцячых паэтаў? Не сказаў бы. З узораў жа класічнай беларускай паэзіі, апроч верша П. Панчанкі "Родная мова", складальнікі ўвогуле нічога вартага для друку не знайшлі...

Гэтым разам, як мне падалося (не рабілася ж выданне ў спешцы, іначай не выйшла б датэрмінова), складальнікі асабліва не пацелі ў пошуках і выбары матэрыялаў — яны, як самі паведамляюць, карысталіся падшыўкамі газет "Звязда" і "Однако" (?!), а таксама кнігамі ("Беларуская міфалогія" (укл. У. Васілевіч), "Памятники природы Белоруссии" (В. Бельков), "Таямніцы беларускага лесу" (А. Курскоў), "Крынічнае слова" (Р. Шкраба).

Выпуск ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі. Наклад, адносна сённяшняга беларускамоўнага часу, немалы — 7000 асобнікаў.

Агулам, трэба падзякаваць усім, хто спрычыніўся да такога неабходнага (традыцыйнага) беларускага выдання (не ў апошнюю чаргу якраз складальнікам Валянціне Пінчук і Алене Шагун). І разам з імі будзем спадзявацца, што ў наступным годзе мецьмем "Родны край" "без изъянов" і прыгодным для ўсіх выпадкаў нашага жыцця. Але ці магчыма такая ідэальнасць?..

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Міхась ЮЖЫК

* * *

Я правёў колькі год,
нібы ў склепе каменным,
дзе ўсе мары і думкі каналі мае.
Іх сціскалі муры
і душылі нязменна,
не пускалі туды, дзе жыццё паўстае.

Шмат гадоў працякло
ў беспрасветных пакутах,
намаганнях такіх,
калі скура ў крыві.
Прыпадаў да каменя,
напружана слухаў:
ці не стане хто звонку,
не крыкне: “Жыві!”

І калі патухала надзея ў знямозе
ды спынялася сэрца
ад скрухі зусім,
чуў я крокі тады
па знаёмай дарозе,
бачыў зорку над лесам
і вогнішча дым.

У муроў не бывае
герметыкі поўнай,
кожны камень для Вечнасці —
пыл ці пясок.
Толькі душы плывуць
на расквечаным чоўне
супраць плыні — туды,
дзе пачатак дарог.

* * *

Не жартую з табою, слова.
Слова можа забіць падчас.
Напрарочыш сабе такога,
што паплачаш затым не раз.

Гумілёў напрарочыў кулю,
што закончыла яго лёс.
Шмат паэтаў пятлю расчулі
у вышынях сваіх нябёс.

Пастарнак жа цураўся смерці,
абыходзіў яе ў радках.
І таму не трымалі чэрці
лёс паэта ў сваіх руках.

Я любіў палятаць у вершах.
Ды разбіўся... Такі паверх,
што з двухсот выжываю першы
за бяздумны нязмыўны грэх.

* * *

Мы ўспаміны люлялі,
як хворых дзяцей,
і выняньчвалі справы жыццёвыя...
Шлях пралёг праз стагоддзі
нашмат карацей,
тут не скажаш звычайнаю моваю.

Ён стаіць між вякоў,
як тады, так цяпер,
непахісны, не зломлены катамі.
І не выпаўзе самы бязлітасны звер,
калі мы без віны вінаватыя.

Ён вісіць,
і цвікі развярэдзілі плоць,
вочы плавяцца страшнай спякотаю —
катаваны,
асуджаны смерцю Гасподзь
перад стройнай
няўмольнаю ротаю.

Толькі ўраз пацямнелі
нябёсы зямлі,
толькі ўпоцемку нешта азвалася...
Парастаюць травой
тых часоў камяні,
абрастаюць вялікаю маласцю.

* * *

Відзежа кароткая сполахам белым
разрэзала цемрадзь
і знікла ў начы:
ідуць на пагорак шматлікія целы,
і голас адтуль урачысты гучыць.

Той голас — ці песня,
цяпер не згадаю —
азорыў вялікую жальбу зямлі:
Майсеевы людзі
прыстанак шукалі,
блукалі нястомна,
пакуль не знайшлі.

Там ходу было
да зямлі запаветнай
не болей за месяц,
яны ж сорак год
мясілі пяскі сухавейнага ветру —
пакутны, рахманы,
абраны народ.

Памерлі ўсе тыя,
хто помніў Егіпет,
тады абвясціў правадыр:
“За грудом
хай будзе Ізраіль,
жывіце без злыбед!” —
і ціха сканаў
на парозе ў той Дом.

Невядомаму паэту

Срэбрам світальным
іскрыцца раса,
травеньскі дух карагодзіць
пад зелянінай
бухматых прысад.
Светла і ўцешна ў прыродзе.
Ціха ступі
на сцяжынку сваю
і выбрыдай на дарогу.
Я ўжо твой поступ
здаля пазнаю,
пільна ўглядаюся, строга.

Мы не чужыя,
за сотні гадоў
хіба мяняецца сутнасць
рэчаў зямных
і зямных галасоў,
водаў гісторыі мутных?

Станем насупраць,
каб бачыць маглі —
нашы падобныя твары.
Рушаць вакол ачмурэлыя дні,
бліскаюць росныя мары.

* * *

Камень булькне ў раку,
сціхне рэха ў лясах,
кожны след
у прыродзе сатрэцца.
Толькі людзі старанна
ахоўваюць страх
адзінокага чуйнага сэрца.

Што шумела тады,
то цяпер — цішыня,
аджыло, адбуяла, панікла.
Вывучаюць па зрэзе
сівога камля
злой прыроды
маўклівыя цыклы.

Ды не дрэва раскажа,
а словаў навал, —
пераможа стагоддзі
і смерці, —
як самотны Ваяр
на крыжы зарыдаў,
як парвалася чуйнае сэрца.



Ігар СІРОТКІН

* * *

Дзесь на ўзбярэжжы росквітнага лесу,
Між белых ценяў і гарачых траў,
Я аджыву, каб заўтра ўваскрэснуць
У тым, што сёння з лёгкасцю ствараў.

Прыходзь.
Я не знайду твайго пакою,
Згублю нататнік той,
дзе тэлефон,
Каб больш ужо не адчуваць спакою
І бачыць за акном заўсёдны скон.

Каб бачыць там
святочныя прыбранні,
А ў іх сябе – што можа быць цяжэй,
Калі ты ўжо не спаў і бачыў ранне,
Паліў на ветры, крочыў і дрыжэў?

Прыходзь на ўскраек
росквітнага лесу,
Да белых ценяў і гарачых траў,
Каб быць са мной,
а потым уваскрэснуць
У тым, чаго пакуль я не ствараў.

* * *

Я пераходзіў сутарэннем змрочным
І падаў пад бясконцасць
пыльных ног.
Былі далёка неба майго вочы,
Ды на крыжы марнеў крывіцкі Бог.

Я падымаўся на няўлоўны момант,
Каб сваю пляшку дацягнуць да дна
І крок зрабіць,
забыўшыся на стому,
Тым шляхам,
што пакуль нас не з’яднаў.

Ці гэта ўсё?
І гнеў багоў кватэрных
Мой чысты ліст
маланкай спапяліць.
Ды к д’яблу іх. Я застануся верным
Нават тады, калі і не баліць.

Нечарговы рэнесанс

Чароўны свет — ні холаду, ні болю,
Ні кроплі слёз на высахлы абшар.
Даўно заснулі целы на вуголлі,
Ды ў белым полымі
жыве яшчэ душа.

Жахлівы свет —
нясцерпныя хвіліны,
Калі трапляе ў полымя раса.
І позірк незнаёмае дзяўчыны
Звястуе нечарговы рэнесанс.

* * *

Я прагну ачышчэння. Я адзін
Між бляклых сноў
і невыразных твараў.
Ізноў надзею вечар абудзіў,
Што выйсце ёсць
і з сеткі тратуараў.

Калі ў змяркальных далях
стыне шлях,
Мне сіні смутак не дае спачыну,
А ліхтары заззяюць на слупах,
Ды мякка поўня узыдзе за плячыма.

Я прагну вызвалення. І для ўсіх,
Хто сёння волю
безнадзейна страціў,
Пакуль у пушчах вецер не аціх
І смутак не аціх па роднай хаце.

* * *

У сінім змроку дагарыць святло,
Бы дзён мінулых зменлівыя промні.
І мы з табой, быць можа,
тое ўспомнім,
Чаго яшчэ ніколі не было.

У сінім змроку пралунае сказ
Пра новы дзень і недасяжнасць волі.
Я як мага табе адкрыю болей
Таго, што ты не ведаеш пра нас.

І мы ўратуем душ нашых святло
У вечным змроку...
у лагодным змроку.
І будзем мы не так ужо далёка
Ад раніцы, якой і не было.

* * *

А дзень як дзень. І ззяе срэбны дым.
І сон як сон. А позірк прагне высяў.
Убачыў я дарэмных спраў гады,
Убачыў я —
і не зусім здзівіўся —

Збалелы крок і апантаны бег,
І плач працяглы ля майго парога.
А за сцяной —
вясёлы, сыты смех.
Ды ў белых снах трывожная дарога.

І мара жыць. І мара жыць наноў,
Забыўшыся на сум шматпавярховы,
Калі заззяе сонца з туманоў
Ды вырвуцца вятры з глухога схову.

Няма вятроў. І нас не аднясло
Ад берагоў, да духаты сагрэтых.
Нічога больш.
Ёсць толькі пошук слоў
Больш мудрых, чым усе,
што знаў дагэтуль.

* * *

Па сінім поплаве,
у сонечным разліве
Гуляе дзень, гуляе новы дзень,
Каб ты адчуў сябе крыху шчаслівым
Ды рушыў зноў дарогаю надзей.

Па сінім поплаве, у салаўіных далях
Гуляе час, недасканалы час.
І мы даўно, што мелі ўжо раздалі.
Ці толькі поплаў застаецца ў нас?

Па сінім поплаве,
па неўзараным полі
Гуляе цень усіх бяздзейсных дзён.
І нам не трэба цішыні ці волі,
І мы, назад не гледзячы, брыдзём.

Па сінім поплаве,
абрабаваным краі
Гуляю я, недасканалы я.
Усё, што страцій,
пакрысе збіраю,
Ці, можа, проста чую салаўя.

Фота Кастуся Дробава

Смілавіцкія матывы

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ

Абразкі

Багатая бабка

Чалавек, відаць, не выжыў бы, калі б не ўмеў радавацца нават самаму малому, будзённаму.

Ехаў я са Смілавічаў у Мінск. Пасажыры сядзелі моўчкі, заклапочаныя — кожны думаў пра сваё. Шафёр часта прыпыняўся, «падбіраў» кожнага — мужчыну і кабету, старога і малога.

Крэкчучы і вохкаючы, у аўтобус спрабуе залезці бабулька з торбачкай у руках. Да яе схіляецца і дапамагае падняцца на прыступку дзяўчына, якая стаіць ля самага выхаду.

— Дзякуй, дачушка! Дай Бог табе шчасця і добрага мужыка.

Пасажыры скіравалі ўвагу на бабку, а тая дакульгала да кабіны шафёра.

— Дзякуй, сынок, што ўзёў. Я да Карзуноў. Колькі каштуе?

— Тры тысячы.

— На табе пяць тысяч. Здачы не трэба, — гучна на ўвесь салон кажа бабка.

Раздаецца дружны рогат. Рэдка ў наш час такое пачуеш, каб нехта адмаўляўся ад «здачы», нават ад дробязі. А для бабкі з яе жабрацкай пенсіяй і гэта грошы. Усе навастрылі вушы: што будзе далей? У вачах маладога шафёра заскакалі вясёлыя чорцікі:

— Во, шчодрая душа! Багатая бабка! Музейная рэдкасць у наш час.

— А я не шкадую добрым людзям, — на поўным сур'ёзе адказвае бабуля. — Мо таму і Бог дае.

— Колькі ж вам гадоў, мільянерка? — уступаючы месца бабцы, пытае інтэлігентнага выгляду мужчына.

— Ужо за восемдзесят, сынок. Дай Бог і табе дажыць да маіх гадкоў.

Як вецер разганяе хмары, так гэтая сцэнка ажывіла пасажыраў. Да самага Мінска чуўся смех і размовы пра «багатую» бабульку.

Дысцыплінаваны шафёр

Унук мой Сашка, дзе б ні ішоў, куды б ні ехаў, усё штосьці прыдумляе. Сабраліся мы з ім у цэнтр мястэчка: Сашка на маленькім веласіпедзе, я — пешшу.

— Прыпыніся, калі ласка, — раптам просіць Сашка. — Матор сапсаваўся: др-р, др-р. Не заводзіцца. Крыху падумаўшы, дадаў: — Давядзецца на буксір браць.

Прывязаўшы прыхаваны на багажніку для такіх выпадкаў звычайны матузок, падае ягоны канец мне:

— Будзеш, дзед, цягнуць мяне на буксіры.

Я раблю выгляд, што стараюся з усіх сіл. Даязджаем да перакрыжавання дарог. Сашка спыняе мяне:

— Стой, дзед! Бачыш, чырвоны знак на слупе?

— Ну і што?

— Гэта знак «стоп». Тут абавязкова трэба спыніцца. Інакш — аварыя.

Я слухаюся, і мы спыняемся. Сашка круціць галавой ва ўсе бакі. Нарэшце звяртаецца да мяне:

— Машын няма. Можна ехаць.

Едзем далей. Прыпякае сонца. Вельмі хочацца піць! Пад'язджаем да піўнога ларка. Вакол поўна мужчын. Убачыўшы нас, мой знаёмы рагоча:

— Прапусціце без чаргі дзеда-цягача!

Чарга расступаецца. У куфаль прадаўшчыца налівае халодны бурштынавы напой.

Сашка таксама любіць піва. Толькі бацькі яму не дазваляюць. Я не такі строгі.

— Зробіш глыток?

— Не, дзед, нельга, — са шкадаваннем круціць галавой малы. — Я за рулём!

Ужо не толькі мой знаёмы, а ўся чарга смяецца. Нехта, відаць, шафёр, кажа:

— Вучыцеся! Калі б усе шафёры былі такія дысцыплінаваныя, не было б аварый.

Раўнівы трус

Дзіву даешся часам, назіраючы за жыццём і паводзінамі «братоў нашых меншых». Як жа нагадваюць яны нашы, чалавечыя ўзаемаадносіны!..

У Халадзінскіх, у Смілавічах, на падворку гадаваліся трусы. У адной з клетак сядзела пара буйных шэрых, якія любілі пастаянна што-небудзь жаваць. Трус зваўся Яшка і адрозніваўся ад астатніх памяркоўнасцю нораву.

Аднак ішоў час, а трусіха, якая знаходзілася з ім, не давала патомства. І тады гаспадар пасадзіў яе ў клетку насупраць да белага труса з чырвонымі, як дзве журавіны, вачыма.

Спачатку ўсё было спакойна. Але вось гаспадар клеткі пачаў «сватацца» да шэрай суседкі, абходжваць яе. І што тут пачалося! У клетцы насупраць пачуўся пранізлівы віск. Гэта вішчаў Яшка, у якога адабралі сяброўку. Ён кідаўся на пруты клеткі, спрабуючы зламаць іх, але нічога не атрымлівалася. І тады Яшка пачаў іх грызці.

Самка, відаць, спалохалася бурнай рэакцыі Яшкі і пачала адбівацца ад суседа-кавалера. Белы трус адступіў, але праз некаторы час, не зважаючы на бурныя пратэсты і віск Яшкі, як самаўпэўнены, нахрапісты хуліган, зноў пачаў дамагацца ўвагі шэрай суседкі.

А Яшка як звар'яцеў. Ён гатовы быў перавярнуць увесь белы свет. Гэта так напалохала трусіху, што яна з усіх сіл стала адбівацца заднімі лапамі ад чырванавокага кавалера.

Гаспадар падворка падумаў: «Хто ведае, можа, для якой-небудзь звышцывілізацыі мы таксама паддоследныя трусы?..»

Назаўтра Аляксандр Іванавіч вымушаны быў перасадзіць назад шэрую трусіху. Але Яшка вельмі пакрыўдзіўся за ўчарашні дзень. Ён, як той раўнівы муж, вырашыў пакараць «вінаватую»: зубамі рваў яе поўсць, кусаў, працягваў вішчаць, біў лапамі. І, як бы разумеючы, што лепш сцярпець, трусіха ціха пераносіла пакаранні, забіўшыся ў куток. Злосць Яшкі прайшла толькі на наступны дзень.

Хто каго лавіў?

Рэчка Волма, ля якой я вырас, гадоў сорак таму была багатая на рыбу і ракаў, пакуль яе не стала душыць рука «цара прыроды» — чалавека. Ваколіцы Убеля — непадалёк ад Смілавіч, адно з нешматлікіх месцаў, дзе на гэту рэчку не наклаў ён сваю драпежную лапу. Меліяратары не паспелі яшчэ згламіць гэты маляўнічы куток — ці то таму, што тут радзіма нашага славутага земляка Станіслава Манюшкі, ці па іншай якой прычыне. І рыба тут яшчэ ёсць. Вось некалі лавілі яе мой стрыечны брат Саша Мікуліч і ягоны сябар.

Яны ўважліва глядзелі на паплаўкі і ціхенька, каб не палохаць рыбу, разважалі аб тым, што, можа, вось так, як і яны, паўтара стагоддзя таму, сядзеў з вудаю славуты кампазітар Станіслаў Манюшка, і якраз у такія хвіліны ў яго галаве нараджаліся цудоўныя мелодыі.

Непадалёк сядзеў і Валодзя, які напярэдадні добра прыклаўся да чаркі. Рыба бралася вельмі дрэнна, напэўна, ад храпу хлопца, які бачыў сёмы сон, але вуду з рук не выпускаў. Тут пад'ехаў на лодцы яшчэ адзін смілаўчанін Алег. Ён спытаў у хлопцаў, дзе можна ўпаляваць рыбу, каб не перашкаджаць рыбакам. Хлопцы паказалі ўбок Валодзі: ён усё роўна не хутка прачнецца...

Алег хуценька абуў ласты, узяў у рукі ружжо для падводнага палявання і нырнуў у раку, калі апусціўся на глыбіню, пачаў прабірацца сярод рачной травы, зараснікі якой нагадвалі джунглі. На вочы трапляла розная драбяза, страляць у якую не было сэнсу. Раптам метраў за пяць наперадзе злева Алег убачыў бервяно: падумаў, што гэта тапляк, які парос мохам. Але тут «бервяно» варухнулася.

«Сом!» — не паверыў сваім вачам падводны паляўнічы. Ціхенька, каб не спудзіць вялізную рыбіну, ён павярнуўся ў той бок і прыцэліўся. Сом адчуў небяспеку і рвануў з месца, але страла паспела ўваткнуцца ў яго бок. Пад вадой разыгралася бура: рыбіна спрабавала вырвацца, яна круцілася ў вадзе, з неверагоднай сілай цягаючы за сабой паляўнічага.

А ў гэты час на паверхні ракі адбываўся іншы «спектакль».

Ганяючыся за здабычай, Алег заблытаўся ў лёсцы Валодзі, а той, хоць і не зусім працверазеў, схапіўся за вуду, якая імкліва знікала ў вадзе ўслед за лёскай. Сон як рукой зняло. Ён зразумеў, што на кручок трапіла нешта значнае.

— Хлопцы! На дапамогу! — закрычаў ён і пачаў з усяе моцы цягнуць да берага тое, што трапіла на кручок. А хлопцы здагадаліся, што за лёску Валодзі зачапіўся Алег, аднак ім нават у галаву не магла прыйсці думка, што ў таго, у сваю чаргу, на страле знаходзіцца вялізны сом. Таму рыбакі паваліліся на зямлю ад рогату, гледзячы на выкрунтасы свайго няўдалага сябра, які яшчэ не ачухаўся ад учарашняй выпіўкі і не мог зразумець, у чым справа.

Але тут на нейкі момант вынырнуў Алег, і стала зразумела, што адбылося не зусім так, як спачатку здавалася. У ваду кінуўся сын Алега, потым яшчэ некалькі рыбакоў, і пачалі ныраць углыб — варта сказаць, што ў Смілавічах нядрэнныя плыўцы... Пачалася сумесная пагоня за сомам. Можа, і ўдалося б яму сарвацца са стралы, але ён пачаў страчваць сілы, і агульнымі намаганнямі рыбакам удалося выцягнуць сома на бераг.

— Вось дык парсюк! — ускрыкнуў Валодзя. І сапраўды, сом нагадваў кормніка. Такога ўлову яшчэ ніхто з іх не меў. Сом, якому, напэўна, было з паўстагоддзя, а мо і больш, важыў амаль два пуды.

Узрушэнне

Пасля застолля з сябрамі я прыйшоў дадому і лёг спаць раней звычайнага. Праз колькі часу з'явілася дачка і апусціла да мяне на ложак унука:

— На, дзед, бяры свайго лепшага сябрука.

Сашка быў яшчэ зусім маленькі і поўзаў, як сабачаня, на карачках. Я вельмі любіў забаўляцца з ім. Раніцай нёс у ванну купаць. Унук не капрызіў, маўчаў. Яго светла-карыя вочкі з даверам пазіралі на мяне. Я асцярожна клаў яго на далонь, падстаўляў пад дожджык. Калі не было цёплай вады, Сашка ўздрыгваў, але цярпеў. Потым я захутваў яго ў вялізны махровы ручнік. «Пацярпі крышачку, — казаў я малому, — зараз адкрыем твой тварык». На кухні, у конаўцы з доўгай ручкай я размешваў «Малютку», пераліваў у бутэлечку з соскай і ішоў у спальню. Як толькі падыходзіў да ложка, Сашка з нецярпеннем адкрываў роцік і пачынаў, пасапваючы, смактаць з бутэлечкі малочную сумесь. Наеўшыся, ён адразу ж засынаў. Калі ўнук прачынаўся, я рабіў яму «пацягушачкі». Сашка напружыньваўся ўвесь, ад асалоды выпучваў жывоцік...

Дачка пайшла. А Сашка з радасным крыкам папоўз да мяне. У думках я ўжо лашчыў яго, гладзіў галоўку. Але... Унук прапоўз крыху і раптам спыніўся. Як заплача і — назад, хуценька-хуценька. Дапоўз да краю ложка і спыніўся. Павярнуўся і здзіўлена пазірае на мяне, не разумеючы, што адштурхоўвае яго ад дзеда. Зноў хуценька паўзе да мяне. Тварык яго — сама радасць. Зноў спыняецца. Не можа ўсвядоміць, што адбываецца, чаму нейкая варожая сіла адштурхоўвае яго. Урэшце — заплакаў. «Што здарылася? Што напалохала яго? Чаму малы так здзіўлена глядзіць на мяне?» — пранесліся думкі. Праз імгненне здагадаўся. Пах...

Пах гарэлкі пасля застолля аддаліў ад мяне ўнука. Я дакараў сябе: як мог гэтым пітвом пакрыўдзіць самага бяскрыўднага, самага добрага, самага ласкавага чалавечка?!

Гэта было ўзрушэнне для нас абодвух: унука, які не мог наблізіцца да свайго дзеда з-за паху гарэлкі, а для мяне — з-за таго, што адбылося гэта па маёй віне. Пасля таго выпадку я доўга не браў у рот ніякага спіртнога, нават піва.

Дапамог...

Пяцігадовы Пеця добра засвоіў: у вёсцы — свята, калі колюць парсюка. Праз сон ён чуе, як рыхтуюцца да гэтай важнай падзеі: маці налівае ваду ў вялікія чыгуны і ставіць у печ, у якой весела патрэскваюць дровы, бацька запраўляе бензінам паяльную лямпу, а дзядзька Павел, матчын брат, старанна вострыць напільнікам швайку. Хлопчык хоча падняцца, каб дапамагчы дарослым, але салодкі сон моцна трымае ў пасцелі.

Праз нейкі час пад паветкай чуецца віск Таўкача, іх белага парсюка, на якім употай ад маці любіў пагарцаваць хлопчык. Пеця куляй кідаецца з канапы: сон як карова языком злізала. Хуценька, па-салдацку, нацягвае кашулю, штонікі, боцікі і выбягае ў двор. Таўкач ляжыць уверх пузам, а над ім завіхаюцца бацька, дзядзька Павел і дзядзька Сцёпа, іх сусед. Бацька распальвае паяльную лямпу, падкачвае. Тая то шыпіць, то гудзе сінім полымем. Пеця кідаецца на веранду, бярэ са стала нож, каб дапамагчы скрэбці парсюка.

— Ты куды так рана падняўся, зайка? — пытае маці. — Спі яшчэ.

— Я буду дапамагаць парсюка разбіраць, — адказвае Пеця.

— Зноў боцікі не на тыя ножкі надзеў, — пяшчотна гладзіць па галоўцы сына маці. — Садзіся, будзем пераабувацца. Э-э-э, ды не, аказваецца, і шкарпэткі не нацягнуў, — здымаючы боцікі, дакарае маці. — Хіба ж так можна зімой выходзіць на вуліцу?

Пецю карціць хутчэй выскачыць з хаты, а тут гэтыя пераапрананні, пераабуванні...

Нарэшце хлопчык зноў у двары. Бацька смаліць парсюка, а дзядзька Павел і дзядзька Сцёпа — скрабуць.

— Вось і галоўны памочнік прыйшоў, — у вачах дзядзькі Паўла скачуць вясёлыя іскрынкі. — Ну, скрабі, скрабі свайго Таўкача!

На сярдзітую заўвагу бацькі весела адказвае:

— Нельга забараняць чалавеку займацца грамадска-карыснай працай.

Гэтак жа, як і дзядзька Павел, Пеця размахвае сюды-туды нажом, і смаленая поўсць ляціць. Але дзядзька чамусьці хутка забірае нож:

— Ты, Пеця, адпачні. Замарыўся, бачу, парэзы атрымліваюцца.

Потым мылі парсюка кіпенем, зноў скрэблі. Скура атрымалася жоўценькая-жоўценькая...

Праз нейкі час маці ўжо смажыла на патэльні свежаніну, пякла пячонку. Па хаце паплыў смачны пах. Памыўшы рукі, усе садзяцца за стол, падымаюць чаркі. Маці кажа:

— Парсюк нядрэнны, дай Бог і на наступны год такога Таўкача закалоць. Вось толькі мяса, на жаль, мала, не будзе з чаго каўбасы рабіць.

«Во, дапамагу дарослым, — вырашыў Пеця. — Там жа столькі мяса!»

Схапіў на верандзе нож і пабег пад паветку, да місак са свежанінай. Там ён папрацаваў на славу. Нялёгка было маленькімі ручкамі зразаць мяса з рабрын і хрыбетніка. Пыхцеў, пот каціўся градам, але Пеця не адступаў, стараўся...

За чаркай і скваркай ніхто з дарослых і не заўважыў, куды падзеўся хлопчык. Ды вось адчыняюцца дзверы, а на парозе — шчаслівы Пеця. У руках трымае вялікую місу з мясам. Радасныя вочкі, здаецца, крычаць: «Хто сказаў, што мяса няма? Бачыце, колькі я прынёс!»

Маці ледзь не абамлела. А мужчыны аж трэсліся ад дружнага рогату. Дзіва што! Рабрыны і хрыбетнік, якія маці пакідала на суп, Пеця абрэзаў да белых касцей...

Лясёнка

Ніна, маладая медсястра, прыехаўшы з Гомельшчыны ў Смілавічы, выйшла замуж за мясцовага інжынера-будаўніка.

Аднойчы прывезлі сена і пачалі разгружаць з воза. Свякруха і кажа:

— Ніна, схадзі ў хлеў, прынясі лясёнку.

«Чаму яны завуць лесвіцу лясёнкай?» — падумала паслухмяная нявестка. Пайшла ў хлеў, насілу падняла лесвіцу і, хістаючыся, пацягнула ў двор.

— Ты куды гэта, Ніна, цягнеш лесвіцу? — са здзіўленнем пытае муж.

— Лясёнку нясу... Як маці загадала, — разгублена адказвае маладая жонка.

Раздаўся дружны рогат. Смяялася і Ніна. Адкуль ёй было ведаць, што ў Смілавічах так завуць посцілку, у якой носяць сена?

Арт-пацеркі

У разгары XXXV Міжнародны фестываль мастацтваў "Беларуская музычная восень", шчодрая на падзеі ды багатая на ўражанні. Яе афіша прываблівае музычнымі прэм'ерамі беларускіх калектываў, імёнамі замежных гасцей, юбілейнымі вечарынамі. 26 кастрычніка ў Вялікай зале сталічнай філармоніі такая вечарына ладкавалася ў гонар папулярнай спявачкі, заслужанай артысткі краіны Надзеі Мікуліч. Бенефісам яшчэ аднаго адметнага майстра сцэны, Алеся Кашперава, можна лічыць прэм'еру спектакля "Красёнцы жыцця" паводле "Новай зямлі" Якуба Коласа. Гэтая новая работа Беларускага паэтычнага тэатра аднаго акцёра "Зьніч" (аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык — Галіна Дзягілева) будзе паказана ў бліжэйшы панядзелак таксама на галоўнай філарманічнай сцэне. Цікава, што прэм'ера прыпадае на 126-ы дзень нараджэння Якуба Коласа, які, дарэчы, напісаў сваю неўміручую "энцыклапедыю беларускага сялянскага жыцця" 75 гадоў таму. А 12 лістапада праграмай "Нам — 20" адзначыць свой юбілей Дзяржаўны камерны хор Беларусі.

Казкі, у тым ліку й музычныя, паказвае на працягу кастрычніка сваім юным гледачам Беларускі тэатр "Лялька", што ў Віцебску. Сярод іх ёсць зусім свежая прэм'ера: "Сонейка і снежныя чалавечкі". З'яўленне ў рэпертуары гэтай аднаактовай зімовай казкі А. Весялова — нібы напамін пра тое, што не так ужо шмат часу засталося да зімы з яе чарадзейнымі святамі.

Творчы вечар французскага кампазітара Эрыка Важлана адбудзецца 4 лістапада падчас фестывалю "Беларуская музычная восень". У Малой зале сталічнай філармоніі прагучаць яго камерна-інструментальныя творы (у тым ліку тры п'есы для віяланчэлі і фартэпіяна "Парыж, Берлін, Мінск"), а таксама Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам. Выканаўцы — беларускія музыканты.

Польскаму джазмену Пётру Вайтасіку было 30, калі аўтарытэтны часопіс "Jazz Forum" на падставе праведзенага рэйтынгу назваў дыск музыканта "Lonely Town" альбомам 1994 года. Гэтаму трубачу-віртуозу давялося супрацоўнічаць з лепшымі джазавымі інструменталістамі Польшчы, са знанымі

амерыканскімі музыкантамі, таксама арганізаваць сваю джазавую групу. А яшчэ ён чытае лекцыі ў Інстытуце джаза пры Акадэміі музыкі ў Катавіцах. Не так даўно Пётр Вайтасік упершыню наведаў нашу краіну. У Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся канцэрт яго квартэта, наладжаны пры падтрымцы Польскага інстытута ("IP") у Мінску. Дарэчы, "IP" спрыяе знаёмству нашай публікі з джазавым мастацтвам суседзяў: згадайма, напрыклад, выступленні высакакласных піяністаў Лешака Можджара, Владака Паўліка... Польскія джазмены заўсёды ўражваюць музычнай эрудыцыяй, бліскучым тэхнічным майстэрствам, яркасцю творчай індывідуальнасці.

С. ВЕТКА

Зрабіць беларускі оперны калектыў адным з найлепшых у свеце, а нашу публіку — багацейшай духоўна, душэўна, інтэлектуальна... Пра гэта марыць малады саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Беларусі Станіслаў Трыфанаў.

Каб наша сцэна была прэстыжнай

Заключная сцэна спектакля "Яўгеній Анегін" у выкананні таленавітых оперных артыстаў Настассі Масквіной (Таццяна) і Станіслава Трыфанава (Анегін) не магла не краснуць сэрцы гледачоў і слухачоў. Публіка адчувала перажыванні, адчай, усхваляванасць галоўных герояў. Звярнула на сябе ўвагу пачуццё партнёрства, узаемаразуменне выканаўцаў.

— Мне было вельмі прыемна выступаць са Станіславам, — прызналася Настасся Масквіна. — Ён цудоўны партнёр, добра разумее, адчувае вобраз маёй гераіні, дапамагае ў раскрыцці такіх яе рысаў, як сціпласць, шчырасць. І ў той жа час ён паказаў, як зараджаецца моцнае пачуццё ў Анегіна; адчуваеш адзіноту яго героя, смутак, горкую няўпэўненасць.

У оперы "Травіята" ён зусім іншы: эгаістычны, самаўлюбёны арыстакрат і любячы бацька сямейства — Жорж Жэрмон. А голас спевака гучыць з такой пераканаўчай інтанацыяй, ярка, прыгожа.

Няпроста склаўся яго музычны лёс. Станіслаў Трыфанаў нарадзіўся ў расійскім Табольску. Але ўжо ў гадавалым узросце разам з бацькамі і старэйшым братам пераехаў у беларускі горад Гродна. Яго маці і бацька па прафесіі дырыжоры: Уладзімір Георгіевіч кіраваў аркестрам народных інструментаў, Алена Аляксандраўна — харавік. Музыцы прысвяцілі сваё жыццё і старэйшы брат Станіслава Андрэй, прафесійны піяніст, у якога раптам выявіўся выдатны оперны бас-барытон.

Станіслаў, скончыўшы 10 класаў, працаваў на заводзе карданных валаў і нават не думаў, што будзе займацца музыкай. Але паступова хлопец захапіўся спевамі ў хоры кафедральнага сабора. І калі старэйшы брат прыязджаў дахаты з Мінска, абодва Трыфанавы разам с захапленнем выконвалі ў тым царкоўным хоры творы А. Архангельскага, Д. Бартнянскага, П. Часнакова.

Урэшце Андрэй парэкамендаваў брату звярнуцца да вядомага педагога па вакале Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі — Адама Мурзіча. Той паслухаў маладога пеўчага з Гродна і сказаў: "Прыязджай паступаць".

— Лічу Адама Асманавіча адным з лепшых педагогаў па вакале, і са мною ён займаўся сур'ёзна, карпатліва, — кажа Трыфанаў.

Складана было перавучыць юнака пасля спеваў у царкоўным хоры. Але ж перамаглі цярплівасць і праца! У А. Мурзіча Станіслаў працягваў займацца, калі паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. А потым ён стаў студэнтам Адэскай кансерваторыі па класе опернага спевака Васіля Наўроцкага.

— Мне пашанцавала: падмурак, галоўны напрамак у мяне быў закладзены Адамам Асманавічам, — працягвае Станіслаў. — І я рэгулярна прыязджаў да яго ў Мінск, браў урокі.

Першы поспех да С. Трыфанава прыйшоў на Міжнародным конкурсе ў Карлавых Варах — ён стаў лаўрэатам другой прэміі і быў запрошаны ў Пражскую оперу на выкананне партыі Анегіна. Дарэчы, гэта была яго першая партыя. З часам спявак стаў лаўрэатам пяці міжнародных конкурсаў. Першыя прэміі атрымаў на Міжнародным конкурсе імя Мікалая Лысенкі ў Кіеве, на Міжнародным конкурсе імя вядомай спявачкі Лючыі Поп (Славакія). Паспяхова выступіў на конкурсе камернай музыкі "Бурштынавы салавей" у Калінінградзе, натхнёна выканаўшы творы М. Глінкі, Д. Шастаковіча, Г. Малера.

Яшчэ студэнтам-пяцікурснікам ён стаў салістам Адэскага опернага тэатра, паспяхова дэбютаваўшы ў партыі Яўгенія Анегіна з аднайменнай оперы П. Чайкоўскага.

І вось Станіслаў Трыфанаў — у Мінску. Заваражыў сэрцы амататараў опернага жанру, ствараючы вобразы таго ж Анегіна, Жэрмона, Скарпіа з оперы Д. Пучыні "Тоска" — адна з улюбёных партый артыста. Гэта ўсемагутны шэф тайнай паліцыі. Колькі каварства ў яго ўчынках, колькі трагічных супярэчнасцей у пачуццях і планах! Артыст, зачараваны музыкай Д. Пучыні, яе эмацыйнасцю, драматызмам, стварае пераканаўчы вобраз Скарпіа.

А яго граф Дзі Луна з оперы Д. Вердзі "Трубадур"! Гэта "злы геній", закаханы ў донью Леанору, стаў забойцам роднага брата. Артыст імкнецца раскрыць псіхалогію свайго персанажа.

У мінулым сезоне ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі адбылося канцэртнае выкананне "Барыса Гадунова" М. Мусаргскага. Станіслаў Трыфанаў паспяхова справіўся са складанай партыяй Барыса, тонка перадаў перажыванні героя, смутак у яго душы. І публіка прыняла яго такім — у пакутах і пакаянні. Праўда, настаўнік спевака А. Мурзіч заўважыў: "На мой погляд, гэта пакуль не яго партыя". І хаця ўражанне слухачоў было аднадушна іншае, пра што сведчыў цёплы прыём, заслужаная авацыя, — трэба ж зразумець педагога. Ён хвалюецца за голас вучня, мяркуе, што такога маладога спевака трэба "трымаць" на лірыка-драматычных партыях.

А Станіслаў працуе з натхненнем. Падрыхтаваў складаную і цікавую партыю Набука ў аднайменнай оперы Д. Вердзі. Імкнецца выканаць партыю Гразнога ў "Царскай нявесце" М. Рымскага-Корсакава, паўдзельнічаць у прэм'еры оперы Д. Вердзі "Макбет".

— Мне цікава працаваць з вельмі таленавітым дырыжорам Віктарам Пласкіным. Наогул хочацца, каб выступаць у нашым оперным было прэстыжна, — разважае С. Трыфанаў. — Вядома ж, мы не можам саперні чаць з тэатрамі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, але ўсё ж... Вельмі прыемна, што ў нашым тэатры цудоўны аркестр, хор, моцны склад канцэртмайстраў, нямала прыгожых спевакоў.

Усе мы чакаем адкрыцця абноўленага будынка тэатра. Хочацца, каб усе, хто працуе ў нашым калектыве, атрымлівалі больш важкую падтрымку дзяржавы. Вядома ж, якасць каштуе грошай. Гэта датычыць усіх творчых работнікаў — і пастаноўшчыка, і дырыжора, і выканаўцаў. За талент, за добрае выкананне — заслужаная, дастойная плата! Тым больш, што ў Беларусі — адзіны оперны тэатр! Мастацтву патрэбна сур'ёзная падтрымка. А мы, у сваю чаргу, пастараемся зрабіць свой тэатр найлепшым, а людзей, якія сюды прыходзяць — духоўна багацейшымі, дабрэйшымі, прыгажэйшымі душэўна, інтэлектуальна.

Вера КРОЗ

На здымках: Станіслаў Трыфанаў у спектаклях "Севільскі цырульнік" і "Чыо-чыо сан".

Проста... гучыць музыка

Музыка, нібы касмічная матэрыя, — вялікая таямніца. Яна здатна ўмомант супакоіць сэрца, напоўніць жыццё сэнсам, падарыць цяпло сонца нават у самы халодны дзень. І гэта так натуральна і так неабходна ў наш мітуслівы час. Навукоўцы сцвярджаюць: прыгажосці і гармоніі асабліва хочацца ўвосень, калі засынае прырода і гэта ўплывае на нас... Можа, тут ёсць рацыя. Тым больш, што менавіта восенню, першага кастрычніка, па ўсім свеце адзначаюць Міжнародны дзень музыкі.

Вялікай музычнай праграмай адкрыла 41-ы канцэртны сезон Гомельская абласная філармонія. І гэта не звычайнае акадэмічнае мерапрыемства. Упершыню артысты і мастацкія калектывы выступілі ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра, стварыўшы з ім адзіны жывы арганізм. Паводле слоў мастацкага кіраўніка філармоніі А. Курцянок, стрыжань канцэрта — музыка знакамітая, папулярная, прыгожая; прыемна, што артысты пастаянна знаходзяцца ў творчым пошуку, гэта спрыяе абнаўленню рэпертуару, узнікненню новых ідэй. Такія розныя напрамкі і жанры: музычная класіка, эстрада, джаз. Але ж гэтыя словы не могуць перадаць усяго хвалявання, узрушанасці і любові, што напаўняюць вялікае сэрца артыста.

Пачынае канцэрт твор выключны, надзіва адухоўлены: хор "Алілуя!" з араторыі Г. Ф. Гендэля "Месія". Выконваюць лаўрэат міжнародных конкурсаў Камерны хор пад кіраўніцтвам А. Сакаловай і Канцэртны аркестр Гомельскай абласной філармоніі, мастацкі кіраўнік — С. Шныр. Гэта зварот да кожнага чалавека і чалавецтва ўвогуле. Здаецца, гукі, як маленькія матылькі, зрываюцца са струнаў і ляцяць у Сусвет, напаўняюць прастору святлом і святам. І разумееш тады, што жыў, мабыць, не так, і толькі цяпер табе даецца шанц дакрануцца да нечага нябачнага, недатыкальнага ў звычайных умовах.

У мастацкай тканіне праграмы — сусветна вядомыя творы: "Panis Angelicus" Ц. Франка, "Хабанера" з оперы Ж. Бізэ "Кармэн", салістка — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Г. Паўлянок. Выступаюць салістка "Новай венскай оперы" В. Гройс, лаўрэат рэспубліканскіх, усерасійскіх і міжнародных конкурсаў ансамбль народных інструментаў "Ліры ца", салістка філармоніі Т. Томсан (скрыпка), лаўрэат Маскоўскага адкрытага конкурсу "Романсиада без границ 2008" А. Дудко, Канцэртны аркестр.

Маладое пакаленне артыстаў філармоніі прадстаўляюць лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў Д. Міроненка, К. Трышына, А. Коласаў, лаўрэат міжнародных конкурсаў С. Якуш, інструментальны дуэт "Swey" — Я. Чумакова і Ю. Кулік. Выступленні адметныя індывідуальнасцю і пластыкай пачуццяў, тонкасцю, чуйнасцю маладосці.

Вядучы канцэрта В. Юрлоў заўважае: "Я яшчэ раз пераканаўся: у нашых слухачоў — бясконцая прага духоўнасці. Музыка аб'ядноўвае! Музыка ўзвышае!"

Увесь вечар на сцэне шчыраваў канцэртны аркестр Гомельскай абласной філармоніі, заснаваны заслужаным артыстам Беларусі Ю. Васілеўскім. Выдатны музыкант выхаваў не адно пакаленне таленавітых эстрадных выканаўцаў. Сёння калектывам кіруе яго пераемнік і вучань С. Шныр. Выбар фінальнай музычнай кампазіцыі ўражвае. Гэта лірычны твор "Мая Беларусь" — пераможца конкурсу патрыятычнай песні, які праводзіцца каналам АНТ. Аўтар твора С. Якуш саліраваў шчыра і эмацыянальна.

...Па сценах канцэртнай залы бягуць каляровыя кветкі, зорачкі, промні... Здаецца, восеньскае паветра становіцца цяплей, і знікае шэрая будзённасць. Гэта не цуд. Проста гучыць Музыка.

Яніна ЧАРПУХІНА-АНДРЭЕВА
г. Гомель

Тэст на чалавечнасць

Замест каментарыя да факта, які пакінуў межы закуліснага жыцця і пачаў абрастаць чуткамі...

Пра гэта ведаюць, здаецца, ужо ўсе: у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы здарылася тое, што, мякка кажучы, не ўпісваецца ў звыклы і шматабліч-ны працэс калектыўнай мастацкай творчасці.

Аналагічныя выпадкі бываюць, на жаль, у гісторыі кожнага прафесійнага тэатра. Прытым самыя далікатныя староннія спробы "разабрацца ў сітуацыі" нагадваюць намаганні абывацеля, які мкнецца зазірнуць у чужое акно, захінутае фіранкамі, каб, угледзеўшы нешта, паразважаць потым наконт стану спраў і маральнага мікраклімату ў гэтай кватэры. Хаця дзяржаўны тэатр, канечне ж, не прыватная кватэра, і журналіст — не чалавек з вуліцы, асоба афіцыйная, якая кіруецца лепшымі намерамі ды імкнецца да аб'ектыўнасці. І ўсё ж...

Тэатр — гэта эмоцыі. А эмоцыі заўсёды суб'ектыўныя, розныя, нават у акалічнасцях, агульных для ўсіх. Аб'ектыўным паводле сваёй сутнасці бывае толькі абсалютны розум, але ён — па-над намі. Дык ці магчыма ў прынцыпе, з любові да мастацтва, аб'ектыўна разважаць пра сумнавядомую восеньскую старонку найноўшай гісторыі легендарнай купалаўскай сцэны?

Паспрабуем узнавіць канву падзей. Актрыса гэтага тэатра А. Іваннікава звярнулася да Кіраўніка дзяржавы з адкрытым лістом, цытаты з якога зрабіліся спажывай для чытачоў самых масавых выданняў, для заўсёднікаў Інтэрнэта: "Ніводнага акцёра нашай трупы не задавальняе няўцямная палітыка кіраўніцтва тэатра... Гіне першая сцэна Беларусі, гіне яе трупа... А міністэрству культуры падабаюцца нашы дасягненні..." і да т.п. Некалькіх акцёраў выклікалі для гутаркі ў Адміністрацыю Прэзідэнта. У тэатры ж адбыўся сход, на якім артысты рэзка выказваліся пра рэпертуарную палітыку, пра ўнутрытэатральную атмасферу, пра свае побытавыя, жыллёвыя праблемы. Размова мела працяг падчас планавага адзінага інфармацыйнага дня ў купалаўцаў, праведзенага міністрам культуры Беларусі У. Матвейчуком. У СМІ з'явіліся таксама інтэрв'ю і проста спасылкі на словы генеральнага дырэктара тэатра, народнага артыста Беларусі М. Кірычэнкі: ён прызнаў існаванне праблем, найперш матэрыяльнага кшталту, і неабходнасць шукаць супольнае рашэнне, якое адвяло б калектыў ад крызісу...

Ды што б там ні было, адказнасць за творчы стан тэатра заўсёды ўскладаецца на яго мастацкага кіраўніка. Як жа ўспрыняў надзвычайнае здарэнне Валерый Раеўскі, народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік з 35-гадовым стажам? Ці было яно нечаканасцю для кампетэнтнага рэжысёра і педагога, які прафесійна ведае прыроду тэатральнага арганізма, тонкую і парадаксальную псіхалогію акцёраў, логіку характараў, здатны адчуваць і тлумачыць матывы чалавечых учынкаў?

Валерый Мікалаевіч пагадзіўся адказаць на гэтыя ды іншыя пытанні карэспандэнта "ЛіМа". У размове таксама ўдзельнічаў кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі тэатра Вадзім Дапкюнас. Вось іх падагульненыя меркаванні.

Валерый Раеўскі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:

— Я наогул супраць гучных сварак, якія здараюцца сярод людзей мастацтва. Няўжо нікога не навучыла шматпакутная, скажам, даваенная савецкая гісторыя, калі на вялікіх тэатральных сходах усчыналіся публічныя "разбіральніцтвы", камусьці затыкалі рот, на кагосьці ставілі кляймо ворага і ўрэшце ўсё гэта скончвалася кепска для самога тэатра? Усялякае "ўздыбванне" нервовай сістэмы не вядзе да асэнсавання таго, што ёсць і што нам трэба рабіць заўтра, чым жывём, што будзе нашым працягам і дзеля чаго наогул мы створаныя. Чалавек — белая пляма для самога сябе. Менавіта яго вывучэннем, а не павучаннем і займаецца мастацтва тэатра. Тэатр не "выпраўляе мазгі". І сам тэатр не пачынае функцыянаваць у пэўным нарамку пасля нейкай публікацыі, што нізрынула яго, ударыла вобзем...

Не хачу асуджаць людзей, якія ўзяліся за пяро, пачалі "мазаць пяром" старонкі газет. Значыць, такое іх накананаванне. І да іх меркаванняў, напэўна, таксама трэба прыслухоўвацца. Але ў раздзьмуванні пены вакол унутраных праблем калектыву заўсёды ёсць нейкае нездаровае марнаванне часу. Тэатр праз гэта толькі стамляецца.

Ведаеце, калі знікае сонца, дык усё, што квітнела, сцішваецца... І я, прызнацца, пакуль не зразумеў, з якой прычыны і дзеля чаго чалавеку, які жыве побач з намі, спатрэбілася выяўляць сваю пазіцыю ў мастацтве такім чынам — нібы выплюхнуўшы саляную кіслату на кветнік. У мяне было такое адчуванне: або нехта звар'яцеў, або "парад планет" здарыўся на небе, або гэты інцыдэнт быў кімсьці падрыхтаваны. Дзеля чаго? Каб на старонках газет "прайсціся", прабачце, у брудным абутку па першым тэатры дзесяцімільённага народа? Які сэнс? Дагэтуль не ведаю, хто **насамрэч** пісаў той ліст (ходзяць ужо розныя чуткі). І не цікаўлюся. Не гэта павінна быць цікава кожнаму чалавеку, які працуе ў тэатры. Можа, таму і не чакаў таго, што адбылося. Галілей калісьці сказаў: "Я веру ў розум". На жаль, у сітуацыі з вядомым пісьмом розум быў далёка і перамог не ён. На першы план выйшла адвечнае славянскае пытанне: "Хто вінаваты?", але ў ім адчуўся не пазітыўны стваральны пафас, а эмацыйны водгалас чыёйсьці асабістай незадаволенасці.

За сваё жыццё я не напісаў ніводнага радка "ў інстанцыі", не сутыкаў людзей адно аб аднаго, каб тыя адчувалі боль. Тэатр ні ў якім разе не створаны для нейкай публічнай барацьбы. Паўтаруся: яму наканавана дапамагаць, каб чалавек сам разабраўся ў сабе. А гэта самае складанае. Як чалавеку бывае ўнутрана цяжка прызнацца, што ён сам падманвае сябе! Калі ж нейкі неадэкватны ўнутраны стан выносіцца праз слова ў друк, на чалавека кладзецца ўжо адказнасць за прадуманы (можа, нават не ім) пазіцыйны ход. Як гэта класіфікаваць? Не ведаю. Безумоўна, публічна распаўсюджанае слова, якое нясе негатыў, — не кіданне "лімонкі" ў натоўп, але і яно можа выбухнуць. Дык трэба паважаць таго, хто стаіць побач з табой, таксама пакутуе, прагне, любіць і хоча заставацца самім сабой.

Не хачу перабіраць прозвішчы, шукаць вінаватых. Трэба шкадаваць гэтых людзей, якія, здаецца, саміх жа сябе не любяць, зазіраючы ў люстэрка ўласнага жыцця. Нават крык душы не апраўдвае парушэнне тых агульначалавечых катэгорый, тых маральных бар'ераў, якія абмяжоўваюць у чалавеку благое. Гэта не мы самі прыдумалі маральныя катэгорыі, яны — ад Бога. Мы мусім іх прымаць. А ультыматыўная, жорсткая форма стасункаў можа перарасці ў сварку, у бойку, у вайну: безагляднае зло кіруецца злом і нараджае толькі зло. Так і ў нас: першы злосна кінуты камень выклікаў кругі на вадзе, і адразу знайшліся "гарэзлівыя хлапчукі", якім таксама захацелася паспытаць вострых адчуванняў і якія, шпурляючы камяні, патрапляюць, між іншым, у жывых людзей.

Барані Божа выйсці такой "вайне" за берагі тэатра! Доўга давялося б збіраць тыя камяні па ўсім культурным абсягу краіны. Гэта шчасце, што наша грамадства вызвалілася з тупіка многіх дзесяцігоддзяў, калі ў асяроддзі інтэлігенцыі публічна разбіралі "пісьмы", усчыналі кампаніі па выкрыцці ідэалагічна ненадзейных, страшна распраўляліся з іншадумцамі. Шкада, што не ўсе засвойваюць такія ўрокі гісторыі. Таму я проста заклікаю тых, хто зычыць тэатру дабра, спыніць "перапіску" і заняцца творчасцю.

Пасля таго "цунамі", у якое трапілі купалаўцы, мы працягваем працаваць творча і, што галоўнае, — з поспехам у гледача. Праўда, я не ведаю, як мне, рэжысёру, малюючы сцэнічную карціну, уставіць у яе чалавека са злымі вачамі, з азлобленай душой. Магчыма, тыя, у каго не складваюцца нармальныя стасункі з калектывам, змогуць наладзіць іх на іншай сцэне, як гэта калісьці зрабілі ў Расіі Таццяна Дароніна, Сяргей Юрскі, пакінуўшы тэатр Георгія Таўстаногава...

Ва ўсіх, хто даражыць Купалаўскай сцэнай, умее зразумець момант, умее цярпець і чакаць, — добрая творчая перспектыва, шмат магчымасцей працаваць. Тэатр імя Янкі Купалы, як большасць прафесійных тэатраў Беларусі, — дзяржаўная ўстанова, таму ёсць у нашых планах і свая ініцыятыва, і дзяржаўныя заказы. Шукаем цяпер п'есу для пастаноўкі да 65-годдзя вызвалення Беларусі, да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Разам з мастацкім саветам фарміруем афішу сезона. Вячаслаў Паўлюць рэпеціруе на Малой сцэне "Дамскае танга" В. Асланавай — п'есу ў жанры камедыі. Рыхтуецца сумесны беларуска-расійскі праект — пастаноўка "Вяселля" А. Чэхава, прымеркаваная да 150-годдзя вялікага класіка. Казку драматурга-пачаткоўца В. Бяловай "Прыгоды Заранкі і Янкі" будзе ставіць у нас Аляксей Ляляўскі. Працягнем супрацоўніцтва з Мікалаем Пінігіным: ён запрошаны на пастаноўку п'есы брытанскага драматурга Б. Філа "Патрэбны пераклад", якая закранае цікавыя рэаліі і праблемы Ірландыі. Новыя работы замовілі рэжысёры нашага тэатра: Аляксандр Гарцуеў — інсцэніроўку вядомага твора Э. Ажэшкі "Хам", Уладзімір Савіцкі — трагедыю Ё. В. Гётэ "Фаўст". У маіх планах — "Старамодная камедыя" А. Арбузава для нашых сёлетніх артыстаў-юбіляраў Алы Ельяшэвіч і Уладзіміра Рагаўцова, затым пастаноўка горкаўскай класікі — "На дне"... Як вядома, напярадзе — рэканструкцыя тэатральнага будынка, давядзецца шмат гастраляваць па краіне...

Кажу так: творчай працы ўрэшце хопіць на ўсіх, і хто не патрапіў у гэты вагон, праз пяць хвілін прычакае іншы: сядзеце і паедзеце ў патрэбным кірунку, з чыстым адчуваннем шчасця, скінуўшы груз незадаволенасці.

Вадзім Дапкюнас, кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі тэатра:

— Да роздуму майстра я дадаў бы вось што. Трэба ўсведамляць, што нацыянальны рэпертуарны тэатр, які фінансуецца дзяржавай, — гэта не антрэпрыза, дзе ўсе артысты, запрошаныя для ўдзелу ў пастаноўцы, безумоўна, штораз прысутнічаюць і на сцэне. Артысты рэпертуарных тэатраў і ў нас, і ў Маскве, і ў Кіеве, і ў Лондане, і ў Вене існуюць у аналагічных умовах — г. зн. не кожны вечар і не ў кожным спектаклі яны занятыя. Як бы ні хацеў мастацкі кіраўнік максімальна задзейнічаць усю трупу, гэта проста нерэальна. У адным спектаклі занята 28 чалавек, у другім — 3. Знайсці п'есу, дзе былі б ролі для ўсяго акцёрскага складу, а гэта 61 чалавек, — немагчыма. Ды было б і нерэнтабельна. Шкада, калі не ўсе артысты разумеюць перспектыўнасць задум кіраўніка, турбуюцца толькі пра ўласную занятасць у рэпертуары, страчваюць уменне трываць, імкненне разумець адно аднаго, цярпіма ставіцца да калег. Бо пройдзе час, і акцёр абавязкова атрымае ролю, да якой, можа, ішоў усё жыццё!

Мудрасць, тактоўнасць, творчая прадбачлівасць Валерыя Мікалаевіча дазволілі яму за многія гады кіравання сабраць па каліўцу, аб'яднаць і выпеставаць калектыў яркіх індывідуальнасцей. Сённяшнія купалаўцы на 80 працэнтаў — выхаванцы школы Раеўскага. Будучыня ў такога тэатра, безумоўна, ёсць, бо тут ёсць таленавітыя натхнёныя людзі, здатныя зрабіць новы творчы крок.

♦

Тэатр быў, ёсць і застанецца тэатрам. Ён сілкуецца падзеямі; жыве паводле сваіх, часам невытлумачальных, законаў — і праходзіць іспыты.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Маладзечна. Трыумфальня арка.

Нібы табой пражытыя стагоддзі

Да 5 лістапада ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны экспануюцца адразу дзве выставы паштовак і старых фотаздымкаў з калекцыі знанага беларускага філакартыста, лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне" Уладзіміра Ліхадзедава.

Мінскі гарадскі тэатр (цяпер Купалаўскі).

Ідучы на выставы "Мінск: падарожжа ў часе" і "У пошуках страчанага", я і не прадбачыла, што змагу паблукаць па прывідна Беларусі, паглядзець на помнікі і мясціны, якія даўным-даўно ператварыліся для каго ў гісторыю, для каго ва ўспаміны. Абедзве экспазіцыі, наладжаныя пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і газетай "СБ. Беларусь сегодня", сталіся выдатным падарункам для многіх з нас.

"Падарожжа ў часе" з'яўляецца працягам калекцыі "У пошуках страчанага", якая ўжо выстаўлялася ў музеі. Гэта унікальны збор арыгінальных паштовак і фотаздымкаў (больш як 500 экземпляраў) з выявамі гарадоў і мястэчак Беларусі канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. І ўсім знаёмыя, і малавядомыя помнікі архітэктуры Віцебска, Пінска, Гродна, Мінска ды іншых гарадоў нашай утульнай Бацькаўшчыны паўстаюць на старых фота, як неверагодныя казачныя палацы і замкі.

Хто б мог падумаць, што ў Маладзечне была Трыумфальная арка — амаль, як у Парыжы! Аднак гэтая брама была разбураная ў мірныя 1950-я гады. А сёння шмат хто наракае: маўляў, асабліва няма чаго і паказаць старажытнага ў Беларусі дапытліваму турысту. Хіба што аўтэнтычныя паштоўкі...

Гісторыю старажытнай нашай спадчыны можна патлумачыць цяжкім лёсам краіны, якая перажыла столькі войнаў. І выжыла. Дарэчы, уражваюць і палохаюць фатаграфіі беларускіх земляў, зробленыя салдатамі нямецкай арміі падчас Першай сусветнай вайны.

Асобны раздзел складаюць паштоўкі "Беларускія вобразы". Тут і пінскі паляшук, і вясковая баба, і тыпажы беларускіх сялян. Такія запамінальныя і выразныя партрэты. Такія каштоўныя для гісторыі выявамі тагачасных строяў. Можна пабачыць і адваротныя бакі падпісаных паштовак. Яны ўжо не адно дзесяцігоддзе захоўваюць і неразборлівыя, і ахайныя почыркі невядомых беларусаў, якія калісьці віншавалі адно аднаго з народзінамі, Вялікаднем і Днём Анёла. Ёсць паштоўкі, якія зырчаць такой вытанчанай каліграфіяй, што сучаснае пакаленне (якое хутка будзе пісаць выключна пры дапамозе камп'ютэрнай клавіятуры) дакладна пазайздросціць гэткаму выкшталцонаму пісьму. Успрымаюцца старыя паштоўкі і фатаграфіі, як мастацкія карціны. Тое, што на іх, — ужо так далёка і нерэальна. А разнастайныя маркі, надпісы, штампы і неахайныя плямы, якія пакінулі людзі і час, робяць гэтую візуальную аўтэнтыку надзвычай выразнай. Адбіткі часу — рамантыка гісторыі.

Выстава "Мінск: падарожжа ў часе" найбольш захапляе тым, што побач са старымі паштоўкамі (канца XIX — пачатку XX стагоддзяў) размешчаны сучасныя фотаздымкі, якія дазваляюць параўнаць былое з тым, што маем цяпер. Таму па выставе (а мо, па прывідным Мінску і Мінску цяперашнім?) можна блукаць доўга, вышукваючы незаўважныя дробязі. І дзівіцца, напрыклад, што вуліца Ракаўская ў 1918 годзе была такой неахайнай і выглядала акурат як вясковая дарога пасля залевы. Альбо глядзець і не верыць, што на месцы сённяшняга праспекта Незалежнасці пралягала вуліца, па якой хадзілі трамваі, а цяперашняя Камсамольская (колішняя Багадзельная) была спрэс брукаваная. Уважлівае вока зверне ўвагу на даўнія рэкламныя шыльды (вонкавую рэкламу, альбо "наружку", як кажуць сёння) і адзначыць, што яны не менш стылёвыя, чым сучасныя бігборды. На некаторыя фотаздымкі патрапілі тагачасныя людзі. І калі добра прыгледзецца, то можна ўбачыць іх сукенкі, строі і капелюшы ў стылі мадэрн.

На выставе прадстаўленыя таксама кнігі, выдадзеныя на аснове філакартычнай калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава: "У пошуках страчанага", "Знічкі Айчыны", "Сінагогі", "Мінск: падарожжа ў часе".

Наведаеш такую выстаўку — і ўласны досвед узбагачаецца новымі ўражаннямі, штрыхамі, дэталямі, нібы пражыў ты ў роднай Беларусі ўжо не адно стагоддзе і шмат паспеў пабачыць за свой век.

Воля ЧАЙКОЎСКАЯ

Фота аўтара

Абломаўшчына forever, альбо «Кіно без твайго ўдзелу»

“маладосць — гэта ўпарты наіўны шахід што сніць парадыз хоць навокал — аід”.

Сяргей Прылуцкі

У адрозненне ад крытыкі, якая па вызначэнні не абавязана быць карэктнай (інакш гэта не крытыка, а звычайнае анансаванне), паэзія не павінна ператварацца ў пошла-пацешныя калялітаратурныя эксперыменты, няхай і цікавыя па сваім сэнсавым напаўненні, за якімі аўтар хавае нестандартнае мысленне і светабачанне. Знешне такія тэксты могуць выклікаць прыемнае здзіўленне чытацкай публікі, але звычайна пры цвярозым разглядзе яны нагадваюць рыфмаванае балбатанне аўтара, зацыкленага на ўласных жыццёвых праблемах, якія манерна-штучна разглядаюцца ў рэчышчы агульначалавечых. Іншая справа, калі адно літаратурнае пакаленне не разумее іншага, бо выхоўвалася ў розных палітычных сістэмах з адрознымі каштоўнаснымі арыенцірамі. Нараджаецца канфлікт непаразумення, прыцягальны сваім вырашэннем і пошукамі ісціны. Можна доўга спрачацца з-за сродкаў рэалізацыі аўтарскай задумы ў творах, але пісьменніку нельга адмаўляць у *колеры* светаўспрымання, паколькі жыццё пабудавана на кантрастах святла і цемры.

Сяргей Прылуцкі належыць да той генерацыі паэтаў, чыё юнацкае сталенне і творчае станаўленне прыпала на злом эпох, пераходны этап ад сацыялізму да рынку. Пакаленне 30-гадовых, выхаванае на утапічных ідэалах камунізму, аказалася непадрыхтаваным да новых умоў існавання — выкінутым за борт часу. Добра, калі нехта з лёгкасцю прыстасаваўся да іншых правілаў жыццёвай гульні, але з уласнага вопыту бачу, што большасць так і засталася ў мінулым вымярэнні, прычым назаўжды (forever), згубіўшыся ў лабірынтах маральнага выбару і здаровага сэнсу. Гэта надзвычай востра адчуваецца ў мастацкіх тэкстах, дзе персанаж, страціўшы ранейшыя арыенціры, кідаецца з крайнасці ў крайнасць, прыходзячы нарэшце да несуцяшальна апраўданага ідэйнага тупіка, з якога няма выйсця. Ні дарогі ўперад, ні дарогі назад. Жыццё ператвараецца ў суцэльны бег на месцы — марнаванне часу і горкі роздум над згубленымі магчымасцямі і *ляснутымі* марамі. У падобным стане, прынамсі, знаходзіцца лірычны герой у вершах берасцейскага паэта С. Прылуцкага, аўтара зборніка “Дзевяностыя forever” (Мінск, бібліятэчка часопіса “Дзеяслоў”, 2008 год), што яскрава выяўляе канфлікт пакалення 30-гадовых з часам, у якім даводзіцца жыць, падстройваючыся пад *усіх*.

Зборнік фармальна падзелены на сем раздзелаў, назвы якіх адлюстроўваюць ідэйную скіраванасць вершаў. Але сутнасна ад гэтага нікольк не мяняецца, апрача тэм ды сюжэтных дэкарацый непрычасанай рэальнасці, убачанай на адвячорку з балкона звычайнага панельнага дома вачыма маладога філосафа-курца. Лірычны герой *“уцякае ад сталення”*, *“шукае паратунку ад сябе”*, перажываючы своеасаблівы крызіс узросту, выкліканы ідэалагічнымі катаклізмамі і іх наступствамі. Ён, бесклапотны гультаяваты летуценнік, не ўмее жыць і нічога не робіць для таго, каб нарэшце кардынальна змяніць сваё бязрадаснае існаванне... Гэта *“пілігрым да няіснае Меккі”*, які балюча перажывае *“кіно без свайго ўдзелу”* (нават у цітрах), а яшчэ больш — маладосць, з якой не ведае, што рабіць і куды скіраваць туманныя жыццёвыя памкненні: *“без сэнсу быць некім а злашча быць маладым”*. Ды занадта разумным — дадам ад сябе. Але пры гэтым лірычны герой, які старанна *“займаецца ананізмам душы”*, адносіцца да сябе без шкадавання, бо яно — *“прыкмета слабога духу і — прыроднага скоцтва”*, нават калі *“жыццё — вялікі лазарэт // бясконцая хірургічная аперацыя // без наркозу // і перапынкаў на абед”*.

Высновы, да якіх прыходзіць герой, сумныя: *“І нічога няма страшней // як ляжаць пад адкрытым небам // і не мець у тым небе патрэбы...”* Таму і *“застаецца цяпер толькі моўчкі стаяць на тэрасе // і глядзець, як чыёсьці аўто аддаляецца кропкай па трасе”*. Не ведаю, які *агонь і медныя трубы* трэба прайсці ў жыцці, каб з непрыхаванай горыччу зазначаць яшчэ на пачатку жыццёвай дарогі наступнае: *“Калі ўжо немагчыма быць кім ёсць, // так фантастычна й клёва — ўгледзець, што любая // дарога — гэта выйсце...”* Інтуітыўна разумееш, што чалавека да невясёлых думак давяла грамадская мадэль свету, абрыдлы парадак жыцця. Але вось незадача — што прапанаваць яму ўзамен? Па-мойму, усё ў гэтым жыцці ўладкавана надзвычай проста. Чалавек — вялікі аматар ствараць праблемы з паветра, а потым весці з імі зацятае і ўпартае змаганне да пераможнага фіналу — свайго... Дык навошта ў мільярдны раз уздымаць рытарычныя пытанні аб тым, што назаўжды застанецца за небакраем?

жыццё паціху ператвараецца
ў канвеер
за і перад табою дэбільныя ночы і дні

Альбо:

Ды ўсё-ткі па-ранейшаму наіўна
не ад сябе — ад свету патрабуем
Гармоніі. А свет, што свет? — нічога.
Ён, цынік, клаў на нас, сляпых нябогаў.

Часам здаецца, што лірычны герой захапляецца сваім незайздросным становішчам. Але гэта цалкам зразумела. Калі не можаш плакаць і не здольны накласці на сябе рукі, пачынаеш ставіцца да рэчаіснасці з уласцівым маладзёжным сцёбам і ёрніцтвам. У выніку *гумарызацыя* жыцця дае ілюзію шчасліва-бестурботнага блазнерства. Ідыётам жыць прасцей. З яго нічога не возьмеш: *“Так і пражыву бязмэтна // бескарысным маргіналам, // разліковым дзяржбілетам // нулявога наміналу”*.

Самакрытыка — гэта, бясспрэчна, добра, асабліва для пісьменніка. Аднак ад прызнання бясконцых параз наўрад ці стане лягчэй. І самому, і навакольным. Напэўна, ад таго нараджаюцца *забойныя* думкі, што падпадаюць не толькі пад пераслед Грынпісам, але і крымінальную адказнасць ажно да смяротнага прысуду:

Палю ў акно. Па галубах.
І пнеўматычная вінтоўка
слухмяна робіць свой “ба-бах”
і птушак падбівае лоўка.

Але, канечне ж, цікавей
было б са снайперкі. Па людзях.
Прыклаўшы оптыку да вей,
Вяршыць сляпое правасуддзе.

Бо свет — нібы вялікі цір,
дзе кожны заслужыў па кулі.
Мой Бог — мой кілер і кумір —
вальні па мне з нябеснай рулі.

Я да апошняга спадзяваўся, што лірычны герой С. Прылуцкага знаходзіць хоць нейкае суцяшэнне ў каханні. Але і ў гэтай сферы сітуацыя такая ж бязрадасная. Паказальнай з'яўляецца вытрымка з “Санетаў да Франчэскі”:

Нас можа разлучыць любая дробязь,
бо мы адно аднога не кахаем —
але ж у цалкам адваротным зноў
пераканаць спрабуеш. Пераспаўшы
са мною пару тузінаў разоў,
ты палічыла: гэта файны доказ,
што я ўжо твой навечна. Ані-ні.

Максімалізм — гэта добра, а здаровы максімалізм — яшчэ лепш. Не варта ператвараць жыццё ў пакутлівыя пошукі таго, чаго няма і што ніколі не знойдзеш. А потым выдаваць на гара наступныя перлы:

Калі б Езус радзіўся не ўзімку,
а ўлетку,
я Раство б сустракаў
на зялёных палетках
ў таварыстве паўголых дзяўчат.
Ты, Гасподзь, быў бы дзеўкам тым рад.

Штосьці сумняваюся ў гэтым. Гарэць табе, пане паэце, у пеклавым смаляным катле на слабым агні. Вось пабачыш. Падобная самадзейнасць (прэс-сакратар Усявышняга знайшоўся!) дывідэндаў не прыбаўляе, хаця і стварае скандальную рэпутацыю донжуанаўскага распусніка. Кожнаму сваё.

А ўвогуле, лірычны герой аўтара нецікавы. У ім няма нічога прыцягальнага. У яго няма чаму павучыцца. Да яго не хочацца быць падобным. Гэта класічны Абломаў, які замест канапы марнуе час на балконе ці ля акна, адкуль ад беспрасветнай нуды пастрэльвае па бяскрыўдных птушках... Гэта тыповы сіндром правінцыйнага жыхара, якога, па вялікім рахунку, задавальняе *дзіўны* лад жыцця. Герой нават не імкнецца вырвацца з *тэрыторыі абсурду*, затое актыўна *развозіць* абстракцыянізм пра выратавальныя заморскія краі, дзе яго дакладна ніхто не чакае. Тут, на непрывабнай радзіме, герой знаходзіцца сярод *сваіх*. Няхай яны і не настолькі разумныя, як ён, але ад іх ведаеш, чаго чакаць. Адсюль і *вылазіць* абломаўшчына: падсвядома разумееш, што бегчы няма куды, але прызнацца ў гэтым цяжка. І мяняць ужо нешта на іншае герой проста не здольны. Ён, апанаваны апатыяй, асуджаны на вечнае марнатраўства. І ніякія Эльдарада з Эдэмамі ды парадызамі яму не дапамогуць.

Дык хто ж ён, паэт сённяшняга часу? Па якіх прыкметах яго распазнаць? Чытаем у С. Прылуцкага:

Я — арфей, словаблуд,
мацюгальнік заўзяты —
у памежнай правінцыі краю абсурду,
час і розум марнуючы
ў порна і чатах,
паратунак знаходжу у словах.
Заўсёды ў палюбоўным разладзе
з быццём і сабою...
.....
Мой тупік —
безаблічныя лёгкія будні,
што мяне прыручаюць,
ад жарсцяў і сноў
адлучыўшы. Мой час —
надта брыдкі ды брудны.
Ажыві сваёй явай жыццёвае шоў.

Радуе, што паэт абыходзіцца без традыцыйна-абрыдлых жальбаў і стогнаў пра долю. Гэта правільна. Не я прыдумаў: не можаш змяніць свет — змяні сваё стаўленне да яго. Прычым з доляй гумару і весялосці. Бурчанні прыйдуць пазней, пад старасць. А цяпер жыві ў тым часе, у якім наканавана. Бо ўсё наканаванае так ці інакш мае сэнс, нягледзячы на знешнюю ягоную адсутнасць. Але ведаць пра гэта неістотна. Жыццё кароткае для таго, каб запаўняць яго роздумамі над рознай філасофскай непатрэбшчынай і казуістыкай. Лаві момант, пакуль малады!

Відавочна: паэзія С. Прылуцкага па сваёй сутнасці дэструктыўная і малапрадуктыўная, што цудоўна разумее і аўтар. Цікава іншае: што далей, Сяргей? Ці здолееш узяць чаканы авіябілет у касе на самалёт, што трымае курс на прывіднае Эльдарада, дзе пануе вечны парадыз? Пажывём — пабачым. А пакуль штурмуй жыццёвыя барыкады, ім патрэбны малады рэвалюцыянеры. Дый змаганне якніяк загартоўвае характар. Можа, калі і спатрэбіцца ў гаспадарцы...

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Артыкул друкуецца ў скарочаным варыянце.

Крыху пра беларускую вёску

Кніга “Апавядае беларуская вёска”, што выйшла ў выдавецтве “Про Хрысто” (успаміны пра перажытае, аповеды пра сямейныя гісторыі, пра розныя здарэнні і прыгоды; з дыялекталагічнага архіва Ніны Іванаўны Гілевіч), як сведчыць у прадмове народны паэт Н. С. Гілевіч, прызначана, каб “пачутае і запісанае непасрэдна з вуснаў вяскоўцаў зрабіць набыткам сучасных чытачоў, — з тым, каб лепш зразумець душу і характар беларуса, яго менталітэт, яго жыццёвыя, маральныя і этычныя прынцыпы”.

Нягледзячы на невялікі тыраж (100 асобнікаў), кніга займальна распавядае пра вайну (не толькі Вялікую Айчынную, але і пра Першую сусветную!), смех (“Пра бацюстаў”) і боль (“Была ў мяне дачка”), пра радасць (“Шчаслівая”) і гора (“Пра пажар”) — пра ўсё тое, чым было напоўнена цяжкое жыццё вясковых жыхароў. Вядома, большасць запісаў — пра вайну і пра побыт пасля вайны; пра тое, як людзі выпрабоўваюцца абставінамі і перамагаюць іх.

Тут і мудрасць, і трываласць, і рашучасць, і іронія. І сапраўды, гэтыя апавяданні дапамагаюць зразумець менталітэт і характар беларусаў, адчуць народную філасофію, якая будуецца па сваіх маральных правілах.

Аднак пры чытанні ўзнікалі пэўныя пытанні.

Напрыклад, чаму дыялекталагічныя запісы пададзены на сучаснай беларускай мове? Тым больш, што маўленне жыхароў Мінскай вобласці было б зразумела ўсім беларусам, бо менавіта гаворкі цэнтральных беларускіх дыялектаў пакладзены ў аснову літаратурнай мовы. Шкада, што нельга цалкам адчуць смак гаворкі народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа (у кнізе прадстаўлены запісы з в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна).

Хоць Н. С. Гілевіч і пакінуў некаторыя “найбольш характэрныя” асаблівасці мясцовых гаворак (ідзець, ходзя, сказоў), прынцыпы падачы матэрыялаў выклікаюць пэўныя заўвагі. Напрыклад, не заўсёды адзначаецца асіміляцыйная мяккасць свісцячых перад санорнымі “пасьмялела” і “смялей” (с. 36), “зьняла”, “са сьцяны”, “на сьвеце” (с. 37) і “абедзве”, “апасля” (с. 39); часціца “не” адлюстроўваецца ў запісах як “не” і “ня”: “не бача”, “не кажа”, “ня верыце” (с. 13); “не паверыў” і “ня можа быць” (с. 15) і г.д. Таксама ў тэкстах сустракаюцца дыялектныя словы, якія ніяк не тлумачацца: “тупнуцца”, “трыбухач”, “расчабаніць”, “буч”, “налабка”, прычым такія словы пададзены без націскаў і невядома, як гэта слова гучыць. Дарэчы, пажадана было б ва ўсіх тэкстах кнігі ставіць націскі, а напрыканцы падаць невялікі слоўнічак дыялектных слоў.

Песні і прыпеўкі, якія змешчаны пасля тэкстаў, таксама, на жаль, пададзены сучаснай беларускай літаратурнай мовай, без указання раёнаў, інфарматараў і тых, хто рабіў запісы; не вызначана жанравая прыналежнасць песень (вясельная, песня пра каханне, жніўная і г.д.), што, канечне, збядняе каштоўнасць запісаў.

Але ў цэлым кніга “Апавядае беларуская вёска” вартая ўвагі чытачоў. Шматлікія народныя эпітэты, параўнанні, фразеалагізмы, што сустракаюцца на яе старонках, могуць быць выкарыстаны пісьменнікамі, настаўнікамі і ўсімі, хто рупіцца пра чысціню, багацце і прыгажосць нашай роднай мовы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Амброзь КАРШУНЬСКІ

Пярэліўкі

Не трэба мне пасрэднікі,
Калі я клопат маю.
Хоць жарты —
не пярэліўкі,
А я пераліваю.

Не, злосці я не маю
На вашу ўсмешку кожную,
Бо ўсё ж пераліваю
Я з поўнага ў парожняе.

Неўгамон

Той паэт-неўгамон
Мару песціць заўзята,
Што ўсе вершы яго
Разбяруць на цытаты.

Лавелас

Чытаеш вершы — лавелас,
Такое іншаму й не сніцца.
А сам даўно прыціх і згас
Ля сумнай жончынай
спадніцы.

Дакапаўся

Свой зорны час
ён не праспаў:
Як клікнулі —
прыйшоў з лапатай.
Глыбока надта
не капаў,
Бо творчы грунт
быў мерзлаваты.

Пакаранне

На той Парнаскае гары
Пясняр такога натварыў,
Што не стрымалася гара,
Штурхнула
ў бездань песняра.

Не туды дарога

Хаму́ ў саюз прымалі мы,
Хоць не туды яму дарога.
Ад хама шмат было
ў Хамы,
Ды ад паэзіі... нічога.

Не так зразумеў

Яго чакалі з кніжкаю,
А ён з'явіўся з лыжкаю.

На выданні

Ёй не страшны
крытыкаў баданні,
І гады не страшныя,
здаецца.
Бо сама паэтка
на выданні —
Колькі хоча,
столькі выдаецца.

Зміцер БУЗАЦЁР

Уладзіміру Маруку

Ў дзень нараджэння Маруку,
Каб ён ішоў сваёй калейкай,
Паспешна муза у руку
Пяро уклала і жалейку.

Ідзе і бачыць — долу плеш,
А там вунь — заяц-баязліўца.
Прысядзе, з ім напіша верш,
Ды і павесіць на галінцы.

Андрэю Федарэнку

А што табе, скажы,
не па плячы?!
І з коклюшам расстаўся,
і з прастудаю.
Ты свой у выдавецтве і, лічы,
Даўно ўжо не чужы
на кінастудыі.

Шаблон ўбок адкінуў
і тандэт.
З ракі акулу цягнеш,
— не карасіка.
Каторы год
— бясспрэчны прэтэндэнт,
З падачы Галубовіча,
у класікі.

Янку Лайкову

Быў Маякоўскі неблагі хадок.
Таму нагамі цяжкаступа пешшу
Выхаджваў
у кватэры свой радок,
Яго чаканіў
для гарлана-верша.

Ну а Лайкоў,
каб крылы даць радку,
Каб ён займеў
эпічныя абрысы,
Выязджвае яго у цягніку,
Што ходзіць па маршруту
"Мінск—Барысаў".

Анатолю Зэкаву

Імя бяростай белай бінтаваў,
Ды ратаваў ад кпінаў
і ад здзекаў.
І пад канец рэабілітаваў
Ён прозвішча задротавае —
Зэкаў.
Спяваў ён і пра ёўню,
і пра склюд,
Амністыі склаў оду,
ліха матары!
Імя і стала ў рад, дзе —
Правасуд,
Законнікаў
і Міша Губернатараў!

Уладзімір МАЦВЕЕНКА

Важная прычына

Запытала маці
ў студэнта Ігната:
— Здаецца,
што спіш
Ты сынок малавата?
— Усё залежыць...
— Ад чаго дзіцятка?
— Ды ўсё залежыць
Ад раскладу заняткаў.

Каму што

— Што лепш:
Тэлевізар альбо газета? —
Запыталася
ў дзеда кабета.
— Канечне, газета,
Што за пытанне, —
Азваўся
З усмешкаю дзед, —
Я пачытаю яе
У час снядання
І загарну бутэрброд
На абед.

Алег ЖДАН

Сапсаваўся ў бабы Ганны тэлефон

Сапсаваўся ў бабы Ганны тэлефон. Тэлефон? Гэткая важнасць! Маці яе, бабка яе, прабабка, прапрабабка і тысячы пакаленняў да іх жылі без тэлефона і нішто сабе — не гаравалі. А калі й гаравалі, то зусім з другой нагоды. То гаспадар у хаце не гаспадар, то сын сышоў з круга, то нявестка — злыдня, толькі ж аніяк не з-за тэлефона. Так што ўсё добра, можна жыць, не звяртаючы ўвагі на той сапсаваны тэлефон. Шкада адно, што набліжаўся дзень нараджэння ўнучыка Колі, хацелася патэлефанаваць, павіншаваць. А яшчэ набліжаўся юбілей сына Валодзі. І срэбранае вяселле дачкі Машы. Так што тэлефон патрэбен. Як без тэлефона? XXI стагоддзе! Але ж — сапсаваўся ў бабы Ганны тэлефон.

Сапсаваўся тэлефон? Во праблема! Ідзі да суседзяў, у каторых не сапсаваўся тэлефон дый звані, каб адрамантавалі. Так яна і зрабіла. І ўсё атрымалася, як хацела. На тым канцы праваду спыталі адрас, прозвішча, імя ды імя па бацьку — з павагай паставіліся да бабы Ганны. І яна ў добрым настроі пайшла да хаты і пачала чакаць. Чамусьці рашыла, што прыйдуць рамонтнікі заўтра. Паднялася на досвітку. Падцерла падлогу мокрай анучай. Грошыкі падрыхтавала: а раптам з'явяцца раніцай?

Але ж не прыйшлі рамонтнікі і ўвечары.

Значыць — заўтра. Альбо — паслязаўтра. Альбо... Не, тыдзень праляцеў, а іх як не было, так і няма. Тым часам дзень нараджэння ўнука набліжаўся.

Не давяраючы больш суседскаму тэлефону, рашыла баба Ганна пешкі ісці на вузел сувязі. Далекавата, канечне, жыла яна на краі горада, пад гарой, а што паробіш, — трэба. Пайшла.

Вось ён, вузел. То, разумей, пошта. Дайшла! Цяпер трэ падняцца на трэці паверх. Што ж, трэба дык трэба. Са скрыпам-стогнамі, узабралася, узлезла. Вось і патрэбны пакойчык: «Уваход забаронены!» Страшнаватая шыльда, але ж жанчына-дыспетчарка за дзвярыма аказалася не страшнай. «Заказаў шмат, — адказала. — Чакайце. Зробім праз два-тры дні».

Толькі ж не паявіліся рамонтнікі і праз два тыдні. А дзень нараджэння ўнучыка Колі, тым часам, мінуў. Мінуў і юбілей сына Валодзі. Вось-вось і срэбранае вяселле дачкі Машы...

І тады яна рашыла ісці да начальніка гэтай самай тэлефоннай станцыі. І пайшла. А ён на яе зірнуў, як на дзіва гарохавае. «Зробім», — промовіў. «Калі?» — пацікавілася нахабніца-бабка. «У парадку агульнай чаргі».

Сумна паківала галавою баба Аня і пакіравала дамоў. Ведала, што такое чарга. Нямала часу прастаяла ў чэргах за доўгае жыццё. Аднак перш чым прачыніць дзверы, прамармытала: «Я, канечне, старая, дурная і брыдкая, няма за што мяне любіць-паважаць, а толькі заўтра раніцаю паеду ў Мінск да Прэзідэнта».

Мармытала невыразна і неразборліва, зразумець нельга, але ж словы «Мінск» і «Прэзідэнт» начальнік пачуў. І раніцаю тэлефон у бабы Ганны запрацаваў.

Шаржы Алега КАРПОВІЧА

Міхась СЛІВА

Натхненне

Гумарэска

Андрэй Пятровіч Заліхвацкі штогод пісаў па дзве аповесці. А здаралася, і па тры. Як пашанцуе. З друку, праўда, кнігі выходзілі не густа, але ж Андрэй Пятровіч жыў актыўна, пастаянна быў у творчым пошуку. Жонка яго, Альбіна Кірылаўна, была сведкай поспехаў мужа і заўсёды бласлаўляла яго на новыя здзяйсненні.

Яна так кахала яго, што калі, здаралася, Андрэй Пятровіч даваў каму са знаёмых свой аўтограф, які завяршаўся словамі: "А. Заліхвацкі, член Саюза пісьменнікаў", Альбіна Кірылаўна дапісвала: "А. К. Заліхвацкая, жонка члена Саюза пісьменнікаў". Дык вось яна ні разу не запярэчыла, калі муж збіраўся ў чарговую паездку ў які-небудзь санаторый. Таму што ведала: Андрэю Пятровічу неабходна творчая атмасфера, дома ж увесь час турботы, нічога не пішацца, а з паездкі муж абавязкова прывязе чарговы твор.

Заліхвацкі звычайна вяртаецца дадому спакойны, радасны, вясёлы. Паказвае жонцы свежы тэкст, у якім заўсёды новыя імёны. А раз так, то можна не хваляваца: Андрэй Пятровіч сапраўды працаваў, а не лынды біў, тым больш не заляцаўся да чужых жанчын, якіх на курорце процьма!..

Чытаць жа Альбіне Кірылаўне няма часу, бо пасля доўгага расстання яна накідваецца на мужа. А рукапіс твора на другі дзень Андрэй Пятровіч нясе на рэцэнзаванне.

...Вось і на гэты раз, вяртаючыся з санаторыя "Прыдняпроўскі", Андрэй Пятровіч быў спакойны: перад ад'ездам ён даў адной з работніц бухгалтэрыі (за грошы, безумоўна) перадрукаваць на камп'ютэры стос пажаўцелых старонак, на якіх словы "Наташа" і "Аркадзь" замяніў на "Галю" і "Толю". Астатні ж тэкст застаўся ранейшым.

Затое як выдатна Андрэй Пятровіч адпачыў, атрымаў натхненне! Якая цудоўная Муза трапілася яму на гэты раз! Маладая, прыгожая, абаяльная...

Знаёмы ўсім са школьных гадоў, хрэстаматыйна звыклы, свой паэт... Нават застандартызаваны настолькі, што ў масавай свядомасці прыдатны на любыя выпадкі жыцця — ад афіцыйна-дзяржаўнага згадвання ў святочных прамовах да застольна-побытавага ў жартах ды анекдотах. Узгадаваны ў той жа свядомасці стэрэатыпамі накшталт "што я мужык, усе тут знаюць", "пан сахі і касы", "я — калгасніца маладая", "сыходзіш, вёска, з яснай явы", "а на рэчцы, на Арэсе сталася прыгода". Унармавана-вывераны і ў літаратуразнаўстве, пачынаючы з манаграфіі Я. Мазалькова і пазнейшых прац, у якіх, вядома ж, ёсць свае глыбокія і слушныя назіранні. Досыць грунтоўна даследаваны ў наш час. Ды літаратуразнаўчыя кнігі пра яго не сталі падзеяй, якая б выйшла за рамкі літаратуры. Нават поўнае, 9-томнае выданне нацыянальнага класіка, якое адкрыла невядомага Купалу, не выклікала ў нас неабходнага рэзанансу, не нарадзіла шырокага абмеркавання, дыскусіі. Мы яшчэ як след не адчулі, што Янка Купала — гэта наша балючае нацыянальнае сумленне, што Беларусь для яго — святыня, і ідэя яе дзяржаўнай самастойнасці, незалежнасці, якая выпакутавалася ў цяжкіх духоўных выпрабаваннях, стала сэнсам існавання паэта.

Янка Купала без рэтушы: погляд з Масквы

Вельмі арганічная ў томе "Молодая Беларусь" паэма "На Куццю", малавядомая масаваму чытачу, бо не ўваходзіла ў выданні Янкі Купалы з 1929 г. да канца 80-х. Паэт рамантычна ярка сцвярджае тут, што сама гісторыя Беларусі забяспечыла яе волю і незалежнасць, прадвызначыла тую акалічнасць, што народ, хоць і прыдушаны няволяю, не скарыўся і не страціў творчага духу. Незвычайная марфалагічная фантазія Купалы дазваляе тут выказацца на высокай паэтычнай ноце, захапіць чытача харастом гераічнай мінуўшчыны.

Думкі такія прыходзяць, калі знаёмішся з салідным томам Янкі Купалы "Молодая Беларусь", выпушчаным сёлета ў Маскве выдавецтвам "Советский писатель". Падрыхтаваў зборнік як складальнік, аўтар прадмовы і заўваг вядомы маскоўскі беларусіст Аляксей Каўка, які нямала і раней пісаў пра Купалу. У прыватнасці, у яго апошніх літаратуразнаўча-культуралагічных кнігах "Каб не забыцца" (Мінск, 2006) і "От Скорины до Купалы" (Масква, 2006), не заўважаных, на жаль, нашай крытыкай, грунтоўна прачытваецца магістральны напрамак творчасці беларускага песняра. У згаданым томе складальнік прэзентуе найбольш тыя творы Янкі Купалы, у якіх гучыць матыў нацыянальнага адраджэння Беларусі. Матыў гэты скразны, пераконвае А. Каўка, трымаецца часцей на драматычна балючай ноце і выяўляе самы чуйны нерв душы паэта, сардэчна прытуленай да бацькоўскіх палеткаў. Тут — самае важнае і глыбокае ў асобе Купалы. Даводзячы гэта, маскоўскі даследчык адбірае для тома творы розных гадоў і розных жанраў — вершы, паэмы, артыкулы, нават далучае да іх асобныя ўспаміны і крытычныя нататкі (А. Луцкевіча, В. Ластоўскага, Ю. Віцьбіча і інш.). Натуральна, што ў такіх творах загаварыў з усёй сілай мастацкай энергіі паэтычны дар Купалы. "Гэта крык, што жыве Беларусь", "Беларушчына", "Над Нёманам", "Апекунам", "Роднае слова", "Мая малітва", "На куццю", "Забраны край", "Маладая Беларусь", "Свайму народу", "Спадчына", "На сход", "У вырай", "Паязджане", "Паўстань...", "25.III.1918 — 25.III.1920. Гадаўшчына-памінкі", "Сын і маці", "На біблейныя малітвы", "Акоў паломаных жандар", "І прыйдзе" — у гэтых розных па зместе творах, што ўспрымаюцца як вехі творчага шляху, аднолькава пульсуе гарачы тэмперамент паэта-рамантыка, шчыра адданага радзіме-Беларусі, трывожна заклапочанага яе лёсам, гнеўна абуранага паводзінамі "непрыяцеля-брата". Менавіта тут напружанасць лірычнага перажывання нястрымная, нярэдка прарываецца на паверхню тэксту і звініць моцна напятай эмацыянальнай струной. Боль стратаў, адчай і роспач, цяжкая скруха, надзея і вера лірычнага героя Купалы хвалююць нас і сёння гэтак жа, як хвалявалі сучаснікаў паэта. Хіба не могуць не крануць цяпер радкі паэтычнага звароту да пералётных гусей, што заўсёды вяртаюцца з выраю: "Знаю, зложыце тут косці, // Толькі злётаеце ў госці, // Асвяжыце грудзі: // Вы не ўмееце йшчэ, гусі, // Выракацца Беларусі, // Як умеюць людзі". Ці яшчэ: "Цікавыя людзі мы, беларусы!" — так пачынаецца артыкул "Больш самачыннасці" (1919). Дакор паэта, асцярожна-далікатнага тут, у адрас землякоў, вечна цярплівых і пасіўных у справах нацыянальнага вызвалення, чуецца на розныя лады ў многіх творах паэта. У зборнік не ўвайшлі "Тутэйшыя", але дух гэтай сатырычнай камедыі жыве на яго старонках. А. Каўка не абмінае твор і ў прадмове, трактуючы яго як "памфлет на мещанское захирение земляков, превращаемых суетными страстями в безвольных заложников оккупационных режимов". Цытуе пры гэтым словы Янкі Здольніка, палымянага абаронцы гонару і годнасці свайго народа.

Вельмі арганічная ў томе "Молодая Беларусь" паэма "На Куццю", малавядомая масаваму чытачу, бо не ўваходзіла ў выданні Янкі Купалы з 1929 г. да канца 80-х. Паэт рамантычна ярка сцвярджае тут, што сама гісторыя Беларусі забяспечыла яе волю і незалежнасць, прадвызначыла тую акалічнасць, што народ, хоць і прыдушаны няволяю, не скарыўся і не страціў творчага духу. Незвычайная марфалагічная фантазія Купалы дазваляе тут выказацца на высокай паэтычнай ноце, захапіць чытача харастом гераічнай мінуўшчыны.

Так што палітра грамадзянска-патрыятычнага пачуцця Янкі Купалы ў гэтай кнізе досыць шырокая, але скрозь яно выглядае мэтанакіраваным і моцным.

Добра высвятляюць галоўную лінію творчасці Купалы і змешчаныя ў томе "Молодая Беларусь" яго публіцыстычныя артыкулы "А ўсё ж такі мы жывём" (1914), "Вера і нацыянальнасць" (1914), "Беларускае войска" (1919), "Забабон" (1919), "Моладзь ідзе" (1919), "Незалежная дзяржава і яе народы" (1919) і інш. Напісаныя эмацыянальна стрымана, з асветніцка-дыдактычным разлікам, яны прасякнуты той жа няўтольнай трывогай за будучыню бацькаўшчыны, магчымасці яе дзяржаўнага адраджэння. Абвостранае пачуццё грамадзянскай адказнасці, незадаволенасць сабой кіруюць паэтам і ў савецкі час. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, радкі, напісаныя ў 1926 годзе: "І прыйдзе новых пакаленняў // На наша месца грамада // Судзіці суд, ці мы сумленна // Жыццё прайшлі ...".

Да твораў згаданай генерацыі я бы дадаў яшчэ толькі адзін верш Янкі Купалы — "Я ад вас далёка" (1910) — прачулую паэтычную клятву-літанне ў вернасці найдаражэйшаму — "бацькаўскім гоням". Лірычная споведзь тут па-купалаўску сардэчна шчымлівая і адначасна магутная грамадзянскай усхваляванасцю выказвання. Але А. Каўка, складаючы кнігу, не абмяжоўваецца толькі творамі грамадзянскага плана. І гэта вельмі істотны фактар выдання. Янка Купала ў бачанні складальніка ўсё ж вялікі паэт, а не функцыянер адраджэнскай ідэі. Таму ў том яго спадчыны ўвайшлі і такія вершы, нешматлікія, праўда, як "Да дзяўчынкі", "Снег", "Кругаварот", "Явар і каліна", "Лясное возера", "Генацвале", у якіх дамінуюць вечныя ісціны, выяўленыя пры гэтым паэтычна прыгожа. Янка Купала засведчыў такімі творамі ўменне ўспрымаць жыццё ў светлых, акварэльных фарбах, весці гаворку лірычна выганчана, з таямнічым падтэкстам, на сцішаным паэтычным паўтоне. Таму выданне прадстаўляе выдатнага паэта ў яго паўнакроўным абліччы. Але, паўторым, вылучае яго галоўную ідэйна-эстэтычную сутнасць, як песняра вызваленчых імкненняў, нацыянальнага ідэолага Беларусі. Упершыню, здаецца, маем асобны том Купалы, дзе перададзена сістэмная асаблівасць яго творчасці. Тым больш адчувальная ў кнізе выбуховая энергія пачуцця паэта, якога складальнік атэстуе як "прарока лёсу народнага". Сёння ва ўмовах будаўніцтва нашай незалежнай дзяржавы нас не могуць не хваляваць і не быць для нас урокамі самаахвярныя парыванні героя Янкі Купалы, гатовага ўсяляк аберагаць і ахоўваць Беларусь.

Характэрнай асаблівасцю маскоўскага выдання беларускага класіка з'яўляецца паралельная падача мастацкіх тэкстаў у арыгінале і перакладзе на рускую мову. А. Каўка на гэты конт нават робіць агаворку ў прадмове, падкрэсліваючы, што ў расійскай культурнай прасторы будзе цікавы і аўтэнтычны Купала-паэт, яго інтанацыйны лад, сакавітасць беларускага слова, якія шмат у чым трацяцца нават у дасканалых перакладах. Выкарыстаны ў томе пераклады самых розных аўтараў — ад Э. Багрыцкага, М. Ісакоўскага, У. Раждественскага да Н. Кісліка і І. Бурсава. Перакладаў апошніх найбольш у кнізе, і трэба прызнаць іх у цэлым лепшымі. Увогуле ж перакладаў Купалы на рускую мову не так многа, і ў складальніка быў зусім невялікі выбар варыянтаў. Давялося ўключаць, што ёсць, што стала звычным. Між тым, у перакладах на рускую мову беларускага песняра даўно заўважана шмат адвольнасцяў. Вось дзе, між іншым, поле для плённай творчай працы сучасным нашым рускім літаратарам, магчымасць праявіць сваё майстэрства, урэшце, сапраўдная школа. А адвольнасці кідаюцца ў вочы. Возьмем, напрыклад, Купалаў шэдэўр "Явар і каліна". Нагадаем пачатак твора: "Песняй вясны лебядзінаю, // Скінуўшы зімнія чары, // шэпчуцца явар з калінаю... " Перакладчык Г. Куранёў, па сутнасці, выпраўляе арыгінал, даючы такі тэкст: "С песней весны журавлиною, // Сбросив морозные чары. // шепчутся явор с калиною... " Сустракаюцца сляды нядбальства і ў добрых у цэлым перакладах Н. Кісліка. Класічная Купалава "Спадчына" завяршаецца вядомымі радкамі: "Жыве з ім дум маіх сям'я // І сніць з ім сны нязводныя... // Завецца ж спадчына мая // Усяго Старонкай Роднаю". Пераклад жа Н. Кісліка вельмі прыблізны і спрашчае аўтарскую рамантычную рэмінісцэнцыю. Гучыць так: "Мне то наследье вручено // Судьбой неотвратимою, // А называется оно // Сторонкою родимою".

Сур'ёзныя праблемы стаялі перад перакладчыкам паэмы "На куццю" В. Тарасам. Вобразная структура гэтага твора рамантычна ўскладнёная і трымаецца на ўяўленнях пра чарадзейны свет першага каляднага вечара беларусаў. Дзівосныя пераўтварэнні, што адбываюцца ў падзямеллі замчышча і ўваскрашаюць постаць старажытнага князя, заклапочанага гістарычным лёсам народа, раскрываюцца праз шматлікія міфалагічна-абрадавыя алюзіі і цяжка паддаюцца іншамоўнай перадачы. В. Тарас, як відаць, імкнуўся ўвасобіць перш за ўсё гераіка-рамантычны дух паэмы Купалы, яе таямнічапрыгодніцкую атмасферу, суровую і баявую танальнасць. Таму досыць вольна, часам і рызыкоўна абыходзіўся з тэкстам. І гэты прынцып перакладу, трэба прызнаць, стаўся тут паспяховым. Напэўна таму, што перакладчык добра "ўжыўся" ў купалаўскі боль і гонар. Зрэшты, добра адчута і экзатычная атрыбутыка гэтай каляднай паэмы-балады. Твор па-руску гучыць нязмушана, скрозь вытрымліваецца яго ўзвышана-стрыманы эмацыянальны напал.

Увогуле ж чарговае, але зусім не шараговае выданне Янкі Купалы на рускай мове будзе, без сумнення, сустрэта з цікавасцю. Пераклады ў большасці паэтычна адэкватныя і адкрываюць расійскаму чытачу вялікага беларускага паэта. Прычым адкрываюць па-новаму, без купюр і рэтушы, без замоўчвання таго, што было для паэта галоўным.

У кнізе "Молодая Беларусь" ёсць "дадатак". У ім, акрамя артыкулаў, успамінаў, дакументаў, змешчаны і вершы, прысвечаныя Янку Купалу. Толькі вершы не святочна-дзяжурныя, а народжаныя болем душы (іх аўтары — Э. Межэлайціс, Г. Бураўкін, Н. Гілевіч, І. Бурсаў). І яны не толькі кампазіцыйна, а матыўна вельмі добра завяршаюць выданне, эпіграфам да якога можна было б паставіць словы Купалы з гэтай жа кнігі — "Пад беларускі сцяг прыйдзі, Уладар!"

Том выдатна падрыхтаваны ў паліграфічных адносінах, у ім — вельмі добрыя здымкі Янкі Купалы. Наклад — 5000 асобнікаў, не так і мала. Усё гэта цешыць. Асноўнае ж у тым, што перад намі паўстала сапраўдная, прарочая постаць нашага вялікага нацыянальнага песняра. Няхай ён гэтакі ідзе ў вялікі свет.

Аляксей ПЯТКЕВІЧ

Сустрэча тая, як свята

Дваццаць гадоў таму, у кастрычніку 1988 года, праводзілася Рэспубліканскае свята паэзіі, падчас якога пісьменнікі наведалі Гарадок, Хоцімск, Вілейку, Навагрудак, Косава. Самая ж прадстаўнічая пісьменніцкая дэлегацыя завітала ў гарадскі пасёлак Акцябрскі Гомельскай вобласці. Узначальваў яе Максім Танк.

Пісьменнікі адразу адчулі нашу сардэчнасць і цеплыню. Асабліва цёплай была сустрэча з сябрамі літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі раённай газеты "Чырвоны Кастрычнік". Аднак самым чаканым было выступленне пісьменнікаў у раённым Доме культуры. Прамаўлялі і чыталі вершы Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, Г. Каржанеўская, П. Макаль, Г. Пашкоў, А. Вярцінскі, Б. Спрынчан, М. Мятліцкі, В. Зуёнак, С. Законнікаў, У. Паўлаў, а таксама В. Кузняцоў з Расіі, Д. Іваноў з Украіны, І. Калінаўскас з Літвы.

З таго часу прамінула дваццаць гадоў, аднак многія тую сустрэчу з пісьменнікамі і сёння прыгадваюць як вялікае свята. А разам з тым узнікае і законнае пытанне: "А чаму цяпер паэты так рэдка завітваюць у глыбінку?" Магчыма, не толькі кіраўніцтвам пісьменніцкай арганізацыі, але і дзяржавай не ўсё робіцца, каб такія масавыя сустрэчы творцаў і чытачоў адбываліся часцей. Усё-ткі кніга па-ранейшаму застаецца важнай крыніцай ведаў, крыніцай спасціжэння свету, ды і каму, як не пісьменнікам, несці людзям беларускае слова?

Віктар ЛОЎГАЧ

На здымках: пісьменнікі на свяце паэзіі ў пасёлку Акцябрскім.

Фота з архіва аўтара

Пяць прамянёў

У чалавека пяць пачуццяў. Да шостага розныя аўтары адносяць то прадчуванне, то інтуіцыю, то творчы пачатак. Нядаўна пад назвай "Пяць прамянёў" у галерэі Палаца мастацтва прайшла выстаўка пяці мастакоў, эпіграфам для якой паслужылі радкі Арсенія Таркоўскага: "...И если я приподымаю руку, // Все пять лучей останутся у вас...". Словы паэта вельмі трапна характарызуюць этымалагічную сутнасць з'явы. Бо ўсе пяць творцаў — гэта яшчэ і адна сям'я.

Калі людзі доўга жывуць разам, то з цягам часу становяцца падобнымі адзін да аднаго, не толькі звычкамі і характарам, але і тварам. Чаго зусім не скажаш пра творчасць мастакоў аднаго сямейнага кораня — тут у кожнага свая адметная інтанацыя, свой каларыт, манера пісьма і арыгінальныя тэмы. Давайце пазнаёмімся бліжэй з гэтай незвычайнай сям'ёй: бацька Юрый Піскун і яго жонка Алена Юр'ева — досыць вядомыя мастакі, іх дзеці — тры дачкі, таксама паспелі заявіць пра сябе ў творчым асяроддзі: Вольга Бычко (Піскун), Сафія і Валянціна Піскуны — прадставілі свае работы на выстаўцы ў трох жанрах: жывапіс, графіка, дызайн касцюма.

Пры сустрэчы ў майстэрні, Юрыю Піскуну прыйшлося распавядаць не толькі пра сябе, але і пра ўсю творчую сям'ю.

Выяўленчае мастацтва зрабіла лёсавызначальны ўплыў на яго жыццё, нават са сваёй будучай жонкай Аленай Юр'евай Юрый Піскун пазнаёміўся ў мастацкай школе. Бацька сямейства скончыў аддзяленне жывапісу Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, затым — аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і цяпер выкладае ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Маці Алена Юр'ева скончыла архітэктурны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. І муж, і жонка сталі сябрамі Беларускага саюза мастакоў. З 1983-га па 2000-ы Алена працавала мастаком па касцюме Дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі", а цяпер — выхавацель Рэспубліканскага каледжа па музыцы і выяўленчым мастацтве. Як мне думаецца, для жанчыны самае галоўнае рэалізавацца ў сям'і, пра гэта ж згадваецца і ў Біблії: "уратуецца праз дзетароднасць". Толькі пасля таго, як галоўная зямная місія выканана, жанчына можа самасцвердзіцца і рэалізавацца ў прафесіі, у нашым выпадку — у выяўленчым мастацтве. Алена Юр'ева рэалізавала сябе двойчы: нарадзіла і выхавала трох дачок, прывіла любоў да мастацтва і скіравала іх асабісты жыццёвы выбар да творчага шляху мастакоў.

Дачка Вольга нарадзілася ў 1980 годзе. Скончыла школу. Потым вучылася ў Рэспубліканскім каледжы па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Ахрэмчыка, які паспяхова закончыла і паступіла ў Акадэмію мастацтваў на аддзяленне жывапісу. Абараніла дыплом і праз тыдзень нарадзіла сына. Працягваючы сямейную традыцыю, закладзеную бацькамі, абрала сабе мужам таксама мастака-манументаліста Аляксея Бычко. Цяпер абодва маладыя мастакі выхоўваюць разам сына і дачку, Кастуся і Алену. Вольга ўдзельнічала ў творчай паездцы студэнтаў БДАМ па Германіі. Хто ведае, магчыма, гледзячы на бацькоў і дзядоў, унукі таксама прадоўжаць мастацкую дынастыю.

Сафія Піскун, 1982 года нараджэння, вучылася ў каледжы імя Ахрэмчыка, паступіла ў Акадэмію мастацтваў на аддзяленне графікі. Пасля заканчэння паехала на год стажыравацца ў Германію. Зрабіла серыю кніжак, цяпер працягвае вучобу ў творчай майстэрні пад кіраўніцтвам Георгія Паплаўскага.

Самая меншая — Валянціна Піскун, таксама скончыла Рэспубліканскі каледж па музыцы і выяўленчым мастацтве, цяпер вучыцца ў Акадэміі мастацтваў на аддзяленні дызайну касцюма.

"Жонцы было прасцей, — заўважае Юрый Піскун, — яна кожнае лета жыла ў вёсцы. Там шмат малявала. А калі дзеці падраслі, адразу ж пачала выстаўляцца".

Цікавы факт: яшчэ ў 1979 годзе Юрый Піскун стварыў дызайн касцюмаў "Песнярам", і менавіта з яго касцюмамі яны заваёўвалі прасторы Савецкага Саюза. І вось гэтую традыцыю цяпер працягвае малодшая дачка Піскуноў — Валянціна Піскун.

"Калі дзеці крыху падраслі, — распавядае далей Юрый, — жонка пайшла працаваць у "Харошкі", а я паступіў у аспірантуру. Не было як абараняцца, таму што патрабавалася зарабляць грошы. Маляваў карціны, у асноўным работы замаўляла Міністэрства культуры".

Не адзін кубак кавы быў выпіты падчас сустрэчы ў майстэрні мастака. Коратка прывядзём фрагменты нашай размовы.

— Браты Грым, Браты Стругацкія, Ільф і Пятроў — ёсць такая з'ява ў літаратуры, калі працуюць у сааўтарстве. У выяўленчым мастацтве, у жывапісе існуе такая практыка? Што вам перашкаджае сесці з жонкай за адно палатно?

— Зразумела, што можна, — усміхаецца Юрый Піскун.

— А ўвогуле ў гісторыі мастацтва былі такія прыклады?

— У нашым беларускім жывапісе гэта браты Ткачовы. Кукрыніксы, напрыклад, там увогуле ўтрох працавалі. Але на маю думку, мастак усё ж такі часцей працуе адзін. І ў той жа час, возьмем Рубенса. На яго працавала цэлая арцель. Ён накідваў кампазіцыю, адзін маляваў каня, другі — капыты, трэці — зброю, ці яшчэ што-небудзь. А ён накладваў канчатковыя геніяльныя мазкі. У Рафаэля таксама было шмат памочнікаў.

— Мяне ў свой час здзівіў факт біяграфіі Апюста Радэна. У яго памерла маці, але ён не паехаў на пахаванне, таму што пашкадаваў згубіць тры дні для творчасці. Працаваў над нейкай скульптурай. Вы — мастак, вы — чалавек, вы — бацька. Што першаснае ў вашых прыярытэтах? Змаглі б вы зрабіць так, як зрабіў Радэн?

— Мабыць, не, — пасля доўгай паўзы адказаў мой субяседнік. — Я не настолькі апантаны жывапісам. Мастацтва ўсё-такі дапамагае жыць.

— Але ж і патрабуе нейкіх ахвяр.

— Безумоўна. Калі мы былі яшчэ студэнтамі, таксама задаваліся гэтым пытаннем. Напрыклад, разбуруўся помнік архітэктуры і заваліў людзей. І што рабіць? Людзей спачатку ратаваць ці помнік? Усё ж такі трэба ратаваць чалавека. Мастацтва для чалавека. Мы ўсе павінны заставацца ў першую чаргу людзьмі. Бацькамі, сынамі, дзядамі...

— У паэта інструментам з'яўляецца слова, у кампазітара — мелодыя, гукі, а ў мастака?

— У жывапісца пераважна каляровае бачанне свету. Для кожнага па-рознаму. Пластычны вобраз.

— Як знаходзіце тэмы для працы, ці яны самі вас знаходзяць? Каго лічыце сваім настаўнікам у жывапісе? Альбо перыяд вучнёўства ўжо прайшоў? Ёсць мастакі, на якіх раўняецеся, хацелі б быць падобны да іх лёсам ці творчасцю, ці сваімі карцінамі?

— Тэмы прыходзяць па-рознаму. Гэта работа падсвядомасці. А з мастакоў я назваў бы Вермеера Радэльскага. Гэта XVII стагоддзе. Крыху паўплываў Рубенс, можа, — Веласкес. Ёсць такі мастак амерыканскі Эндру Уайес — ён таксама аказвае ўплыў на маю творчасць.

— Калі б вы былі крытыкам, да якой мастацкай плыні аднеслі б свае творы?

— Напэўна, рамантычны рэалізм. У Алены Юр'евай таксама рамантычны рэалізм, але больш экспрэсіўны. Экспрэсіўна-рамантычны рэалізм. Валя — яшчэ больш экспрэсіўна-рамантычны, але ўжо сюррэалізм. Таксама і Зося, але паболей рэалізму. А Вольга — фавіст. Гэта чалавек, які большую перавагу аддае колеру.

— Я ведаю, вам заказвалі іконы. Яны ўжо ёсць у храмах?

— Ёсць. А яшчэ я напісаў "Гісторыю беларускай іконы" — цэлае навуковае даследаванне, яно выходзіла асобным альбомам.

— Ці ёсць у вас карціна, звязаная з нейкім фактам біяграфіі, ці вельмі дарагая сэрцу, якую вы не прадалі б ні за якія грошы?

— Няма такой карціны. Лепшая карціна яшчэ наперадзе.

— Чым для вас з'яўляецца творчасць?

— У першую чаргу — гэта самасцвярджэнне. Тое задавальненне, якое прыходзіць ад таго, што ты змог зрабіць так, як задумаў. Пераадольванне цяжкасцей. Ад пачатку да гатовай карціны праходзіць шмат часу і працы. Малюеш нейкія эскізы, асобныя фрагменты...

— А якую ролю для вас іграе творчасць як інструмент самапазнання і пазнання свету?

— З цягам часу ты па-іншаму пачынаеш бачыць. Іншае ўспрыманне рэчаіснасці і іншыя адносіны. Так, гэта самавыяўленне. Я больш рацыянальны. На восемдзесят працэнтаў прыдумваю карціну ў галаве. А потым мне проста патрэбна перакласці ўсё на палатно.

— Самы дасканалы творца — гэта Бог. А мастак у такім абагульняючым сэнсе — гэта сатворца. Вы да Бога калі прыйшлі?

— У трыццаць тры гады я ахрысціўся. Біблейская тэматыка займае значнае месца ў маёй творчасці. Мае карціны досыць пазнавальныя. Выстаўка — гэта новы ключавы этап у творчасці. Тым больш сумесныя сямейныя выстаўкі, якія мы ладзім з 2000-га і не толькі ў Беларусі: у Эстоніі, Італіі, Германіі...

Пяць пачуццяў у чалавека, шостае — творчасць. Смела можна прагназаваць, што дынастыя Піскуноў пакіне свой след у гісторыі беларускага мастацтва, бо з сямейнага кораня адгалінавалася пяць асобных адметных творцаў.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Пакліканы родным словам

Юбілеі

Да 65-годдзя Уладзіміра Навумовіча

Імя Уладзіміра Аляксандравіча Навумовіча добра вядома шырокай літаратурнай грамадскасці. Пісьменнік, літаратуразнавец, крытык, публіцыст, выкладчык роднай літаратуры, аўтар больш як 260 навуковых прац, папулярызатар гісторыі, літаратуры і культуры Беларусі, шчыры руплівец на ніве сучаснай літаратурнай навукі...

На аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ Уладзімір Навумовіч вучыўся з 1961 па 1966 год. Сапраўдным духоўным бацькам, дарадцам, а пасля і сапраўдным сябрам стаў для яго прафесар А. Лойка, які яшчэ на другім курсе прыкмеціў таленавітага юнака, вылучыў сярод іншых яго курсавую работу па творах М. Гарэцкага і павёў за сабою па лабірынтах беларускага літаратуразнаўства.

Пасля заканчэння універсітэта У. Навумовіч быў накіраваны на камсамольскую работу, працаваў загадчыкам аргаддзела Ленінскага райкама ЛКСМБ (1965—1966), загадчыкам сектара культмасавай работы Мінскага абкама ЛКСМБ (1966—1969), лектарам ЦК ЛКСМБ (1969—1970).

Беларускае літаратуразнаўства аднак па-ранейшаму вабіла да сябе багаццем эстэтычнай думкі, прызнанымі аўтарытэтамі ў літаратурнай навуцы, новымі адкрыццямі, і ўчарашні студэнт Уладзімір Навумовіч становіцца аспірантам кафедры беларускай літаратуры БДУ, дзе пасля трохгадовай вучобы з поспехам абараняе кандыдацкую дысертацыю па тэме "Проза "Маладняка" (1974). З 1973 года — выкладчык, а з 1978 — дацэнт кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

У 1982—1983 гадах У.Навумовіч загадвае кафедрай рускай мовы для замежных студэнтаў. З 1989 — загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў, а з 1989 па 2000 — загадчык кафедры беларусазнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

У 1990—1994 гг. У. Навумовіч узначальвае Міжнародную школу беларускай мовы, літаратуры і культуры, якую арганізаваў па ўласнай ініцыятыве на ўмовах самаакупнасці і самафінансавання. Слухачамі школы былі вучоныя-славісты, студэнты, перакладчыкі з розных краін свету: Аўстрыі, Вялікабрытаніі, ЗША, Германіі, Італіі, Егіпта, Канады, Македоніі, Польшчы, Расіі, Славеніі, Швейцарыі, Украіны, Чэхіі, Францыі, Японіі. Вынікам працы школы стала ўтварэнне навукова-культурных асяродкаў беларусазнаўства за мяжой — у Італіі, Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі, Егіпце, Японіі і інш.

Сфера навуковых зацікаўленняў У. Навумовіча цесна звязана з пытаннямі развіцця беларускай літаратуры XX стагоддзя, літаратурнымі рухамі 20-х гадоў, ідэйна-эстэтычнай эвалюцыяй беларускай аповесці, этычна-канцэптуальнымі асновамі ўсёй беларускай паэзіі і прозы. Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца манаграфіі "Шляхамі арлянят. Проза "Маладняка" (1982), "Маральнае аблічча героя ў беларускай мастацкай прозе 60-х — 80-х гг. XX стагоддзя" (2000), падручнікі і навучальныя дапаможнікі "Беларусазнаўства" (1998), "Беларуская літаратура" (2000), "Белорусская литература" (2007) і інш.

Вядомы Уладзімір Навумовіч і як празаік. Першае апавяданне "Навыраст" было змешчана ў 1964 годзе ў навагрудскай раённай газеце "Новае жыццё", у рэспубліканскім жа друку ён дэбютаваў апавяданнем "На скразняку" ў газеце "Чырвоная змена" ў тым жа 1964. Таксама з'яўляецца аўтарам аповесці пра камсамол "Узаранае поле" (1968), якая ў свой час мела значны грамадскі рэзананс, кнігі прозы "Такое бывае аднойчы" (1982).

Сутнасныя рысы ўнутранага свету, мадэль свядомасці Уладзіміра Навумовіча як чалавека грамадскага патэнцыялу надзвычай разнастайныя: ён добра вядомы і як папулярызатар беларускай літаратуры і культуры далёка за межамі рэспублікі, па запрашэнні Лонданскага універсітэта чытаў лекцыі па беларускай літаратуры ў Англіі, працаваў у беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лондане, шмат разоў удзельнічаў у працы моўных семінараў у Югаславіі — Белградзе, Заграбе, Любляне, Марыборы, Задары і інш., усталёўваў навуковыя кантакты з вядучымі ВНУ Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Польшчы, Славеніі.

У лекцыйных курсах "Беларусазнаўства" і "Універсітэтазнаўства", спецыяльна распрацаваных для студэнтаў Белдзяржуніверсітэта, дзе з 2004 года Уладзімір Аляксандравіч працуе саветнікам рэктара, даследуюцца і прапагандуюцца праблемы фарміравання універсітэтаў як цывілізацыйных феноменаў у свеце, пачынаючы з сярэднявечча да нашых часоў, гісторыя і ўмовы фарміравання БДУ як навуковага інстытута, а таксама розныя аспекты навучання, што сведчыць пра нязменны клопат у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Сучасная літаратурная навука выходзіць на новыя далягляды, шукае новыя падыходы. Літаратуразнаўчая і педагагічная дзейнасць Уладзіміра Навумовіча, дацэнта кафедры беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта, саветніка рэктара БДУ самым непасрэдным чынам жывіць гэтыя намаганні.

Таццяна БЕЛЬСКАЯ

Адной дарогай з Ганнай Хітрык

Пад рубрыкай "Два крылы" публікуецца серыя матэрыялаў нашага няштатнага аўтара пра маладых і амбіцыйных, таленавітых і цікавых людзей, якія знайшлі сябе ў двух розных мастацкіх сусветах. Яны ляцяць на ўласных крылах, захопленыя дзвюма сваімі справамі.

Артыстку Ганну Хітрык можна лічыць пацвярджэннем гіпотэзы пра існаванне паралельнага свету. Вельмі яна розная на дзвюх сваіх сцэнах — тэатральнай і канцэртнай. І вельмі цяжка бывае ўсвядоміць, што гэта адна і тая ж Ганна ўчора ўражвала глыбінёй і надрыўнасцю вобраза Івоны ці Джулії, а сёння, апрануўшы квяцістую сукенку і пачапіўшы дзве коскі, спявае пра лядоўні ды мора...

З біяграфіі

Нарадзілася ў 1980 годзе ў Чэлябінску. У 2001-м скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (спецыяльнасць "акцёрскае мастацтва тэатра лялек"). Але гледачы Ганну ведаюць як драматычную актрысу. У Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы яна прыйшла працаваць адразу пасля заканчэння акадэміі. Сёння ўдзельнічае яшчэ і ў спектаклях Сучаснага мастацкага тэатра і Рэспубліканскага тэатра юнага гледача.

Два гады таму сябры-акцёры Ганна Хітрык, Міхал Зуй і Дзмітрый Есяневіч стварылі гурт "Дети-детей". Ён можа пахваліцца двума выдадзенымі альбомамі — "Конверты для снов" і "ОтЛично", а таксама тым, што на леташняй "Рок-каранацыі" гурт названы "Адкрыццём года".

Спадчына бацькоў

У дзяцінстве Ганна Хітрык насіла сандалікі, верыла ў Дзеда Мароза, не любіла кашу з сасіскамі, дрэнна вучылася і больш за ўсё баялася бацькоўскіх сходаў. Тады на яе маленькай спіне і прарэзаліся два крылцы. Адно музычнае, у спадчыну ад маці:

— Маці працавала ў дзіцячым садку музычным кіраўніком, і ўсе ранішнікі "віселі" на ёй. Да сваёй працы маці ставілася вельмі адказна. Ранішнікі ж кожны год адны і тыя ж — толькі дзеці мяняюцца. А ёй заўсёды хацелася, каб было хоць крышачку, але па-новаму. І я на гэтых ранішніках была ўсім: Лісіцай, Жабкай, Бурацінам, Снягуркай. Адной-чы нават Дзедам Марозам ...

Другое крыло тэатральнае, у спадчыну ад бацькі:

— Мой бацька працаваў у тэатры. Я часта прыходзіла туды на спектаклі. Памятаю, як у школе казалі: "Дзеці, ідзём у тэатр!". А я рэагавала абыякава. Мне лепш было на двары пагуляць у выбівалу — цікавая гульня! — чым ісці глядзець спектакль, які я, хучэй за ўсё, бачыла. Прычым з-за кулісы, што было значна цікавей, чым з залы, і неяк па-шпіёнску.

Насоўка як існасць

Паглядзеўшы на "выбітны" атэстат дачкі, бацькі вырашылі: у выпадку, калі абітурыентка не паступіць у Акадэмію мастацтваў, аддаць яе вучыцца на кухара ці на цырульніка. Для Ганны гэта значыла адно: адсутнасць выбару. І яна паступіла.

— Я і там дрэнна вучылася да трэцяга курса. Усё ніяк не магла зразумець, чаму я павінна ажыўляць нейкія стужкі, нейкія скрыначкі і рабіць выгляд, быццам веру ў тое, што яны жывыя. А ў канцы другога курса мы рабілі эцюд "ажыўленне насоўкі", і я раптам паверыла, таму што яна такая смешная была. І вось з гэтага моманту я і пачала верыць у тэатр, я палюбіла спецыяльнасць, людзей гэтай прафесіі.

А на трэцім курсе, калі мы ўжо рабілі дыплом "Усе мышы любяць сыр", да мяне падышоў Аляксандр Фёдаравіч Гарцуеў і прапанаваў мне паспрабаваць ролю Лізы ў яго новым спектаклі "Брат мой, Сіман" у Купалаўскім. Я ўсё лета перажывала перад гэтым іспытам. Тэкст увесь на памяць ведала. І, дзякуй Богу, атрымалася, пайшло неяк.

Людзі, якія патрэбныя і непатрэбныя

Тэатр для Ганны — гэта перш за ўсё людзі, якія вераць: і акцёры, і гледачы. Яна перажывае і за тых, і за другіх.

— Чаму ў нас білет на спектакль "Балада пра каханне" (паводле "Альпійскай балады" В. Быкава. — **Рэд.**) *, дзе ты затрачваеш столькі эмоцый, дзе кожны раз пражываеш усё па-новаму, каштуе танней за білет на які-небудзь другаразрадны фільм? Чаму зімой у тэатр ходзяць проста пагрэцца і з півам? А на той жа "Баладзе..." такая жахлівая гісторыя была. Білеты выкупіла нейкая навучальная ўстанова. І з залы такое мне крычалі, што я проста не ведала, што рабіць, у мяне істэрыка была. Я не гаварыла тэкст. Мы дайгралі, але на паклон з партнёрам, Раманам Падалякам, не выйшлі. Гледачы ўспрынялі гэта як хамства, а я лічу, што хамства было якраз з іх боку.*

Але гэта сумная гісторыя. Ёсць жа і вясёлыя. Ёсць моманты, калі ты сядзіш за кулісамі, свой кавалачак адыграла і назіраеш за партнёрам у дзірачку, бо ведаеш, што цяпер будзе чароўны момант. І як жа глядач? Перастане ён дыхаць ці не перастане? І ён перастае! І ты з-за кулісы пераміргваеш іншаму акцёру: мы перамаглі! Яны перасталі дыхаць! Яны зразумелі! Яны паверылі! Яны пранікліся! Яны цяпер будуць плакаць. І яны пачынаюць плакаць. А потым, ты ведаеш, будуць апладысменты. І гэтыя апладысменты ідуць! І ты адчуваеш, як яны адчуваюць. Вось гэта шчасце!

Дзеці ў квадраце

Стаміўшыся ад сцэнічных вобразаў, маладыя акцёры-купалаўцы стварылі гурт "Детидетей", каб проста час ад часу мець магчымасць з'яўляцца перад гледачамі такімі, якія яны ёсць насамрэч.

— Гурт складаецца з сямі чалавек, якія проста адно аднаго вельмі-вельмі любяць. Я не магу сказаць, якую музыку мы граем. У нас няма стылю. А, можа, і ёсць? А, можа, гэта "папса"? Вось мы прыехалі на фестываль "Пустые холмы", і я ўсё гаварыла, што нам няма чаго граць, мы граем папсу. Потым выйшлі, праспявалі, а гледачы: "Яшчэ! Яшчэ!". І я падумала: можа, мы і не папсу граем? Калі ж нас намінавалі на "Рок-каранацыі", я падумала: а мы што, рок граем? Сказаць, што мы граем добрую музыку? А потым людзі прыйдуць, і ім не спадабаецца. Атрымаецца, што я іх падманула ...

У нас ёсць простасць. Ёсць свой маленькі свет. Мы сустракаемся з нашымі прыхільнікамі: надзьмуваем шарыкі, пячэм торты. Што хочам, тое і робім: гуляем, сядзім у скверах, на прыроду ездзім, наведаліся ў дзіцячы дом. Проста бавім разам час, як кожны бавіць яго са сваімі сябрамі. У нас ёсць такі дэвіз — радок з нашай песні: "Всем-всем-всем с нами по пути!"

Усе-ўсе-ўсе і крочаць за працавітай, натхнёнай, эмацыйнай, пазітыўнай Ганнай Хітрык то на спектакль, то на канцэрт, каб атрымаць сваё здзіўленне-задавальненне: тэатралы — тэатральнае, аматары спеваў — музычнае. А камусьці шанцуе ўдвая: у адной Ганне яны адкрываюць некалькі творчых сусветаў.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ
Фота Аляксандра Дзмітрыева

Вершы засталіся, песні...

Мінула пяць гадоў, як зямлю пакінуў чалавек, для якога не існавала паняцця "чужы боль". Мінула пяць гадоў, як дагестанскі народ развітаўся са сваім прарокам, народным паэтам Дагестана Расулам Гамзатавым.

Ён ужо пры жыцці меў шмат ганаровых званняў і прэмій Дагестана, СССР і свету: Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі, лаўрэат міжнароднай прэміі "Лепшы паэт XX стагоддзя", лаўрэат прэмій імя Шолахава, Лермантава, Фадзеева...

Ён ніколі не ганарыўся ні імі, ні сваімі пасадамі. Пра званне народнага паэта Дагестана ён казаў Мураду Ахмедаву, журналісту часопіса "Дагестан": "Я вельмі даражу тым, што мне прысвоена гэта высокае званне і быў вельмі засмучаны, калі мне яго далі, усведамляючы, што яно — пэўны аванс даверу, які я павінен буду апраўдаць".

І, трэба сказаць, апраўдаў. Усім сваім багатым на падзеі і творчыя набыткі жыццём. Яго і сёння любяць і паважаюць. І цяпер са сцэны, з кінафільмаў гучаць песні на яго вершы, выканаўцамі якіх сталі вядомыя спевакі. Пра жыццё і творчасць Расула Гамзатава напісаны кнігі, зняты дакументальныя фільмы "У гарах маё сэрца", "Каўказер родам з Цада", "Белыя журавы". Паводле яго твораў знятыя мастацкія фільмы "Гаранка" і "Паданне пра храбрага Хачбара".

На пытанне журналіста "Дагестанской правды", як ён ставіцца да таго, што яго называюць "вялікім паэтам", Расул Гамзатаў адказаў: "Скажу шчыра, слова *вялікі* мяне абражае. Гэта элементарная знявага да жывога паэта. Я ведаю сябе і ведаю сваю творчасць, і вялікім сябе не лічу... Вось пройдзе час, і там будзе бачна, што велічнае я стварыў, а што не".

Так, час пройдзе, а дагестанская зямля не толькі памятае свайго сапраўды вялікага сына, а ўсё больш і больш усведамляе яго прысутнасць у духоўным жыцці ўжо некалькіх пакаленняў.

...Нядаўна ў рэдакцыю завітаў вабнага твару, сярэдніх гадоў чалавек. Разгаварыліся. Зямляк Расула Гамзатава. Скульптар. Амаль трыццаць гадоў жыве і працуе ў Мінску. Піша вершы. На аварскай мове. Рыхтуе да друку зборнік у перакладзе на беларускую. Хізры Асадулаеў — імя і прозвішча аўтара. Верш з прысвячэннем "Расулу Гамзатаву" Хізры прапанаваў чытачам "ЛіМа".

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Хізры Асадулаеў

Расулу Гамзатаву

Пасланец, што прызнаў натхненне ўладу,
Дзе радасць, як крынічная вада.
Ад далягляду аж да далягляду
Пашырыў межы роднага гнязда.

Арліны твой палёт не меў супыну,
Спрыяў рупліва творцу зорны лёс.
Да паднябеснай вышыні Айчыну
Крылатай думкаю сваёй узнёс.

Каменнаглыбы рыцар Дагестана,
Сваю святую мову ашчаджаў.
Любоў і непахісную пашану
Здабыў, бо ўвесь згараў для добрых спраў.

Баляць да скону дрэву ўсе галінкі.
Ўсе хвалі дарагія для ракі.
На ранішняй траве жывуць расінкі,
А ці твае бяссонныя радкі.

Каб позірк мудраца яснеў вясёла,
Вяршыням сонца маладосць нясе.
Гучаць тваімі песнямі наўкола
І шчэбет радасны і кветкі ўсе.

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3379
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 29.10.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 5945

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686